ПАСТАР РЫЧАРД ВУРМБРАНД



# Пакуты за Хрыста

ПАСТАР РЫЧАРД ВУРМБРАНД

# *Пакуты за Хрыста*

# Tortured for Christ

## ukrainian Edition

Copyright 2015 Voice Media

info@VM1.global
Web home: www.VM1.global

All rights reserved. No part of the publication may be reproduced, distributed or transmitted in any form or by any means, including photocopying, recording, or other electronic, or mechanical methods, without the prior written permission of the publisher, except in the case of brief quotations embodied in critical reviews and certain other noncommercial uses permitted by copyright law. For permission requests, email the publisher, addressed “Attention: Permission Coordinator,” at the address above.

This publication **may not be sold, and is for free distribution** only.

*Раздзел 1*

# БЯЗБОЖНІК ЗНАХОДЗІЦЬ ХРЫСТА

Я змалку рос сіратою. Выхаваны ў сям'і, дзе не прызнавалася ніякае рэлігіі, я ў дзяцінстве не атрымаў ніякай рэлігійнай адукацыі, і ў 14 гадоў быў зацятым, перакананым атэістам. Гэта было вынікам маёй дзіцячай зацятасці. Малым я зазнаў беднасць і цяжкасці часоў Першай Сусветнай вайны. У 14 гадоў я быў гэткім жа перакананым атэістам, як і сучасныя камуністы. Я чытаў усялякія бязбожныя кнігі і не толькі не верыў у Бога і Хрыста – я ненавідзеў рэлігію, лічачы яе шкоднаю для чалавечага розуму. Я рос у зацятасці супроць рэлігіі. Але, як я пазней зразумеў, Бог з ласкі Свае прыняў мяне ў лік абраных Сваіх – чаму, я не разумею дагэтуль. Прычыны гэтага не мелі ніякага дачынення да майго характару, бо той быў вельмі кепскі. Нягледзячы на мой атэізм, нешта невытлумачальнае заўсёды цягнула мяне да царквы. Мне было цяжка прамінуць царкву і не зайсці ў яе. Праўда, я нічога не разумеў, што там адбывалася. Я слухаў казані, але яны не прамаўлялі да майго сэрца. Я ўяўляў Бога гаспадаром, якому трэба падпарадкоўвацца. Я ненавідзеў гэтае памылковае ўяўленне пра Бога, якое склалася ў мяне ў галаве, але мне вельмі хацелася, каб недзе існавала сэрца, якое кахае... недзе ў цэнтры сусвету. Я мала ведаў радасці ў дзяцінстве і юнацтве, таму я прагнуў, каб недзе было сэрца, якое кахае і б'ецца дзеля мяне. Я

пераканаў сябе, што Бога няма, але шкадаваў, што вось такога Бога любові не існуе. Аднойчы я зайшоў у каталіцкую царкву, поўны ўнутраных духоўных супярэчнасцяў, і ўбачыў, што людзі стаяць на каленях і нешта гавораць. Я падумаў: укленчу з імі, каб пачуць, што яны кажуць, буду паўтараць за імі і праверу, ці будзе што з гэтага. Яны маліліся да Найсвяцейшае Дзевы: «Радуйся, Марыя, ласкі поўная». Я паўтараў за імі зноў і зноў і пазіраў на статую Марыі, але нічога не адбылося. Мне было гэта вельмі прыкра. Аднойчы, нягледзячы на мае атэістычныя перакананні, я стаў маліцца да Бога: «Божа, я напэўна ведаю, што Цябе няма, але калі выпадкам Ты ёсць, што няпраўда, то не я павінен верыць у Цябе, але Ты павінен адкрыцца мне». Я быў атэістам, але атэізм не даваў міру майму сэрцу. У гэты час майго душэўнага разладу адзін стары цясляр у горнай румынскай вёсцы маліўся: «Божа мой, я служыў Табе на зямлі і хачу мець нагароду і на зямлі, як і на небе. І нагарода мая хай будзе ў тым, каб я не памёр, пакуль не прывяду да Хрыста габрая, бо Ісус быў з габрайскага народу. Але я бедны, стары і хворы. Я не магу падацца ў дарогу, каб знайсці таго габрая, а ў нас у вёсцы няма ніводнага. Прывядзі да нас у вёску габрая, і я зраблю ўсё, што ў маіх сілах, каб прывесці яго да Хрыста». Нешта неадольнае пацягнула мяне ў гэтую вёску. Мне не было ніякіх прычын, каб забірацца туды. У Румыніі дванаццаць тысяч вёсак, але я трапіў якраз у гэтую. Пабачыўшы, што я габ-

рай, цясляр пачаў хадзіць каля мяне так, як каля прыгожае паненкі ня ходзяць. Ён убачыў ува мне адказ на сваю малітву і даў мне пачытаць Біблію. З культурнае цікавасці я чытаў яе і раней няраз. Але Біблія, якую ён мне даў, была не такая. Як ён казаў пазней, яны з жонкаю гадзінамі маліліся за навярненне маё і маёй жонкі. Біблія, якую ён мне даў, была напісаная не словамі, а полымем любові, распаленым ягонымі малітвамі. Я ледзьве мог яе чытаць. Я мог толькі плакаць над кожнай старонкай, параўноўваючы маё кепскае жыццё з жыццём Ісуса, мае грахі з Ягонай праведнасцю, маю нянавісць з Ягонай любоўю, – і Ён прыняў мяне як Свайго. Неўзабаве мая жонка таксама навярнулася да Хрыста. Яна прывяла да Яго новыя душы, а яны ў сваю чаргу прыводзілі іншых, і так у Румыніі з'явілася новая лютаранская кангрэгацыя. Потым прыйшлі нацысты, пад якімі мы нацярпеліся. У Румыніі нацызм прыняў форму дыктатуры з надзвычай артадаксальнымі элементамі, якая пераследавала як габраяў, так і пратэстантаў. Яшчэ да маёй фармальнай ардынацыі, калі я не быў яшчэ гатовы служыць, я быў лідэрам гэтае царквы, як яе заснавальнік. Я адказваў за яе. Нас з жонкаю некалькі разоў арыштоўвалі, білі і судзілі нацыстоўскім судом. За нацыстамі было страшна, хоць гэта было толькі прадвесце таго, што настала пры камуністах. Мой сын Міхай мусіў прыняць негабрайскае імя, каб пазбегнуць смерці. Часы нацызму мелі адну перавагу. Яны паказалі нам,

што збіццё можна вынесці і што з Божаю помаччу людскі дух можа выжыць у жахлівых катаваннях. Мы навучыліся рабіць хрысціянскую справу таемна, і гэта падрыхтавала нас да будучых горшых выпрабаванняў, якія ўжо надыходзілі.

## Як я служыў для савецкіх людзей

Каючыся ў сваім ранейшым бязбожніцтве, я з першых дзён, як навярнуўся, марыў пра тое, каб сведчыць пра Хрыста савецкім людзям. Іх з дзяцінства выхоўвалі ў атэізме. Мая мара збылася, і мне не давялося нават ехаць дзеля гэтага ў СССР. Яна пачала спаўняцца яшчэ за нацыстоўскім часам, бо ў нас у Румыніі былі тысячы савецкіх ваеннапалонных. Сярод іх мы і распачалі хрысціянскую справу. Гэта было кранальна і драматычна. Я ніколі не забуду маёй першай сустрэчы з расейскім палонным. Ён быў інжынерам. Я запытаў, ці верыць ён у Бога? Калі б ён адказаў «не», я не асудзіў бы яго. Кожны чалавек мае права верыць альбо не верыць. Але ён неўразумела паглядзеў на мяне і сказаў: «Мне няма такога загаду, каб верыць, а калі загадаюць, то я паверу». Слёзы пацяклі ў мяне па твары. Я адчуваў, як сэрца маё кроіцца з болю. Перада мною стаяў чалавек з мёртвым розумам, які страціў найкаштоўнейшы Божы дар: уласную індывідуальнасць. Гэта была жывая прылада ў руках камуністаў, чалавек з прамытымі мазгамі, гатовы верыць ці не верыць па загадзе. Ён ад-

вучыўся думаць сваёй галавой. Гэта быў тыповы савецкі чалавек пасля шматгадовага камуністычнага панавання. Уражаны тым, што робіць з людзьмі камунізм, я даў абяцанне Богу, што прысвячу жыццё гэтым людзям, каб вярнуць ім індывідуальнасць і веру ў Бога і Хрыста. Пасля 23 жніўня 1944 г. у Румынію прыбыў цэлы мільён савецкіх салдатаў. Неўзабаве пасля гэтага камуністы ў нашай краіне прыйшлі да ўлады. Пачаўся кашмар, у параўнанні з якім нацыстоўскі тэрор выглядаў драбязой. На 18 мільёнаў насельніцтва ў Румыніі было толькі дзесяць тысяч камуністаў. Але міністр замежных справаў Савецкага Саюза Вышынскі ўварваўся ў кабінет нашага любага караля Міхая Першага і, грукнуўшы кулаком па стале, загадаў: «Вы павінны прызначыць ува ўрад камуністаў!» Нашыя войска і паліцыя былі раззброеныя, і так, праз гвалт і агульную нянавісць, камуністы прыйшлі да ўлады. Пры гэтым не абыйшлося без удзелу тагачасных амерыканскіх і брытанскіх кіраўнікоў. Людзі адказваюць перад Богам не толькі за свае асабістыя грахі, але і за нацыянальныя. Трагедыя ўсіх забраных краін ляжыць адказнасцю на сэрцах амерыканскіх і брытанскіх хрысціянаў. Амерыканцы павінны ведаць, што часам яны мімаволі дапамагалі расейцам уводзіць у нас рэжым забойстваў і тэрору. Як частка Цела Хрыстовага, амерыканцы павінны адкупіць гэта, дапамагаючы забраным народам прыйсці да святла Хрыстовага.

## Як Царкву спакушалі

Прыйшоўшы да ўлады, камуністы пачалі спакушаць Царкву. Умелі яны гэта добра. Любоў і спакуса гавораць адною моваю. Той, хто хоча жаніцца з дзеўчынаю, і той, хто хоча яе толькі на адну ноч, аднолькава кажуць: «Я кахаю цябе!» Ісус вучыў нас адрозніваць мову любові ад мовы зводу і ваўкоў у авечай скуры ад сапраўдных авец. Нажаль, калі камуністы прыйшлі да ўлады, аказалася, што тысячы святароў, пастараў і казаннікаў не ўмеюць адрозніваць гэтыя галасы. Камуністы склікалі ў будынку нашага Парламенту кангрэс усіх хрысціянскіх цэркваў. Там было 4000 пастараў, святароў і казаннікаў усіх веравызнанняў, і гэтыя людзі Божыя абралі ганаровым старшынём кангрэсу Іёсіфа Сталіна. Сталін тады стаяў на чале сусветнага руху бязбожнікаў і быў арганізатарам масавых забойстваў вернікаў. Адзін за адным біскупы і пастары падымаліся на трыбуну і казалі, што камунізм і хрысціянства ў прынцыпе адно і тое ж і цалкам могуць суіснаваць. Адзін за адным казаннікі ўсхвалялі камунізм і запэўнівалі новы ўрад, што Царква яму верная. Мы з жонкаю былі на гэтым кангрэсе. Сабіна шапнула мне: «Рычардзе, устань і змый гэтую ганьбу з Хрыстовага аблічча! Яны ж плююць яму ў твар!» Я запярэчыў: «Калі я гэта зраблю, ты застанешся без мужа». Яна адказала: «Я не хачу мужа-баязліўца». Тады я ўстаў і сказаў на гэтым кангрэсе прамову, у якой праслаўляў не забойцаў хрысціянаў, а Ісуса Хрыста, і сказаў, што

нам належыць перадусім быць вернымі Богу. Усе прамовы на гэтым кангрэсе перадаваліся праз радыё, і ўся краіна чула, як з трыбуны камуністычнага парламенту гучыць вестка Хрыстова. Пазней я мусіў дорага заплаціць за гэта, але справа была таго вартая. Лідэры праваслаўнай і пратэстанцкай цэркваў спаборнічалі ў саступках перад камунізмам. Адзін праваслаўны біскуп пачапіў сабе на расу серп і молат і прасіў сваіх падначаленых называць яго не «Ваша прэасвяшчэнства», а «таварыш біскуп». Такія святары, як Патраскойу і Расьяну, пайшлі яшчэ далей: яны сталі афіцэрамі тайнай паліцыі. Памочнік біскупа лютаранскае царквы Румыніі Рап пачаў вучыць у духоўнай семінарыі, што Бог адкрываўся людзям тройчы: праз Майсея, Ісуса Хрыста і Сталіна, прычым кожнае наступнае адкрыццё было большае за ранейшае. Я быў на баптысцкім з'ездзе ў мястэчку Рэсітэ. З'езд праходзіў пад чырвоным сцягам, і калі зайгралі дзяржаўны гімн Савецкага Саюзу, усе ўсталі. Старшыня з'езду назваў Сталіна вялікім настаўнікам Бібліі і заявіў, што ён толькі выконвае запаведы Божыя. Трэба разумець, што сапраўдныя баптысты, якіх я шчыра люблю, не пагадзіліся з гэтым, засталіся вернымі Хрысту і шмат за гэта цярпелі. Але камуністы «абралі» ім сваіх кіраўнікоў, і баптыстам нічога не заставалася, як прыняць іх. Так стаіць справа і ў наш час з найвышэйшым духоўным кіраўніцтвам «афіцыйнае» царквы. Тыя, хто стаў слугамі камуністаў, а не Хрыста, пачалі выдаваць сваіх братоў, якія не

пайшлі за імі. Расейскія вернікі пасля рэвалюцыі стварылі Падпольную Царкву. Прыход камуністаў да ўлады і здрада шмат каго з афіцыйнага кіраўніцтва Царквы прымусілі нас пайсці тым жа шляхам. Мы стварылі ў Румыніі Падпольную Царкву, якая працягвала служыць Богу, прапаведаваць Евангелле і несці Хрыста дзецям. Камуністы ўсё гэта забаранілі, а афіцыйная Царква пагадзілася. Разам з іншымі я пачаў падпольную працу. Для вока я меў вельмі паважнае становішча – пастара Нарвежскае Лютаранскае Місіі – якое служыла прыкрыццём маёй падпольнай працы. Адначасова я прадстаўляў у Румыніі Сусветную Раду Цэркваў. Мы тады і ўявіць не маглі, што гэтая арганізацыя пачне супрацоўнічаць з камуністамі. На той час у нашай краіне яна займалася толькі дабрачыннасцю. Дзве гэтыя пасады дазвалялі мне добра выглядаць перад уладамі, якія нічога не ведалі пра маю падпольную працу. Гэтая праца мела два напрамкі: таемнае служэнне сярод савецкіх салдат і праца з паняволеным румынскім народам.

### У савецкіх людзей такія спраглыя душы!

Пропаведзь Евангелля савецкім людзям была для мяне як неба на зямлі. Я прапаведаваў Евангелле людзям з розных краін, але ніколі не бачыў, каб нехта піў кожнае слова Евангелля, як савецкія людзі. У іх такія спраглыя душы! Адзін знаёмы праваслаўны святар патэлефанаваў да

мяне і сказаў, што да яго на споведзь прыйшоў расейскі афіцэр. Мой знаёмы не гаварыў па-расейску, але ведаючы, што я па-расейску гавару, ён даў яму мой адрас. Наступнага дня гэты чалавек прыйшоў да мяне. Ён прагнуў Бога, але ніколі не бачыў Бібліі. Ён не меў ніякае рэлігійнае адукацыі і ні разу ў жыцці не быў на багаслужбе (цэркваў у Расеі вельмі мала). Ён любіў Бога, не маючы пра Яго ніякага ўяўлення. Я прачытаў яму Нагорную Казань і прыпавесці Ісуса Хрыста. Выслухаўшы іх, ён ажно пусціўся ў скокі з радаснымі воклічамі: «Як хораша! Як мог я жыць, не ведаючы гэтага Хрыста!» Я ўпершыню бачыў чалавека, які так радуецца ў Хрысце. І тут я зрабіў памылку: без падрыхтоўкі прачытаў яму пра пакуты і распяцце Хрыста. Ён не чакаў гэтага, і калі пачуў, як Хрыста білі, укрыжавалі і як нарэшце Ён памёр, то ўпаў у фатэль і горка заплакаў. Ён паверыў у Збавіцеля, а цяпер гэты Збавіцель памёр. Я паглядзеў на яго, і мне зрабілася сорамна. Я называў сябе хрысціянінам, настаўнікам і пастарам, але ніколі не падзяляў пакутаў Хрыста так, як гэты расейскі афіцэр. Гледзячы на яго, я быццам зноўку ўбачыў Марыю Магдаліну, як яна плача ля падножжа крыжа і потым, калі Ісус быў толькі мёртвым целам у грабніцы. Тады я прачытаў яму пра Ўваскрасенне Хрыстова. Ён не ведаў, што ягоны Збавіцель уваскрос з мёртвых, і калі пачуў гэтую радасную навіну, ляснуў сябе па каленях і пачаў брудна лаяцца, але ў гэтай лаянцы была своеасаблівая «святасць».

Гаварыць іншай моваю ён проста не ўмеў. Ён зноў звесяліўся і пачаў гукаць: «Ён жыве! Ён жыве!» І зноў пусціўся ў скокі, ахоплены радасцю. Я сказаў яму: «Давайце памолімся». Ён не ўмеў маліцца і не ведаў нашае «святое» фразеалогіі. Ён укленчыў са мною і маліўся так: «Божа, які ты файны хлопец! Калі б Ты быў мною, а я Табою, я б ніколі не дараваў Табе Тваіх грахоў, але ты сапраўды файны хлопец! Я люблю Цябе ўсім сэрцам!» Мне здаецца, што ўсе анёлы ў небе кінулі свае заняткі і прыслухаліся да гэтае шчырае малітвы савецкага афіцэра. Гэты чалавек быў здабыты дзеля Хрыста! Іншым разам я сустрэў у краме савецкага капітана з жанчынаю-афіцэрам. Яны хацелі зрабіць шмат пакупак, і ім было цяжка дамовіцца з прадаўцом, які не разумеў ні слова па-расейску. Я прапанаваў свае паслугі як перакладчыка. Мы пазнаёміліся, і я запрасіў іх да сябе на абед. Перад ядою я сказаў: «У нас хрысціянскі дом, тут прынята маліцца». Я памаліўся па-расейску. Яны адклалі відэльцы і нажы: есці ім было ўжо нецікава. Пасыпаліся пытанні пра Хрыста, пра Бога, пра Біблію. Яны не ведалі анічога, і размаўляць з імі было нялёгка. Я расказаў ім прыпавесць пра гаспадара, які меў сто авец і адну згубіў. Але мазгі ў маіх слухачоў былі прамытыя камуністычнай ідэалогіяй, і яны запыталі: «Як гэта ў яго было сто авец? Няўжо іх яшчэ не забралі ў калгас?» Потым я сказаў, што Ісус – Цар. Яны адказалі, што ўсе цары – кепскія людзі, яны прыгнятаюць народ, і таму Ісус, напэўна, таксама

тыран. Пачуўшы прыпавесць пра работнікаў на вінаградніку, мае слухачы адказалі: «Яны добра зрабілі, паўстаўшы супроць гаспадара вінаградніка. Вінаграднік павінен належаць калектыву!» Усё было новым для іх. Калі я расказаў ім пра нараджэнне Ісуса, іх адказ здаўся б блюзнерствам кожнаму заходняму чалавеку: «А Марыя была жонкаю Бога?» У размовах з імі і з іншымі я зразумеў, што каб прапаведаваць Евангелле савецкім людзям, якія столькі гадоў пражылі пад камунізмам, патрэбны зусім іншы падыход. Так бывае з самымі рознымі культурамі. Місіянеры ў Цэнтральнай Афрыцы ніяк не маглі перакласці словы прарока Ісайі: «Калі грахі вашыя будуць як барвянае, – як снег убялю». Там ніхто ніколі не бачыў снегу, у мясцовых мовах не было нават назвы для яго, і давялося перакласці: «Вашыя грахі стануць белыя, як ядро какосавага арэху». Вось жа, мы мусілі перакладаць Евангелле на мову марксістаў, каб яны змаглі яго ўспрыняць. Самім бы нам гэта не ўдалося: цераз нас гэтую справу зрабіў Дух Святы. Той савецкі капітан і ягоная сяброўка навярнуліся да Хрыста ў той жа дзень. Пазней яны вельмі дапамаглі нам у падпольным служэнні сярод савецкіх людзей. Мы таемна друкавалі і распаўсюджвалі сярод іх тысячнымі накладамі Новыя Запаветы і іншую духоўную літаратуру. Праз навернутых да Хрыста чырвонаармейцаў мы перадавалі цалкам і па частках Біблii ў СССР. Для пашырэння Евангелля сярод савецкіх салдат мы ўжывалі і іншы спосаб.

Яны ваявалі ўжо гадамі, і шмат у каго былі дома дзеці, па якіх яны вельмі сумавалі. Наш сынок Міхай і іншыя дзеці, якім не споўнілася яшчэ дзесяці гадоў, падыходзілі да савецкіх салдат на вуліцах і ў парках з Бібліямі, Евангеллямі і іншай літаратурай у кішэнях. Чырвонаармейцы гладзілі іх па галоўцы, казалі ім ласкавыя словы і, успамінаючы сваіх родных дзетак, якіх не бачылі гадамі, частавалі іх шакаладам, цукеркамі, а дзеці давалі ім узамен Бібліі і іншыя кнігі, якія тыя прымалі з радасцю. Часта тое, што было для нас саміх занадта рызыкоўна, дзеці рабілі ў поўнай бяспецы. Праца гэтых «малых місіянераў» прынесла выдатны плён. Шмат хто з салдатаў атрымаў Евангелле такім чынам, калі іншага спосабу не было.

### Казанні ў армейскіх бараках

Мы працавалі сярод расейскіх чырвонаармейцаў не толькі праз асабістае сведчанне. Нам удавалася нават ладзіць з імі невялічкія сходы. Савецкія людзі вельмі любяць ручныя гадзіннікі. Салдаты кралі гадзіннікі ўва ўсіх. Яны спынялі людзей на вуліцы і патрабавалі: «Аддай гадзіннік». Сустракаліся салдаты з некалькімі гадзіннікамі на кожнай руцэ і нават жанчыны-афіцэры з будзільнікамі на шыі. У іх ніколі не было гадзіннікаў, і цяпер яны не маглі імі ўсыціцца. Калі румыну быў патрэбны гадзіннік, ён мусіў ісці ў расейскія баракі і купляць крадзены, часта свой уласны. Таму заходзіць у расейскія

баракі для румын было рэччу звычайнаю, і мы ў Падпольнай Царкве таксама траплялі туды пад выглядам пакупнікоў. Першы раз я прапаведаваў у савецкіх бараках на праваслаўнае свята Пятра і Паўла. Я прыйшоў у расейскую казарму як быццам па гадзіннік. Я рабіў выгляд, што адзін мне завялікі, другі замалы, трэці лішне дарагі. Вакол мяне сабралася некалькі салдат, і кожны прапаноўваў нешта купіць. Я, нібы жартам, запытаў: «Ці завуць каго-небудзь з вас Павел альбо Пётр?» Некаторых так і звалі, і я запытаў: «Ці ведаеце вы, што сёння праваслаўная царква ўшаноўвае святых Пятра і Паўла?» Некаторыя, хто старэйшы, ведалі пра гэта. Тады я запытаў: «А вы ведаеце, хто былі гэтыя Пётр і Павел?» Ніхто не ведаў, і я пачаў расказваць ім пра апосталаў. Тут адзін старэйшага веку салдат перапыніў мяне і сказаў: «Вы ж прыйшлі сюды не па гадзіннік, а каб пагаварыць з намі пра веру. Дык сядайце і кажыце, але вельмі асцярожна. Мы ведаем, каго трэба асцерагацца. Сярод нас такіх няма, але калі я пакладу вам руку на калена, гаварыце толькі пра гадзіннікі. Калі здыму, расказвайце далей». Вакол мяне сабраўся досыць вялікі натоўп, і я пачаў расказваць ім пра Пятра і Паўла і пра Хрыста, за Якога яны аддалі свае жыцці. Час ад часу падыходзіў нехта, каму мае слухачы не давяралі, і тады салдат клаў мне руку на калена, а я адразу пераводзіў гутарку на гадзіннікі. Калі ж той чалавек адыходзіў, я працягваў распавядаць пра Хрыста. З дапамогай расейскіх салдат, якія

ўверылі ў Бога, такія сустрэчы паўтараліся няраз. Шмат хто з іхніх таварышаў знайшоў тады веру ў Хрыста, і мы таемна раздалі тысячы Евангелляў. Шмат каго з братоў і сёстраў на гэтым лавілі і катавалі, але ніводзін не выдаў нашай арганізацыі. Падчас нашага служэння мы пазнаёміліся з вернікамі расейскае Падпольнае Царквы і пачулі ад іх пра тое, што яны перажылі. У іх былі відаць рысы вялікіх святых. Яны прайшлі праз доўгія гады камуністычнага выхавання, але як рыба, жывучы ў салонай марской вадзе, захоўвае сваё цела несалоным, так і яны, прайшоўшы праз савецкія школы і ўніверсітэты, захавалі душы чыстымі ў Хрысце. У гэтых савецкіх людзей былі такія прыгожыя душы! Яны казалі: «Мы ведаем, што зорка і серп і молат, якія мы носім на шапках, – гэта знак антыхрыста». Яны казалі гэта з вялікім смуткам. Я павінен сказаць, што яны мелі ўсе добрыя якасці хрысціян, – апрача радасці. Толькі пры сваім навярненні яны яе зазналі. Потым гэтая радасць знікала. Я часта разважаў пра гэта. Аднойчы я запытаў аднаго хрысціяніна: «Чаму вы не радуецеся?» Ён адказаў: «Як магу я радавацца, калі мне трэба тоіць ад пастыра мае царквы, што я сапраўдны хрысціянін? Што я жыву малітоўным жыццём, што я стараюся здабываць душы для Хрыста? Пастар нашае царквы – даносчык тайнай паліцыі. Мы сочым адзін за адным. Пастары здраджваюць сваю паству! Глыбока ў сэрцы мы носім радасць збавення, але адкрыта радавацца, як вы, мы ўжо не можам. Хрысціянства

стала для нас драмаю. Калі ў вольных краінах хрысціяне здабываюць душы дзеля Хрыста, новы вернік спакойна ўваходзіць ува ўлонне вашае царквы, а ў нас у паняволеных краінах нованавернуты можа трапіць у турму і дзеці яго застануцца сіротамі. Радасць прывесці каго-небудзь да Хрыста заўсёды змяшаная з болем за тую цану, якую трэба за гэта заплаціць». Так мы пазнаёміліся з зусім новым тыпам вернікаў: хрысціянамі Падпольнае Царквы. Тут нас чакала багата неспадзяванак. Шмат хто лічыць сябе хрысціянамі, ня будучы імі. Але сярод савецкіх людзей мы знайшлі нямала такіх, якія лічылі сябе атэістамі, а насамрэч верылі ў Бога. Я пазнаёміўся з сям'ёю скульптараў. Калі я загаварыў з імі пра Бога, муж адказаў: «Не, Бога няма. Мы бязбожнікі. Але мы раскажам вам адну цікавую рэч, якая адбылася з намі. Аднаго разу мы працавалі над статуяй Сталіна, і пасярод працы жонка запытала: «Паслухай: вось вялікі палец. Калі б у нас на руках не было гэтага аднаго пальца насупраць астатніх – калі б на руках пальцы былі, як на нагах – мы не маглі б трымаць ні малаток, ні кнігу, ні лусту хлеба. Без яго нельга было б жыць. Але хто яго стварыў? Мы з табой вучылі ў школе марксізм і ведаем, што неба і зямля з'явіліся самі сабою, а не Бог іх стварыў. Так мяне вучылі, і так я і думаю. Але калі б Бог не стварыў ні неба, ні зямлі, а толькі адзін гэты палец, за адну гэтую драбніцу ён быў бы ўжо варты нашае пашаны. Мы славім Эдысана, Бэла і Стэф энсана за тое, што

яны вынайшлі электрычную лямпку, тэлефон, чыгунку і шмат іншага, але чаму б нам не праславіць Таго, Хто вынайшаў наш вялікі палец? Калі б у Эдысана не было гэтага пальца, ён бы нічога не вынайшаў. Таму славіць Бога, Які стварыў вялікі палец, будзе толькі справядліва». Муж вельмі разлаваўся, як часта бывае з мужамі, калі жонкі кажуць ім нешта разумнае, і закрычаў: «Не кажы глупстваў! Ты ж добра ведаеш, што Бога няма. І адкуль ты ведаеш што нас ніхто не падслухоўвае? Мы можам трапіць у сур'ёзную бяду! Зарубі сабе на носе раз назаўсёды, што Бога няма. У небе няма нікога!» Яна адказала: «Тады гэта яшчэ большы цуд. Калі б на небе быў Бог, у якога ў сваім невуцтве верылі нашыя продкі, тады было б зусім натуральна, што ў нас ёсць вялікія пальцы. Калі Ўсемагутны Бог можа ўсё зрабіць, то мог ён стварыць і вялікі палец. Але калі ў небе няма нікога, то буду ад усяго сэрца славіць гэтага «нікога», які стварыў гэты палец!» І яны сталі пакланяцца гэтаму «нікому»! З цягам часу іх вера большала. Яны лічылі Яго Творцам не толькі вялікага пальца, але і зор, кветак, дзяцей і ўсяго прыгожага ў свеце. Гэта было акурат як у Афінах, дзе апостал Павел знайшоў людзей, якія пакланяліся «Няведамаму Богу». Яны з невымоўнай радасцю пачулі ад мяне, што верылі яны правільна, што ў небе сапраўды ёсць «Ніхто» – Бог, які ёсць Дух. Гэта Дух любові, мудрасці, праўды і моцы, які так палюбіў іх, што паслаў Свайго адзінароднага Сына ахвяраваць Сабою за іх на крыжы.

Яны верылі ў Бога, не ведаючы пра гэта. На маю долю выпаў вялікі гонар дапамагчы ім зрабіць яшчэ ўсяго адзін крок – да досведу збавення і адкуплення праз Хрыста. Аднойчы я сустрэў на вуліцы расейскую жанчыну-афіцэра. Падыйшоўшы да яе, я папрасіў прабачэння: «Я ведаю, што нявetліва загаворваць на вуліцы з незнаёмаю жанчынай, але я пастар і маю зусім сур'ёзныя намеры. Я хацеў бы пагаварыць з вамі пра Хрыста». Яна запытала: «Вы любіце Хрыста?» Я адказаў:«Так, усім маім сэрцам!» Яна абняла мяне і пачала цалаваць. Гэта было вельмі няёмка для мяне як для пастара, і я пацалаваў яе ў адказ, спадзеючыся, што нас прымуць за сваякоў. Яна ўсклікнула: «Я таксама люблю Хрыста!» Я запрасіў яе да нас дадому, і на сваё вялікае дзіва высветліў, што яна нічога не ведае пра Хрыста, нічагуткі – апрача Ягонага імя. І ўсё ж яна любіла яго. Яна не ведала, што Ён Збаўца, што такое збавенне, дзе Ён жыў і як памёр, чаму вучыў і як служыў у сваім зямным жыцці. Для мяне гэтая жанчына была псіхалагічнаю загадкай. Як можна любіць некага, ведаючы пра яго толькі імя? На мае роспыты яна распавяла: «Калі я была малая, мяне вучылі чытаць па малюнках: А – абажур, Б – бусел, В – вожык, і так далей. Калі я пайшла ў інстытут, мне ўвялі ў галаў, што мой святы абавязак – гэта абарона камуністычнае Радзімы. Мяне вучылі камуністычнай маралі, але я не ведала, не магла сабе ўявіць, што такое «святы абавязак» і «мараль». Мне патрэбны быў малюнак,

каб гэта зразумець. А я ведала, што ў нашых продкаў былі малюнкі для ўсяго прыгожага, вартага і сапраўднага ў жыцці. Мая бабуля заўсёды кленчыла перад такім малюнкам і казала, што там намаляваны нейкі «Хрыстос», і я палюбіла гэтае імя. Яно стала для мяне зусім рэальным. Толькі прамовіць яго было мне так радасна!» Слухаючы яе, я ўспомніў, што напісана ў Святым Пісанні: «... каб перад іменнем Ісуса сукланілася ўсякае калена» (Флп. 2:10). Можа антыхрысту і ўдасца на нейкі час сцерці са свету веданне Бога, але ў самым імені Ісуса Хрыста ёсць сіла, якая павядзе людзей да святла. Гэтая жанчына радасна прыняла Хрыста ў маім доме, і цяпер Той, Чыё імя яна любіла з маленства, пасяліўся ў яе сэрцы. Кожная хвіліна, праведзеная з савецкімі людзьмі, была поўная паэзіі і глыбокага сэнсу. Адна сястра, якая раздавала кніжкі на чыгуначнай станцыі, дала мой адрас афіцэру, які імі зацікавіўся. Аднойчы вечарам ён зайшоў да мяне дадому. Гэта быў высокі, прыгожы савецкі лейтэнант. Я запытаў яго: «Чым магу служыць?» Ён адказаў: «Я прыйшоў па святло». Тады я пачаў чытаць яму галоўныя месцы Пісання. Ён узяў мяне за руку і сказаў: «Прашу вас ад душы, не ўводзьце мяне ў зман. Я належу да народа, які доўга трымалі ў цемры. Скажыце, гэта сапраўднае Слова Божае?» Я запэўніў яго, што гэта так. Ён слухаў шмат гадзін – і прыняў Хрыста. Расейцы ніколі не падыходзяць да справаў веры павярхоўна. У змаганне за рэлігію альбо супраць яе яны

ўкладаюць усю душу. Вось чаму ў Расеі пры камунізме хрысціяне сталі місіянерамі, якія змагаюцца за людскія душы. Расейцы заўсёды былі рэлігійным народам. Іх краіна даспела да плённай евангельскай працы, і калі мы дамо ім Евангелле, хада сусветнае гісторыі можа перамяніцца. Якая трагедыя, што СССР і яго народ, якія так прагнуць Слова Божага, шмат хто, здаецца, спісаў ужо з рахунку. Нашае служэнне савецкім людзям было вельмі плённым. Я памятаю Пятра. Ніхто не ведае, у якой з савецкіх турмаў ён загінуў. Ён быў такі малады – усяго 20 гадоў! Ён прышоў у Румынію з савецкай арміяй, навярнуўся да Хрыста на падпольным сходзе і папрасіў, каб я ахрысціў яго. Пасля хросту я запытаў, які верш у Бібліі найбольш уразіў яго і прывёў да Хрыста? Ён сказаў, што на адным таемным сходзе я чытаў з 24 раздзелу Евангелля ад Лукі, як двое вучняў сустрэлі Ісуса на дарозе ў Эмаус. Калі яны падыйшлі да вёскі, «Ён [Ісус] паказаў ім від, што хоча йсці далей» (Лк. 24:28). «Я задумаўся, – сказаў Пётр, – чаму Ісус так зрабіў. Яму ж, напэўна, хацелася застацца са Сваімі вучнямі. Чаму ж Ён тады казаў, што хоча ісці далей? І я растлумачыў гэта тым што Ісус быў вельмі далікатны: Ён хацеў быць цалкам упэўнены, што Ён жаданы Госць. Калі Ён убачыў, што Яго шчыра запрашаюць, Ён радасна ўвайшоў і застаўся з імі. Камуністы не маюць такой далікатнасці. Яны гвалтам урываюцца нам у розум і сэрца людзей. Яны прымушаюць нас слухаць іх з ранку да ночы. Яны

робяць гэта праз свае школы, радыё, газеты, плакаты, кіно, сходы бязбожнікаў, – усюды, куды ні павярніся. Вы мусіце ўвесь час слухаць іхную бязбожную прапаганду, падабаецца вам гэта ці не. А Ісус лічыцца з нашай свабодай. Ён ціха стукаецца ў дзверы нашага сэрца. Ісус пакарыў мяне сваёй далікатнасцю», – скончыў Пётр. Яго пераканаў гэты рэзкі кантраст паміж Хрыстом і камуністамі. Гэтая рыса характару Хрыста ўражвала не толькі яго, але і іншых савецкіх людзей. (Я, як пастар, ніколі не думаў пра гэта з такога пункту гледжання.) Пасля свайго навярнення Пётр няраз рызыкаваў свабодай і жыццём, кантрабандна перавозячы хрысціянскую літаратуру ў Расею. Урэшце яго схапілі. Калі я апошні раз чуў пра яго, ён быў яшчэ ў турме. Ці ўжо ён у небе, ці яшчэ працягвае змаганне са злом на зямлі? Толькі Бог ведае, дзе ён цяпер. Здабыць душу для Хрыста – толькі пачатак, і спыняцца на ім нельга. Кожны нованавернены павінен сам стаць лаўцом душ. Расейцы не толькі навярталіся самі, яны рабіліся місіянерамі Падпольнае Царквы. Яны былі самаадданымі і бясстрашнымі і заўсёды шкадавалі, што так мала робяць дзеля Хрыста, які памёр за іх.

### Нашае падпольнае служэнне паняволенаму народу

Другі аспект нашага служэння – падпольная місіянерская праца сярод румынаў. Напачатку

камуністы рознымі спакусамі прываблівалі царкоўных лідэраў на свой бок, але вельмі хутка яны скінулі маску. Пачаўся тэрор. Тысячы людзей былі арыштаваныя, і здабыць душу дзеля Хрыста зрабілася нам гэтаксама цяжка, як і савецкім людзям. Пазней я сустракаў у турме людзей, якіх Бог дапамог мне прывесці да Хрыста. У адной камеры са мною сядзеў за веру бацька шасцёх дзяцей. Ягоныя жонка і дзеці галадалі, і ён не спадзяваўся сустрэцца з імі. Я запытаў яго: «Ці не крыўдуеце вы на мяне за тое, што я прывёў вас да Хрыста, і цяпер вашая сям'я так бядуе?» Ён адказаў: «У мяне няма словаў, каб аддзячыць вам за тое, што вы прывялі мяне да такога цуднага Збавіцеля. Я не хачу нічога мяняць у жыцці». Пропаведзь у новых умовах зрабілася нялёгкай. Народ апынуўся пад страшным уціскам. Камуністы адабралі ў людзей усё: у сялян яны забралі палеткі і авечак, у цырульніка і краўца дробныя майстэрні, з якіх яны карміліся. Не толькі капіталісты пазбыліся ўсяго, бедныя таксама цярпелі. Амаль у кожнай сям'і нехта сядзеў у турме, і паўсюль панавала галеча. Людзі пыталіся: «Чаму Бог любові дапускае такое зло?» Апосталам таксама было б цяжка прапаведаваць Хрыста ў Страсную Пятніцу, калі Той вісеў на крыжы і стагнаў: «Божа Мой, Божа Мой, чаму Ты пакінуў Мяне?» Але паколькі справа ўсё ж рабілася, відаць, што яна была ад Бога, а не ад нас. Хрысціянская вера мае адказ на такія пытанні. Ісус расказаў нам пра беднага Лазара, прыніжанага,

як мы ў той час: ён паміраў, галадаў, ягоныя раны лізалі сабакі, але калі ён памёр, Анёлы аднеслі яго на ўлонне Аўраамава.

### Як Падпольная Царква дзейнічала адкрыта

Падпольная Царква збіралася ў прыватных дамах, лясах, скляпах, усюды, дзе толькі было магчыма. Пры камуністах мы распрацавалі план вулічных казанняў. Гэта была вельмі рызыкоўная справа, але такім чынам мы дасягалі душ, да якіх было не дабрацца ніякім іншым чынам. Мая жонка брала асабліва чынны ўдзел у гэтай справе. Некалькі вернікаў збіраліся на рагу вуліцы і пачыналі спяваць. Гэта прыцягвала людзей, і тады мая жонка казала слова пра Госпада... Перш чым з'яўлялася паліцыя, мы знікалі. Аднойчы, калі я быў заняты ў іншым месцы, жонка выступала перад тысячным натоўпам рабочых каля ўваходу на вялікую фабрыку «MALAXA» ў Бухарэсце. Яна казала пра Бога і збавенне. На другі дзень шмат рабочых гэтае фабрыкі былі расстраляныя за пратэст супроць несправядлівасцяў камуністаў. Яны пачулі Добрую Вестку ў самую пару! Мы былі Падпольнаю Царквою, але, як Ян Хрысціцель, мы адкрыта казалі простым людзям і ўладарам пра Хрыста. Аднойчы на прыступках урадавага будынку двое нашых братоў прабіліся да прэм'ер-міністра Румыніі Георгіу Дэж і за нейкую хвіліну паспелі засведчыць яму пра Хрыста, угаворваючы яго пакаяцца ў грахах і

спыніць ганенні. За смелае сведчанне ён загадаў кінуць іх у турму. Праз шмат гадоў, калі прэм'ер-міністр Дэж цяжка захварэў, пасеянае гэтымі братамі ў яго душы слова Евангелля прынесла свой плён. У цяжкай патрэбе прэм'ер-міністр успомніў пачутае тады слова, «жывое і дзеючае ды гастрэйшае за ўсякі меч двусечны» (Габр. 4:12). Яно працяло жорсткасць ягонага сэрца, і ён адаўся Хрысту. Ён пакаяўся ў грахах, прыняў Збавіцеля і пачаў у хваробе служыць Яму. Неўзабаве ён памёр, але па смерці пайшоў да свайго Госпада толькі таму, што двое хрысціянаў заплацілі за гэта высокую цану. Так няраз бывае з адважнымі хрысціянамі ў сучасных камуністычных краінах. Пропаведзь Евангелля ў новых умовах была нялёгкаю, але нам удалося надрукаваць некалькі духоўных брашураў, правёўшы іх праз строгую камуністычную цэнзуру. Мы падавалі цэнзару брашуры з партрэтам Карла Маркса на вокладцы, пад назвай «Рэлігія – опіум для народу». Цэнзар прымаў нашыя кнігі за камуністычныя і ставіў на іх сваю пячатку. А праз некалькі старонак цытат з Маркса, Леніна і Сталіна, наўмысна надрукаваных дзеля цэнзуры, пачыналася нашая вестка пра Ісуса Хрыста. З нашымі «камуністычнымі» брашурамі мы хадзілі на дэманстрацыі і адкрыта раздавалі іх людзям. Камуністы, бачачы партрэт Маркса, разбіралі ў нас брашуры наўзахапкі. Але пакуль яны даходзілі да дзесятае старонкі і бачылі, што там гаворыцца пра Бога і Ісуса, мы ўжо былі далёка. Вось жа, Падпольная Царква працавала

не толькі патаемна, але і адкрыта, дзёрзка абвяшчала Евангелле на вуліцах і перад уладамі. Гэта каштавала дорага, але мы былі гатовыя заплаціць за гэта. І ў нашыя дні Падпольная Царква гатовая абвяшчаць Евангелле любою цаною.

### Таемная праца

Улады жорстка пераследавалі Падпольную Царкву, бо ў ёй бачылі апошнюю магчымасць дзейснага супраціву. Наш духоўны супраціў падрываў сілы атэізму. Улады адразу ўбачылі, як толькі д'ябал умее, пагрозу для сябе. Яны ведалі, што як толькі чалавек уверыць у Хрыста, ён ужо ніколі не будзе бяздумна ім падпарадкоўвацца. Яны ведалі, што могуць садзіць людзей у турмы, але не могуць арыштаваць людскога духу – веру ў Бога. Таму яны так жорстка змагаліся з намі. Аднак Падпольная Царква мела спагаднікаў і сяброў нават ува ўрадзе і ў тайнай паліцыі. Мы раілі некаторым нашым братам уступаць у тайную паліцыю і апранаць самую ненавісную ў краіне форму, каб паведамляць нам пра дзеянні і планы нашых ворагаў. Некаторыя нашыя браты зрабілі так, схаваўшы сваю веру. Ім было нялёгка зносіць пагарду родных і блізкіх, насіць форму, якая ўва ўсіх выклікала агіду, і тоіць сваё сапраўднае прызначэнне. Але яны ішлі на гэта, бо іх любоў да Хрыста была мацнейшая за ўсё. Калі мяне схапілі на вуліцы і некалькі гадоў трымалі ў поўнай таямніцы, то каб даведацца, дзе я, адзін ле-

кар-хрысціянін пайшоў служыць у тайную паліцыю. Ад яго адвярнуліся ўсе сябры, вырашыўшы, што ён стаў камуністам. Бо насіць форму ката – яшчэ горш, чым форму арыштанта. Гэты лекар знайшоў мяне глыбока ў цёмнай адзіночцы і перадаў на волю вестку, што я жывы. Дзякуючы яму пра мяне стала вядома, і падчас «адлігі» 1956 году, у часы Хрушчова і Эйзэнхаўэра, браты запатрабавалі майго вызвалення, і я зноў апынуўся на волі. Каб не ягоная самаахвярнасць, я, можа, дагэтуль быў бы ў турме – або ў магіле. Скарыстоўваючы свае пасады ў тайнай паліцыі, гэтыя браты Падпольнае Царквы няраз папярэджвалі нас пра небяспеку і тым самым неацэнна дапамагалі нам. І цяпер у тайнай паліцыі ў камуністычных краінах ёсць вернікі з Падпольнае Царквы, якія дапамагаюць сваім братам, папярэджваючы пра небяспеку. Некаторыя з іх знаходзяцца нават у найвышэйшых дзяржаўных колах! Захоўваючы веру ў Хрыста ў таямніцы, яны вельмі дапамагаюць нам. Надыйдзе дзень, калі на небе яны змогуць адкрыта ўславіць Хрыста, Якому служылі тут патаемна. Аднак былі сярод нас і «Юды», якія даносілі пра нашую дзейнасць. Праз збіццё, пагрозы, наркотыкі і шантаж камуністы стараліся прымусіць пастараў і радавых вернікаў даносіць на сваіх братоў.

*Раздзел 2*

## «НІХТО НЕ МАЕ ЛЮБОВІ БОЛЬШАЕ...»

Я працаваў і афіцыйна і падпольна да 29 лютага 1948 году. У гэты дзень была нядзеля. Па дарозе ў царкву мяне схапіла на вуліцы тайная паліцыя. Я няраз задаваўся пытаннем, што такое выкраданне людзей, якое згадваецца некалькі разоў у Біблії? Камуністы нам гэта растлумачылі. У той час шмат каго выкрадалі падобным чынам. Перада мною спыніўся паліцэйскі фургон, з яго выйшлі чатыры чалавекі, схапілі мяне і запхнулі ўсярэдзіну. Восем з паловай гадоў ніхто не ведаў, жывы я ці не. Да маёй жонкі пад выглядам адпушчаных на волю арыштантаў прыходзілі агенты тайнай паліцыі і казалі ёй, што былі ў турме на маім пахаванні. Яна была ў роспачы. Тысячы вернікаў розных вызнанняў сядзелі тады ў турме. Не толькі святары, але і простыя сяляне, падлеткі – хлопчыкі і дзяўчынкі – сядзелі за тое, што сведчылі аб сваёй веры. Турмы былі перапоўненыя, а ў Румыніі, як і ўва ўсіх камуністычных краінах, турма – гэта катоўня. Катаванні былі страшныя. Я не хацеў бы шмат казаць пра тыя, якія мне давялося перанесці самому. Калі я ўспамінаю пра іх, я не магу спаць. Падрабязней пра тое, як я жыў з Богам у турме, я расказаў у кнізе «У Божым падполлі» («In God's underground»).

## Невымоўныя катаванні

Пастара Фларэску катавалі распаленым жалезам і нажамі. Страшна збіўшы, яго кінулі ў камеру. Потым па трубах да яго ў камеру запусцілі галодных пацукоў, і ён не мог спаць, бо мусіў ад іх адбівацца. Як толькі ён спрабаваў адпачыць, пацукі накідаліся на яго. Яго прымусілі стаяць два тыдні дзень і ноч на нагах, каб ён выдаў братоў па веры, але ён маўчаў. Нарэшце прывялі ягонага 14-гадовага сына і пачалі біць яго на вачах у бацькі, кажучы, што не перастануць, пакуль пастар не назаве імёны сваіх братоў. Няшчасны чалавек амаль звар'яцеў. Ён цярпеў, як мог, але нарэшце гукнуў сыну: «Аляксандр, я скажу ім! Я не магу глядзець, як яны цябе б'юць!» Хлопец адказаў: «Тата, не абражай мяне так. Хай не будзе здрадніка ў нашай сям'і. Трымайся! Калі яны мяне заб'юць, я памру са словамі: «Ісус і Айчына!» Камуністы так раз'юшыліся, што накінуліся на хлопца і забілі яго да смерці. Кроў запырскала сцены і столь. Ён памёр, славячы Бога, а наш любы брат Фларэску больш ніколі не быў такі, як раней. На рукі нам надзявалі кайданкі з вострымі цвікамі ўсярэдзіну. Калі мы зусім не рухаліся, цвікі нас не трывожылі, але калі мы дрыжалі ад холаду ў нашых неацепленых камерах, цвікі рвалі нам скуру. Вернікаў вешалі дагары нагамі на вяроўках і білі так моцна, што цела лётала назад і ўперад пад ударамі. Вернікаў садзілі ў камеры-халадзільнікі з абледзянелымі сценамі і столлю – марозілі, адагравалі, зноў замарожвалі

ледзь не да смерці, і так бясконца. Мяне таксама садзілі ў такую камеру, амаль без адзежы. Турэмныя лекары назіралі праз адтуліну, і калі заўважалі, што вязень замярзае, давалі сігнал надзорам, і тыя выцягвалі нас і адагравалі, каб потым адразу зноў запхнуць у камеру. Яшчэ і сёння я часам не магу прымусіць сябе адчыніць халадзільнік. Вернікаў ставілі ў вузкія скрыні, крыху толькі шырэйшыя за цела. Там было не павярнуцца. Тады з усіх бакоў у скрыню забіваліся вострыя цвікі, і пакуль мы стаялі нерухома, усё было добра, але варта было ледзь павярнуцца, і цвікі давалі пра сябе знаць. Нас прымушалі стаяць у гэтых скрынях нялічанымі ґадзінамі, і калі мы стамляліся і пачыналі хіліцца набок, цвікі ўпіваліся нам у цела. Ледзь зварухнешся альбо напружыш мускул – усюды страшныя цвікі. Тое, што камуністы рабілі з хрысціянамі, перавышае любое ўяўленне. Я бачыў на тварах катаў радасць і захапленне, калі яны катавалі і мучылі вернікаў. Яны крычалі, катуючы: «Мы – д'ябал!» Так, «наша барацьба не супраць крыві й цела, але супраць начальства, супраць уладаў, супраць сусветных валадароў цемры гэтага веку, супраць духаў злосці паднябеснай» (Еф. 6:12). Мы ўбачылі, што камунізм не ад чалавека, а ад д'ябла. Сіла зла – духоўная сіла, і ёй можна супрацьпаставіць толькі мацнейшую сілу – сілу Духу Божага. Я часта пытаўся ў маіх катаў: «Няўжо ў вас няма жалю ў сэрцы?» Яны звычайна адказвалі цытатаю з Леніна: «Лес сякуць – трэскі ляцяць». Я казаў, што таксама

ведаю гэтую ленінскую цытату, але ж дрэва – не чалавек. Дрэву не баліць, калі яго сякуць, а вы маеце справу з жывымі людзьмі. Але ўсё дарма. Гэта былі матэрыялісты, для якіх чалавек – што бервяно ці яечнае шалупінне. З гэтаю верай яны дасягнулі невымоўных глыбіняў жорсткасці. Калі чалавек не верыць ува ўзнагароду за дабро і пакаранне за зло, у яго няма прычын быць чалавекам. Нішто не адгароджвае яго ад глыбіняў зла, якое жыве ў кожным з нас. Камуністычныя каты часта паўтаралі: «Бога няма, вечнага жыцця няма, пакарання за зло няма. Мы можам рабіць усё, што хочам». Я чуў нават, як адзін кат сказаў: «Я ўдзячны Богу, у якога я не веру, што дажыў да таго часу, калі магу свабодна праяўляць усё зло, якое сядзіць у мяне ў сэрцы». Ён выказваў гэтае зло ў страшэннай жорсткасці, з якою мучыў вязняў. Мне шкада, калі кракадзіл з'ядае чалавека, але я не магу папракнуць за гэта кракадзіла. Ён – не маральная істота. Гэтаксама немагчыма папракаць камуністаў, бо яны забілі ў сабе пачуццё маральнай адказнасці. Яны хваліліся, што не маюць жаласці. Сяму-таму я, аднак, у іх навучыўся. Яны не давалі ў сваім сэрцы месца Ісусу, і я вырашыў не даваць у маім сэрцы ні кроплі месца сатане. Я сведчыў перад Падкамітэтам унутранае бяспекі Сэнату ЗША і расказваў пра страшныя рэчы, якія бачыў і зазнаў. Хрысціян прывязвалі да крыжоў на чацвёра сутак. Потым крыжы клалі на падлогу, і сотні вязняў павінны былі прыходзіць і спраўляць патрэбы на твар і на цела распятых. Пасля гэтага

крыжы зноў падымалі, і камуністы кпілі і здзекаваліся: «Глядзіце на вашага Хрыста! Які Ён прыгожы! Які цудоўны водар нясе Ён з неба!» Я расказаў пра тое, як аднаго святара, амаль звар'яцелага ад мук, прымусілі асвяціць кал і мачу і даваць іх хрысціянам, нібы Св. Прычасце. Пазней я запытаў гэтага святара, чаму ён не выбрау смерць, лепш чым гэтае блюзнерства. Ён адказаў: «Не судзіце мяне, калі ласка! Я пакутаваў больш за Хрыста!» Усе апісанні пекла ў Біблii і ў «Боскай камедыі» Дантэ – нішто ў параўнанні з катаваннямі ў камуністычных турмах. Усё гэта адбылося толькі ў адну нядзелю ў турме ў Пітэшці. Некаторыя рэчы я не бяруся апісваць, бо сэрца не вытрымае. Але ўсе ў турме ведалі не толькі пра катаванні, але і пра подзвігі. Гераічны прыклад вязняў служыў маральнай падтрымкай братам на волі. Адным з вялікіх герояў веры стаў пастар Мілан Хаймовіч. Турмы былі перапоўненыя, і ахова не ведала ўсіх нас у твар. Тых, каму належала дваццаць пяць удараў бізунамі за парушэнне якога-небудзь турэмнага правіла, выклікалі пайменна. Не падлічыць, колькі разоў пастар Хаймовіч ішоў пад бізуны за іншых людзей. За гэта вязні шанавалі не толькі яго, але і Хрыста, у імя Якога ён так рабіў. У нас у Падпольнай Царкве была адна дзяўчына-місіянерка. Паліцыя даведалася, што яна таемна раздавала духоўную літаратуру і Евангеллі і казала дзецям пра Хрыста. Яны вырашылі арыштаваць яе, але, каб арышт стаў як найбольш балючым, яны вырашылі адкласці

яго на некалькі тыдняў – да дня яе вяселля. У той дзень яна была ў шлюбным строі – гэта быў самы радасны дзень у яе жыцці! Нечакана адчыніліся дзверы, і ў дом уварваліся агенты тайнай паліцыі... Убачыўшы іх, яна працягнула рукі ўперад, каб яны маглі надзець ёй кайданкі. Паглядзеўшы ў вочы жаніху, яна пацалавала ланцугі і сказала: «Я дзякую майму Нябеснаму Жаніху за гэтыя аздобы, якія Ён падараваў мне на вяселле. Я ўдзячная Яму за тое, што Ён палічыў мяне годнаю цярпець за Яго». Яе пацягнулі прэч пад слёзы сяброў-вернікаў і жаніха, які з тугою глядзеў ёй услед. Усе ведалі, што чакае дзеўчыну-хрысціянку ў руках камуністычных турэмшчыкаў. Праз пяць гадоў яе выпусцілі, але гэта ўжо была не яна, а нямоглая жанчына, якая выглядала старэйшаю на трыццаць гадоў. Жаніх дачакаўся яе. І яна казала, што зрабіла дзеля свайго Хрыста толькі самую драбніцу. Вось якія прыгожыя вернікі ёсць у Падпольнай Царкве!

### Як процістаяць прамыванню мазгоў?

На Захадзе, мабыць, чулі аб прамыванні мазгоў падчас Карэйскай і В'етнамскай войнаў. Я сам прайшоў праз яго. Гэта самае жахлівае катаванне. Цэлыя тыдні, месяцы, гады мы павінны былі сядзець па 17 гадзін на дзень і слухаць адно і тое ж: «Камунізм – гэта добра! Камунізм – гэта добра! Хрысціянства – гэта дурасць! Хрысціянства – гэта дурасць! Здавайцеся! Здавайцеся! Здавайцеся!».

Некаторыя вернікі пыталіся ў мяне, як можна супроцьстаяць прамыванню мазгоў. Ад прамывання мазгоў ёсць толькі адзін сродак: «прамыванне сэрца». Сэрца, якое абмыта любоўю Хрыста і любіць Яго, можа перанесці любыя катаванні. Чаго не зрабіла б нявеста для каханага жаніха! Чаго б не зрабіла маці для свайго дзіцяці! І калі любіш Хрыста, як Марыя, якая трымала Яго на руках Немаўлём, калі любіш Яго, як нявеста жаніха, тады гэтаму катаванню можна спрацівіцца. Бог будзе судзіць нас не па тым, колькі мы перанеслі, а па тым, як мы ўмеем любіць. І я сведка, што хрысціяне, якія цярпелі за сваю веру, умелі любіць Бога і людзей. Катаванні ішлі адно за другім. Калі я траціў свядомасць ці быў такі слабы, што мае мучыцелі трацілі надзею атрымаць ад мяне «прызнанне», мяне кідалі ў камеру без догляду, напоўмёртвага, пакуль я не набяруся сіл, каб яны зноў маглі мучыць мяне. Шмат хто так і паміраў, але да мяне нейкім чынам сілы заўсёды вярталіся. У наступныя гады ў розных турмах мае мучыцелі зламалі мне чатыры хрыбеткі і пераламалі шмат іншых касцей. Яны выпалілі і выразалі на мне 18 ран. Калі нас з сям'ёю выкупілі з Румыніі і перавезлі ў Нарвегію, лекары ў Осла, аглядаючы гэтыя раны і рубцы на лёгкіх ад сухотаў, казалі: тое, што я яшчэ жывы, – гэта чысты цуд! Паводле іхных мэдыцынскіх падручнікаў я мусіў даўно памерці. Я ведаю, што гэта цуд. Бог ёсць Бог цудаў! Я веру, што Бог стварыў гэты цуд, каб вы пачулі мой голас, гукаючы ў абарону Падпольнай

Царквы за Жалезнай Заслонаю. Ён дазволіў мне, аднаму з многіх, выжыць і пракрычаць вестку ад вашых спакутаваных, верных братоў.

### Нядоўгая воля і новы арышт

Надыйшоў 1956 год. Я сядзеў у турме восем з паловай гадоў. Я моцна схуднеў, пакрыўся брыдкімі шнарамі. Мяне жорстка білі, аплёўвалі, здзекаваліся з мяне. Я галадаў, цярпеў допыты да ванітаў, мне гразілі і мной пагарджалі, але зламаць мяне ім не ўдалося. Расчараваныя, сярод хвалі пратэстаў супраць майго зняволення, яны мяне выпусцілі. Мне дазволілі вярнуцца ў маю старую царкву ўсяго на тыдзень. Я прамовіў там дзве казані. Тады мяне выклікалі і забаранілі прапаведаваць і ўвогуле займацца рэлігійнай дзейнасцю. Што ж я такога сказаў? Я заклікаў слухачоў мець «цярпенне, цярпенне і яшчэ раз цярпенне». «Гэта значыць, ты казаў ім цярпець, пакуль не прыйдуць амерыканцы і не вызваляць іх!» – крычаў на мяне паліцэйскі. Я казаў таксама, што кола круціцца і час мяняецца. «Ты казаў, што камуністы не вечна будуць пры ўладзе! Гэта контррэвалюцыйная хлусня!» – крычалі яны мне. Так прыйшоў канец майму публічнаму служэнню. Мабыць, улады спадзяваліся, што я збаюся кідаць ім выклік і сведчыць падпольна, але тут яны ашукаліся. Употай ад іх я вярнуўся да ранейшае справы. Сям'я падтрымала мяне. Я зноўку пачаў прапаведаваць падпольным групам вернікаў,

прыходзячы і сыходзячы, як прывід, пад аховай надзейных людзей. Сваімі шнарамі я пацвярджаў сведчанне пра зло камуністычнага светапогляду. Я заахвочваў нерашучых да веры ў Бога і смеласці. Я стаў на чале тайнай сеткі евангелістаў, якія супольна шырылі Евангельскую Вестку на вачах у аслепленых Богам камуністаў. Бо калі чалавек настолькі сляпы, што не бачыць працы рук Божых, ён не ўбачыць і працы евангеліста. Урэшце паліцыя, якая няспынна цікавала, чым я займаюся і дзе бываю, дайшла свайго. Мяне зноў знайшлі і арыштавалі. Гэтым разам чамусьці маю сям'ю пакінулі на волі, можа таму, што я стаў досыць вядомы. Спачатку я быў правёў у турме восем з паловай гадоў; потым тры гады быў на адноснай свабодзе. Цяпер мяне засудзілі яшчэ на пяць з паловай гадоў. Другое вязенне было ў шмат якіх дачыненнях горшым за першае. Я ведаў, што мяне чакае. Мой фізічны стан адразу рэзка пагоршаў. І ўсё ж мы і ў турме вялі нашу евангельскую працу.

### Размеркаванне абавязкаў: яны б'юць, а мы прапаведуем

Прапаведаваць у турме было сурова забаронена, і ўсе ведалі, што за казанні жорстка б'юць. Але некаторыя з нас былі гатовыя заплаціць гэтую цану за права абвяшчаць Слова Божае, і мы прынялі гэтыя ўмовы. Гэта была свайго роду ўгода: мы з радасцю прапаведавалі, а яны з радасцю нас білі,

і ўсе былі рады. Наступная сцэна здаралася так часта, што я збіўся з ліку. Адзін з братоў прапаведуе вязням. Раптам урываюцца ахоўнікі, спыняюць яго на поўслове і валакуць калідорам у «пакой для біцця». Праз кавалак часу, які здаваўся нам бясконцым, яго прыцягвалі збітага, скрываўленага, і кідалі на падлогу. Памалу, з цяжкасцю ён падымаўся на локці, потым зусім уставаў, папраўляў адзежу і ціха казаў: «Ну, браты, на чым мы спыніліся?» І ён працягваў евангельскую вестку! Так, я пабачыў прыгожыя рэчы! Часам казаннікамі былі шараговыя вернікі, і гэтыя простыя людзі, натхнёныя Святым Духам, прамаўлялі цудоўныя казані! Яны ўкладалі ўсю душу ў свае словы. Бо прапаведаваць у такіх умовах было нялёгка. Потым прыходзілі ахоўнікі, забіралі казанніка і збівалі яго да поўсмерці. У турме ў Герла быў хрысціянін Грэку, якога прысудзілі да смерці праз збіццё. Яго забівалі некалькі тыдняў. Адзін раз ударалі гумовай дубінкай па падэшвах, потым праз хвіліну ўдаралі зноў, праз некалькі хвілін яшчэ, потым зноў... Яго білі і ў пахвіну. Потым лекар рабіў яму ўкол, пасля якога яму лепшала, і яго пачыналі добра карміць, каб хутчэй аднавіць сілы – і зноў пачыналі павольнае збіццё, ад якога ён урэшце памёр. Гэтым збіццём кіраваў сябра ЦК партыі, якога звалі Рэк. Разпораз ён казаў збітаму тое, што камуністы часта кажуць вернікам: «Бачыш, я – Бог! Улада над тваім жыццём і смерцю ў маіх руках. Той, што на небе, не захавае табе жыцця. Усё залежыць ад мяне.

Захачу – і ты будзеш жыць, захачу – памрэш. Я Бог!» Так ён здзекаваўся з хрысціян. Брат Грэку перад абліччам смерці даў яму выдатны адказ, пра які я потым чуў ад самога Рэка: «Ты сам не ведаеш, якую глыбокую рэч зараз сказаў. Кожны вусень можа стаць матыльком, калі толькі будзе правільна развівацца. Ты быў створаны на тое, каб стаць не катам і забойцам, а такім жа, як Бог, з Божым жыццём у сэрцы. Шмат падобных да цябе людзей, якія пераследавалі хрысціян, як апостал Павел, у нейкі момант спыніліся і зразумелі, што ганьба чалавеку чыніць зло, што ён можа тварыць нешта нашмат лепшае. І яны сталіся ўдзельнікамі Божае прыроды. Ісус сказаў аднойчы Сваім сучаснікам: «Вы богі». Паверце мне, пане Рэк, вашае прызначэнне – быць падабенствам Божым, а не катам». У той момант Рэк не звярнуў увагі на словы сваёй ахвяры, як той Саўл з Тарсу не звяртаў увагі на прыгожае сведчанне Стэфана, якога забівалі ў ягонай прысутнасці. Але гэтыя словы ўсё ж зрабілі сваю справу ў ягоным сэрцы, і пазней Рэк зразумеў, што гэта і было ягонае пакліканне. Падчас камуністычных катаванняў і здзекаў камуністаў мы засвоілі адзін вялікі ўрок: дух – гаспадар над целам! Мы адчувалі боль, але часта як нешта далёкае і адасобленае ад духу, скупанага ў славе Хрыста і Ягонай прысутнасці сярод нас. Калі нам давалі на тыдзень адзін кавалачак хлебу і талерку бруднай поліўкі штодня, мы вырашылі нават ад іх аддаваць дзесяціну. Кожны дзесяты тыдзень мы ахвяравалі

сваю пайку слабейшаму брату як «дзесяціну» для Госпада. Аднаго верніка прысудзілі да смяротнага пакарання, але перад смерцю дазволілі пабачыцца з жонкаю. Вось апошнія словы, якія ён сказаў ёй: «Ведай, што я паміраю, любячы тых, хто забівае мяне. Яны не ведаюць, што чыняць, і мая апошняя просьба да цябе – любі іх, як я. Не насі горыч у душы за тое, што яны забілі твайго каханага. Мы сустрэнемся ў небе». Гэтыя словы зрабілі вялікае ўражанне на афіцэра тайнай паліцыі, які слухаў іх гутарку. Пазней ён сам расказаў мне гэтую гісторыю ў турме, куды трапіў за веру ў Хрыста. У турме ў Тыргу-Окна быў вельмі малады вязень Маткевіч. Яго пасадзілі ў турму, калі яму было 18 гадоў. Пасля катаванняў ён захварэў на сухоты. Сваякі неяк даналіся пра ягонае цяжкое становішча і перадалі яму сто ампул стрэптаміцыну. Палітрук турмы выклікаў яго, паказаў пакунак з лекамі і сказаў: «Вось лекі, якія могуць цябе выратаваць, але атрымліваць перадачы ад сваякоў табе нельга. Я хацеў бы дапамагчы табе. Ты такі малады, я не хачу, каб ты памёр у турме. Дапамажы мне памагчы табе! Дай звесткі пра тваіх сукамернікаў, і я змагу апраўдацца перад начальствам, што аддам табе гэты пакунак». Хлопец адказаў: «Калі я так зраблю, мне потым усё жыццё будзе сорамна глядзець у люстэрка, бо там будзе твар здрадніка. Я не магу прыняць такую ўмову. Лепш памерці». Афіцэр паціснуў яму руку і сказаў: «Віншую! Іншага адказу я ад цябе і не чакаў. Але хачу зрабіць яшчэ адну прапанову.

Некаторыя вязні зрабіліся нашымі інфарматарамі. Яны кажуць, што сталі камуністамі, і даносяць на цябе. Яны вядуць дваістую гульню, і мы ім не давяраем. Нам хацелася б ведаць, наколькі яны шчырыя. Перад табой яны здраднікі, яны даносяць пра ўсё, што ты кажаш і робіш. Я разумею, што ты не можаш і не хочаш выдаваць сваіх таварышаў, але калі ты будзеш даваць інфармацыю пра тваіх праціўнікаў, гэта ўратуе табе жыццё». Маткевіч і на гэта адказаў, не вагаючыся: «Я вучань Хрыста, а Ён казаў нам любіць і ворагаў. Здраднікі сапраўды робяць нам многа зла, але я не магу адплочваць злом за зло і даносіць на іх. Мне іх шкада. Я малюся за іх. І я не жадаю мець ніякага дачынення да камуністаў». Маткевіч вярнуўся да нас у камеру і неўзабаве памёр. Я быў пры ягоным сконе і бачыў: ён славіў Бога! Любоў перамагла нават прыродную прагу жыцця. Калі бедны чалавек любіць музыку, ён аддасць апошнія грошы за білет на канцэрт. У кішэні ў яго будзе пуста, але ён не стане шкадаваць аб гэтым, бо далучыўся да хараства. Я не шкадую, што правёў шмат гадоў па турмах. Я пабачыў і пачуў там прыгожыя рэчы. Сам я быў у турме слабы і нядужы, але мне пашчасціла быць разам з вялікімі святымі, героямі веры, роўнымі першым хрысціянам. Яны з радасцю паміралі за Хрыста. Іх духоўнае хараство проста не паддаецца апісанню. Усё, што я кажу тут, не было нечым надзвычайным. Звышнатуральныя з'явы сталі зусім натуральнымі сярод хрысціян Падпольнае Царквы, якія вярнуліся

да сваёй першай любові. Перад арыштам я вельмі любіў Ісуса Хрыста, а цяпер, пабачыўшы ў турме Нявесту Хрыстову, Яго духоўнае Цела, я магу сказаць, што люблю гэтую Царкву амаль як Самога Госпада. Я бачыў яе хараство, яе самаахвярны дух.

### Што стала з маімі жонкай і сынам?

Мяне забралі ад жонкі, і я не ведаў, дзе яна і што з ёю. Толькі праз шмат гадоў я даведаўся, што яе таксама пасадзілі ў турму. Жанчыны-верніцы пакутуюць у турме больш, чым мужчыны. Ахоўнікі гвалцяць дзяўчат. Здзекі і непрыстойнасць жахлівыя. У турме, дзе сядзела мая жонка, жанчын прымушалі цяжка працаваць на пабудове каналу. Норма ў іх была такая ж, як у мужчын. Узімку яны капалі мерзлую зямлю. За наглядчыц над жанчынамі-вязнямі ставілі прастытутак. Яны неміласэрна здзекаваліся з верных. Мая жонка ела траву, як быдла, каб не памерці з голаду. Галодныя вязні на канале лавілі і елі пацукоў і змей. У нядзелю наглядчыкі бавіліся тым, што скідалі жанчын у Дунай і потым вылоўлівалі, каб добра пасмяяцца з іх, мокрых, а потым зноў спіхвалі ў ваду. Так рабілі і з маёй жонкай. Мой сын, калі яго бацьку і маці забралі, застаўся бадзяцца па вуліцах. Міхай змалку быў вельмі рэлігійны і глыбока цікавіўся духоўнымі справамі. У дзевяць гадоў, калі нас з ім разлучылі, у ягоным духоўным жыцці наступіў крызіс. Ён зацяўся душою і засумняваўся ў рэлігіі. Перад ім

стаялі праблемы, якіх звычайна ў ягоным веку не бывае. Ён мусіў думаць, як зарабіць на жыццё. Дапамагаць сем'ям хрысціянскіх мучанікаў лічылася злачынствам. Дзвюх жанчын, якія дапамагалі яму, арыштавалі і збілі так моцна, што яны засталіся калекамі на ўсё жыццё. Яшчэ адну жанчыну, якая рызыкнула жыццём і ўзяла Міхая да сябе дадому, асудзілі на 8 гадоў пазбаўлення волі за дапамогу сям'і вязняў. Ёй выбілі ўсе зубы, пераламалі косці, і яна ніколі больш не зможа працаваць. Яна таксама засталася калекаю.

### «Міхай, вер у Ісуса!»

У адзінаццаць гадоў Міхай пачаў сам зарабляць сабе на жыццё. Пакуты пахіснулі ягоную веру. Праз два гады разлукі Міхаю дазволілі сустрэцца з Сабінаю. Ён прыйшоў у турму і пабачыў маці за жалезнымі кратамі. Яна стаяла перад ім брудная, худая, з рукамі ў мазалях, у турэмнай робе. Ён ледзьве пазнаў яе. Але яе першыя словы былі: «Міхай, вер у Ісуса!» Наглядчыкі ў страшнай злобе адцягнулі яе ад Міхая і павялі вон, а хлопчык бачыў гэта і плакаў. Гэта быў момант ягонага навяртання да Госпада. Ён зразумеў, што калі Хрыста можна любіць у такіх умовах, то Ён напэўна сапраўдны Збавіцель. Пазней ён казаў: «Калі б за хрысціянства не было іншых аргументаў, апроч таго, што ў яго верыць мая мама, гэтага для мяне было б досыць». У той дзень ён поўнасцю прыняў Хрыста. У школе

ён вёў няспынную барацьбу за існаванне. Ён добра вучыўся, і за гэта яго ўзнагародзілі чырвоным гальштукам – знакам прыналежнасці да піянераў, дзіцячай камуністычнай арганізацыі. Міхай сказаў: «Я нізавошта не надзену гальштук тых, хто пасадзіў у турму маіх бацьку і маці». За гэта яго выгналі са школы. Страціўшы год, ён зноў пайшоў у школу, гэтым разам утоіўшы, што ён сын зняволеных вернікаў. Пазней яму задалі сачыненне супроць Бібліі, а ён напісаў: «Доказы супроць Бібліі слабыя, і цытаты супроць яе не адпавядаюць праўдзе. Я ўпэўнены, што настаўнік не чытаў Бібліі. Біблія не пярэчыць навуцы». Яго зноў выключылі з школы, і гэтым разам ён страціў два гады. Нарэшце яму дазволілі паступіць у «семінарыю». Там яго вучылі марксістоўскаму багаслоўю. Усё тлумачылася паводле Карла Маркса. Міхай адкрыта выступіў супроць гэтага ў класе; да яго далучыліся іншыя студэнты. У выніку яго выключылі і адсюль, і ён не мог скончыць сваёй духоўнай адукацыі. Аднойчы ў школе, на атэістычным уроку, Міхай устаў і адкрыта нагадаў настаўніку пра адказнасць якую той бярэ на сябе, уводзячы моладзь у зман. Увесь клас стаў на бок Міхая. Важна, каб нехта адважыўся загаварыць першым, тады астатнія яго падтрымаюць. Каб атрымаць адукацыю, ён увесь час утойваў, што ён сын арыштаванага пастара Вурмбранда. Але раз за разам гэта выходзіла на яву, яго выклікалі ў кабінет дырэктара і выключалі са школы. Міхай часта галадаў. Багата сем'яў вязняў-вернікаў у

камуністычных краінах амаль паміраюць з голаду. Дапамога ім лічыцца злачынствам. Я раскажу вам толькі пра адну пакутную сям'ю, якую ведаў асабіста. Брат трапіў у турму за працу ў Падпольнай Царкве. Дома засталіся жонка і шасцёра дзяцей. Старэйшыя дочкі, 17 і 19 гадоў, не маглі знайсці працы, бо ў камуністычнай краіне яе дае толькі дзяржава, а для дзяцей «злачынцаў-хрысціян» яе няма. Прашу вас, не судзіце гэты выпадак паводле маральнасці! Проста прыміце факты, яе ёсць. Дзве дачкі гэтага мучаніка-хрысціяніна, самі таксама хрысціянкі, сталі прастытуткамі, каб пракарміць малодшых братоў і сёстраў і хворую матку. Іх 14-гадовы брат, даведаўшыся пра гэта, звар'яцеў і трапіў у дом вар'ятаў. Калі праз шмат гадоў бацтка вярнуўся дадому, ён узмаліўся, пабачыўшы гэта: «Госпадзе, забяры мяне назад у турму, абы не бачыць таго, што тут робіцца!» Яго малітва была пачута, і яго пасадзілі зноў – за тое, што ён сведчыў пра Хрыста дзецям. Яго дочкі больш не парстытуткі. Яны атрымалі працу, калі згадзіліся на ўмовы тайнай паліцыі – сталі даносчыцамі. Як дачок хрысціяніна-мучаніка іх з пашанай прымаюць у кожным хрысціянскім доме, а яны пра ўсё, што бачаць і чуюць, даносяць тайнай паліцыі. Не кажыце, што гэта брыдка і амаральна. Вядома, гэта так. Але запытайце сябе, ці няма і вашага граху ў тым, што адбываюцца такія трагедыі? У тым, што сем'і вязняў-вернікаў кінуты без падтрымкі на волю лёсу, а вы, вольныя, ім не памагаеце?

*Раздзел 3*

## ЯК МЯНЕ ВЫКУПІЛІ І АДПУСЦІЛІ ПРАЦАВАЦЬ НА ЗАХАД

Прайшло чатырнаццаць гадоў турмы. На працягу іх я не бачыў ні Біблii, ні якое іншае кнігі. Я развучыўся пісаць. Прайшоўшы праз голад, наркотыкі і катаванні, я забыў Святое Пісанне. Але ў дзень, калі я адбыў чатырнаццаць гадоў, невядома адкуль мне ўспомніўся верш са Старога Запавету: «І служыў Якаў за Рахіль 14 гадоў, і яны здаліся яму за некалькі дзён, бо ён кахаў яе» (Быц. 29:20). Неўзабаве пасля гэтага я быў вызвалены паводле ўсеагульнай амністыі, абвешчанай у нашай краіне пад моцным ціскам амерыканскае грамадскае думкі. Я зноў пабачыў жонку. Яна верна чакала мяне ўсе гэтыя доўгія гады. Мы пачалі новае жыццё ў галечы, бо ў арыштаваных канфіскоўвалі ўсю маёмасць. Святарам і пастарам, якія выходзілі на волю, дазвалялася служыць у невялікіх абшчынах і цэрквах. Мне далі царкву ў мястэчку Арсова. Камуністычны Дэпартамент культаў паведаміў мне, што ў гэтай царкве 35 прыхаджанаў, і папярэдзіў, каб іх ніколі не стала 36! Мне сказалі таксама, што я павінен быць іхным агентам, даносіць на кожнага прыхаджаніна і не дапускаць на сходы моладзь. Так камуністы ператвараюць цэрквы ў сродак кантролю! Я ведаў, што калі буду прапаведаваць, паслухаць прыйдзе шмат людзей, і таму нават не спрабаваў служыць ў афіцыйнай царкве. Я вярнуўся да працы

ў Падпольнай Царкве, з усім яе хараством і небяспекай. За гады мае адсутнасці Бог учыніў вялікае. Падпольная Царква больш не была пакінутаю і забытаю. Амерыканцы і іншыя хрысціяне пачалі маліцца за нас і дапамагаць нам. Аднойчы, калі я адпачываў у доме аднаго хрысціяніна ў правінцыі, гаспадар пабудзіў мяне і сказаў: «Прыехалі браты з-за мяжы». Аказалася, на Захадзе ёсць браты, якія не кінулі нас у бядзе. Шараговыя вернікі наладзілі дапамогу сем'ям мучанікаў і кантрабандай завозілі хрысціянскую літаратуру і матэрыяльную помач. У суседнім пакоі сядзела шасцёра братоў, якія прыехалі з гэтаю місіяй. Мы доўга размаўлялі, ажно высветлілася: яны аднекуль даведаліся, што тут жыве чалавек, які правёў 14 гадоў у турме, і хацелі б яго пабачыць. Я прызнаўся, што гэта я. Госці мне не паверылі: яны чакалі ўбачыць чалавека засмучанага, а я быў повен радасці. Я запэўніў іх, што я той самы чалавек, а радуюся таму, што яны прыехалі і я бачу: пра нас не забыліся. Пакрысе ў Падпольную Царкву пачала прыходзіць рэгулярная дапамога. Мы атрымлівалі кантрабандай Бібліі, іншую духоўную літаратуру і дапамогу для сем'яў мучанікаў. З гэтай дапамогай мы ўжо маглі працаваць нашмат лепш. Яны прынеслі нам не толькі Слова Божае, але і сваю любоў. Яны прынеслі нам слова суцехі. У гады прамывання мазгоў мы часта чулі: «Вас больш ніхто не любіць, вас больш ніхто не любіць, вас больш ніхто не любіць...» А цяпер мы ўбачылі заходніх братоў, якія рызыкавалі

жыццём дзеля любові да нас. Пазней мы навучылі іх тэхніцы падпольнае працы, так што яны праслізгвалі незаўважанымі ў дамы, абложаныя тайнай паліцыяй. Хрысціяне з Амерыкі або Англіі, заваленыя Бібліямі, наўрад ці зразумеюць цану Бібліі, завезенае кантрабандаю. Мы з сям'ёй не выжылі б без матэрыяльнае дапамогі замежных вернікаў, як і шмат хто з падпольных пастараў і шараговых вернікаў у камуністычных засценках. Пасланцы з-за мяжы здаваліся нам анёламі Божымі! Калі праца Падпольнай Царквы аднавілася, я апынуўся пад небяспекай новага арышту. Тады дзве хрысціянскія арганізацыі, Нарвежская габрайская місія і Габрайскі хрысціянскі саюз, заплацілі за мяне выкуп у 10 000 даляраў – больш як пяцікротна вышэйшы за звычайную цану палітвязня – і я змог выехаць з Румыніі.

### Чаму я пакінуў камуністычную Румынію

Я не з'ехаў бы за мяжу, нягледзячы на небяспеку, калі б кіраўнікі Падпольнае Царквы не настоялі, каб я скарыстаў гэтую нагоду стаць «голасам» Падпольнай Царквы для вольнага свету. Яны даручылі мне гаварыць ад імя Падпольнае Царквы пра яе пакуты і патрэбы. Я прыехаў на Захад, але маё сэрца засталося з імі. Я ніколі не пакінуў бы Румыніі, калі б не разумеў, як трэба Захаду даведацца пра пакутную і адважную працу Царквы ў падполлі; але якраз у гэтым палягае мая місія.

Перад выездам за мяжу мяне двойчы выклікалі ў тайную паліцыю. Мне сказалі, што выкуп за мяне атрыманы. (Румынія прадае сваіх грамадзян за грошы з прычыны эканамічнага крызісу, у які камунізм загнаў нашую краіну). Мне сказалі: «Едзь на Захад і прапаведуй Хрыста колькі сабе хочаш, але не чапай нас! Не смей казаць супроць нас ані слова! Мы табе адкрыта кажам, што мы зробім з табой, калі ты пачнеш расказваць, што з табой тут было. Па-першае, усяго за тысячу даляраў мы можам знайсці табе кілера; па-другое, мы і самі можам цябе выкрасці». (Са мной у камеры сядзеў праваслаўны біскуп Васіле Леул, якога выкралі ў Аўстрыі і прывезлі ў Румынію. Яму вырвалі ўсе пазногці. Са мной сядзелі і іншыя, выкрадзеныя ў Берліне. Румынаў выкрадалі нават з Італіі і з Парыжу.) Далей мне сказалі так: «Яшчэ мы можам знішчыць цябе маральна, распусціўшы чутку пра якую-небудзь дзеўчыну, крадзеж ці нейкі грэх маладосці. Заходнікаў, асабліва амерыканцаў, ашукаць лёгка». Прыгразіўшы мне такім чынам, яны адпусцілі мяне на Захад, спадзеючыся на прамыванне мазгоў, праз якое я прайшоў турме. (На Захадзе ёсць шмат людзей, якія прайшлі праз тое ж, што і я, але яны маўчаць. Некаторыя з іх нават хваляць камунізм пасля таго, як камуністы іх мучылі. Таму камуністы былі ўпэўненыя, што я таксама буду маўчаць.) Вось жа, у снежні 1965 году нам з сям'ёю дазволілі выехаць з Румыніі. На развітанне я адведаў магілу палкоўніка, па чым

загадзе мяне арыштавалі і шмат гадоў мучылі. Я паклаў на яго магілу кветку. Гэтым я прысягнуў несці радасць Хрыстову спустошаным духоўна камуністам. Я ненавіджу камуністычную сістэму, але люблю камуністаў. Я ненавіджу грэх, але люблю грэшніка. Я люблю камуністаў усім сэрцам. Камуністы могуць забіваць хрысціян, але яны не могуць забіць іх любові нават да сваіх забойцаў. Я не адчуваў ні злосці, ні крыўды на камуністаў і на маіх катаў.

*Раздзел 4*

## ПЕРАМОГА ЛЮБОВІ ХРЫСТОВАЙ НАД КАМУНІЗМАМ

У габраяў ёсць легенда, што калі іх продкі ўцякалі з Егіпту і егіпцяне патанулі ў Чырвоным моры, анёлы прылучыліся да трыумфальнага спеву ізраільцянаў, але Бог сказаў анёлам: «Ізраільцяне людзі, і таму яны радуюцца, што ўратаваліся ад ворагаў, але вы маглі б быць разумнейшыя. Або егіпцяне – не такое ж Маё стварэнне? Або я не люблю і іх таксама? Як жа вы не чуеце майго жалю аб іх трагічным лёсе?» Кніга Ісуса Навіна кажа: «Калі Ісус быў пад Ерыхонам, зірнуў, і бачыць, і вось, стаіць перад ім чалавек, і ў руцэ яго аголены меч. Ісус падыйшоў да яго і запытаў: «Ці наш ты? Ці з непрыяцеляў нашых?» (Іс. Нав. 5:13). Калі б падарожны, якога сустрэў Ісус Навін, быў чалавекам, ён мог бы адказаць: «Я за вас», або «я за вашых ворагаў», або ў крайнім разе «я ні за кога». Толькі так можа чалавек адказаць на гэтае пытанне. Але той, каго спаткаў Ісус Навін, быў пасланы ад Госпада, і таму на пытанне «З Ізраілем ён ці супраць?» ён даў самы нечаканы і незразумелы адказ: «Не». Што азначае гэтае «Не»? Ён прыйшоў адтуль, дзе ніхто не бывае ні за, ні супраць, але дзе ўсё шкадуюць, усяму спагадаюць, усё любяць і разумеюць. На чалавечым узроўні з камунізмам трэба змагацца да апошняга. На гэтым узроўні мы павінны змагацца і з камуністамі, бо яны пра-

водзяць гэтую жорсткую, дзікую ідэалогію. Але хрысціяне – больш, чым проста людзі. Яны – дзеці Божыя, удзельнікі Божае прыроды (2 Пёт. 1: 4). Вось чаму катаванні ў камуністычных засценках не прымусілі мяне ненавідзець камуністаў. Яны таксама Божае стварэнне. Як магу я ненавідзець іх? Але я не магу быць іхным сябрам. Дружба – гэта адна душа ў дваіх грудзях, а ў мяне няма аднае душы з камуністамі. Яны ненавідзяць Бога, а я люблю Яго. Калі б мяне запыталі: «Ты за ці супраць камуністаў?» – мой адказ быў бы досыць складаны. Камунізм – адна з найбольшых пагроз для ўсяго чалавецтва. Я ўсёй душой супраць яго і гатовы змагацца з ім да перамогі. Але ў духу я спачываю ў нябёсах з Ісусам. Гэта сфера «не», у якой камуністаў, нягледзячы на ўсе іх злачынствы, разумеюць і любяць, сфера, у якой анёльскія істоты імкнуцца дапамагчы кожнаму дасягнуць найвышэйшае мэты людскога жыцця – прыпадобніцца Хрысту. Таму я задаўся мэтаю прапаведаваць Евангелле камуністам, каб данесці да іх Добрую Вестку пра Хрыста, майго Госпада, які любіць іх. Ён Сам сказаў, што любіць кожнага і лепш пакіне 99 праведных авец, чым згубіць адну, якая заблукала. Яго апосталы і ўсе вялікія настаўнікі хрысціянства вучылі гэтай любові да ўсяго ў імя Хрыста. Святы Макарый сказаў: «Калі чалавек палка любіць усіх, але кажа, што толькі аднаго не можа любіць, той, хто так кажа, ужо не хрысціянін, бо яго любоў страціла ўсеабдымнасць». Святы Аўгустын вучыць: «Калі

б усё чалавецтва было праведным і толькі адзін чалавек грэшны, Хрыстос пайшоў бы на крыж дзеля гэтага аднаго, бо Ён любіць кожнага паасобку». Навука Хрыста ясная. Камуністы – людзі, а Хрыстос любіць людзей. Так робіць кожны, хто мае ў сабе дух Хрыстоў. Мы любім грэшніка, хоць і ненавідзім грэх. Пра любоў Хрыста да камуністаў мы ведаем праз нашую любоў да іх. Мне даводзілася сустракаць у турме вернікаў з 50-фунтавымі кайданамі на нагах. Іх катавалі распаленым жалезам, сыпалі ў горла сталовымі лыжкамі соль і потым трымалі без вады, іх марылі голадам, білі, марозілі, а яны шчыра маліліся за камуністаў. З чалавечага гледзішча гэта незразумела! Але ў сэрцы іх струменіла любоў Хрыстова. Камуністы, якія нас мучылі, потым няраз самі траплялі ў турму. У забраных краінах з імі гэта бывае амаль гэтаксама часта, як і з іх ворагамі. Кат і катаваны апыналіся ў адной камеры, і калі нехрысціяне помсцілі сваім катам і мучылі іх, вернікі баранілі іх, рызыкуючы, што іх саміх паб'юць або абвінавацяць у супольніцтве з камуністамі. Я бачыў, як вернікі аддавалі апошні кавалак хлеба (нам давалі тады адну лусту на тыдзень) і лекі, якія маглі выратаваць ім жыццё, хвораму катукамуністу, які стаў цяпер іх суседам па камеры. Былы прэм'ер-міністр Румыніі, хрысціянін Юліу Маніу перад смерцю ў турме сказаў: «Калі ў нашай краіне зрынуць камуністаў, найсвяцейшым абавязкам кожнага хрысціяніна будзе выйсці на вуліцу і, рызыкуючы жыццём, бараніць іх ад справядлівага

гневу народу, які яны тыранілі». У першыя дні пасля майго навярнення я думаў, што не змагу больш жыць. Ідучы па вуліцы, я адчуваў фізічны боль за кожнага чалавека, які праходзіў міма. Як востры нож у сэрцы стаяла мне пытанне, ці будзе кожны з іх збавёны. Калі мой прыхаджанін учыняў грэх, я плакаў цэлымі гадзінамі. Прага збавення ўсіх душ дагэтуль жыве ўва мне, і камуністы з яе не выключаюцца. Седзячы ў адзіночцы, мы не маглі маліцца так, як раней. Нам страшна хацелася есці; буйныя дозы наркотыкаў рабілі з нас ідыётаў. Мы былі слабыя і худыя, як шкілеты. «Ойча наш» здаваўся нам залішне доўгім – мы не маглі засяродзіцца, каб прагаварыць яго да канца. Я толькі паўтараў зноў і зноў: «Ісусе, я люблю Цябе!» Раптам аднаго дня я атрымаў ад Ісуса адказ: «Ты любіш Мяне? Цяпер Я пакажу, як Я люблю цябе». І я адразу адчуў агонь у сэрцы, якое палала, як сонца. Вучні на дарозе ў Эмаус казалі, што ў іх сэрца гарэла, калі Ісус падыйшоў да іх і загаварыў. Так было і са мною. Я адчуў любоў Таго, Хто аддаў Сваё жыццё на крыжы за ўсіх нас. Такая любоў не можа выключаць камуністаў, якія б цяжкія ні былі іх грахі. Камуністы рабілі і робяць жахлівыя злачынствы, але «моцная, як смерць, любоў, лютая, як пекла рэўнасць... вялікія воды не могуць пагасіць любові, і рэкі не зальюць яе» (Песня песняў, 8:6). Як магіла забірае ўсіх: багатых і бедных, маладых і старых, людзей усіх расаў, народаў і палітычных перакананняў, святых і крымінальнікаў, – так і любоў абдымае

ўсіх. Хрыстос, уцелаўлёная Любоў, не супакоіцца, пакуль не здабудзе і камуністаў. Аднойчы да мяне ў камеру кінулі страшна збітага прапаведніка. Ён быў ледзь жывы і сплываў крывёю. Мы, як маглі, абмылі яго. Некаторыя вязні пачалі клясці камуністаў. Са стогнам прапаведнік прамовіў: «Не кляніце іх! Маўчыце! Я хачу памаліцца за іх!»

### Як мы радаваліся нават у турме

Азіраючыся на 14 гадоў, што я правёў па турмах, я бачу, што часам гэта была радасная пара. Іншыя вязні і нават турэмшчыкі часта дзівіліся, як хрысціяне могуць радавацца ў такіх жахлівых умовах. Нам не дазвалялі спяваць і білі за спевы, але мы спявалі. Я думаю, салавей, мабыць, таксама спяваў бы, нават ведаючы, што заплоціць за гэта жыццём. Вернікі ў турме часам пускаліся ў скокі ад радасці. Як жа гэта нам удавалася? У турме я няраз прыгадваў словы, якія Ісус сказаў Сваім вучням: «Шчаслівыя вочы, бачачы тое, што вы бачылі» (Лк. 10: 23). Вучні кагадзе вярнуліся з падарожжа па Палясціне, дзе пабачылі шмат страшных рэчаў. Палясціна была тады пад прыгнётам Рыму, і народ жыў у страшнай галечы. Вучні спаткалі хваробы, пошасць, голад, гора. Яны бывалі ў дамах, з якіх забралі патрыётаў і пасадзілі ў турму, пакінуўшы бацькоў ці жонак у слязах. На гэта свет было нявесела глядзець, і ўсё ж Ісус сказаў: «Шчаслівыя вочы, бачачы тое, што вы бачылі». Ён сказаў гэта

таму, што яны бачылі не толькі пакуты. Яны бачылі Збавіцеля. Упершыню брыдкія чарвякі, вусені, якія поўзаюць па лісці, зразумелі, што пасля гэтага нікчэмнага існавання настане іншае, прыгожае – жыццё каляровага матылька, які лётае з кветкі на кветку! І гэта было нашай радасцю. Вакол мяне былі «Іовы», якія ў некаторых дачыненнях зазналі больш пакут, чым біблійны Іоў. Але я памятаў, чым скончылася гісторыя Іова – як ён атрымаў удвая больш за страчанае. Я бачыў людзей, падобных да беднага Лазара, яны былі галодныя, усе ў скулах, але я ведаў што анёлы аднясуць іх на ўлонне Аўраама, і я бачыў, якімі яны стануць у будучыні. У абадраным, брудным, слабым пакутніку побач са мной я бачыў слаўны вянец будучага святога. Гледзячы на такіх людзей – бачачы іх не такімі, як ёсць, а якімі будуць – я ў маіх мучыцелях бачыў «Саўлаў з Тарсу», будучых апосталаў Паўлаў. Некаторыя ўжо прайшлі гэты шлях. Нямала афіцэраў тайнае паліцыі, якім мы сведчылі пра Хрыста, самі сталі хрысціянамі і з радасцю цярпелі потым у турме за тое, што знайшлі нашага Збавіцеля. У наглядчыках, якія збівалі нас, мы бачылі стоража вязніцы ў Філіпах, які стаў хрысціянінам (Дз. 16). Мы марылі, што хутка хто-небудзь з іх спытаецца: «Што трэ рабіць, каб спасціся?» (Дз. 16:30). У тых, хто кпіў з хрысціян, прывязаных да крыжоў і абмазаных калам, мы бачылі натоўп каля Галгофскага крыжа, які вось-вось пачне біць сябе ў грудзі ў страху перад учыненым грэхам. У турме ў нас

з'явілася надзея на збавенне камуністаў. Мы адчулі адказнасць за іх. Пакуль яны нас мучылі, мы вучыліся іх любіць. Большую частку маёй сям'і забілі, але іх забойца навярнуўся да Госпада ў маім доме. Гэта было самае адпаведнае месца. Так у турме нарадзілася ідэя аб хрысціянскай місіі для камуністаў. Бог бачыць усё не так, як мы, гэтаксама як мы бачым усё інакш, чым мурашка. З людскога пункту гледжання, калі чалавека прывязваюць да крыжа і мажуць калам – гэта жахліва, але тым не менш Біблія кажа нам пра «нядоўгую муку». Чатырнаццаць гадоў у турме для нас доўга, а Біблія кажа, што «цяперашняя лёгкасць гора нашага цераразмерна вытварае вагу славы вечнае для нас» (2 Кар. 4:17). Таму мы маем права меркаваць, што недаравальныя для нас, людзей, злачынствы камуністаў у Божых вачах лягчэйшыя, чым у нашых. Іх тыранія, якая доўжыцца ўжо амаль поўстагоддзя, перад Ім, для Якога тысяча гадоў, як адзін дзень, можа, толькі момант аблуды. Яны ўсё яшчэ могуць атрымаць збавенне. Брамы неба не зачыненыя для камуністаў, і святло для іх не пагашана. Яны могуць пакаяцца, як і ўсе астатнія, і мы павінны заклікаць іх да пакаяння. Толькі любоў можа перамяніць камуніста і тэрарыста, але гэтую любоў трэба ясна адрозніваць ад кампрамісу з нехрысціянскімі філасофіямі, на які згадзіўся не адзін з кіраўнікоў цэркваў. Яшчэ седзячы ў турме, мы з вялікай любоўю рыхталіся да працы сярод камуністаў. На першы план мы паставілі камуністычных уладароў.

Некаторыя кіраўнікі місіяў, здаецца, няўважліва вывучалі царкоўную гісторыю. Як здабылі для Хрыста Нарвегію? Здабыўшы перш караля Олафа. Русь даведалася пра Евангелле, калі яго прыняў князь Уладзімір. Венгрыя прыняла хрысціянства следам за сваім каралём святым Стэфанам. Тое сама адбылося з Польшчай. Калі ў Афрыцы правадыр племені прымаў Хрыста, за ягоным прыкладам ішло і ўсё племя. Мы адкрываем місіі для шараговых людзей, з якіх могуць выйсці вельмі добрыя хрысціяне, але іх уплыў вельмі слабы і наўрад ці здатны перамяніць агульнае становішча. Нам трэба здабыць для Хрыста правадыроў. Нам патрэбныя лідэры ў палітыцы, эканоміцы, навуцы і мастацтве. Яны кшталтуюць людскія душы. Здабыўшы іх, мы здабудзем і тых, каму яны служаць прыкладам. З місіянерскага пункту гледжання камунізм мае адну перавагу перад іншымі сацыяльнымі сістэмамі: ён больш цэнтралізаваны. Калі прэзідэнт ЗША стане мармонам, уся Амерыка не абернецца ад гэтага ў мармонскую веру, але калі б хрысціянамі сталі кіраўнікі камуністычных уладаў, тады мы здабылі б для Хрыста цэлыя іх краіны. Вось які вялікі ўплыў маюць правадыры! Але ці можа камуністычны правадыр навярнуцца да Хрыста? Вядома, можа! Ужо таму, што ён не мае шчасця і жыве ў такой жа небяспецы, як і ягоныя ахвяры. Амаль усе правадыры ў Расеі загінулі ў турме альбо ад рук сваіх жа таварышаў. Гэтаксама ў Кітаі. Нават міністры ўнутраных справаў – Ягода, Яжоў і Бэрыя, – якія,

здавалася, мелі ў сваіх руках поўную ўладу, загінулі, як контррэвалюцыянеры, з куляй у патыліцы. І Шэлепіна, міністра ўнутраных спраў СССР, і Ранковіча, міністра ўнутраных спраў Югаславіі, выкінулі, як брудныя анучы.

### Як весці духоўны наступ на камунізм?

Камунізм нікому не прыносіць радасці, нават тым, хто мае з яго выгаду. Яны дрыжаць ад думкі, што ў кожную ноч можа пад'ехаць машына тайнай паліцыі і забраць іх, бо перамянілася партыйная лінія. Шмат каго з правадыроў партыі я ведаў асабіста. Гэта людзі з вялікім цяжарам на душы. Толькі Ісус можа прынесці ім палёгку. Прывесці камуністычных лідэраў да Хрыста значыць ўратаваць свет ад атамнай вайны і ад голаду. Столькі прыбыткаў па ўсім свеце ідзе на ўзбраенне! Здабыць правадыроў камунізму значыць пакласці канец міжнароднай напружанасці і прынесці вялікую радасць Хрысту і анёлам. Гэта азначае перамогу Царквы. Іншыя краіны, такія, як Новая Гвінея і Мадагаскар, дзе сёння місіянеры працуюць з такой цяжкасцю, самі пойдуць за Хрыстом, калі Яго прымуць камуністычныя правадыры, бо гэта дасць хрысціянству новы імпульс. Я асабіста ведаў камуністаў, якія навярнуліся да Хрыста. Я сам быў у маладосці ваяўнічым бязбожнікам і ведаю, што былыя атэісты, навярнуўшыся да Хрыста, моцна любяць Яго, бо моцна грашылі. Місіянерства патрабуе стратэгіч-

нае думкі. З пункту гледжання збавення ўсе душы роўныя, але з пункту гледжання місіянерскае стратэгіі – не. Важней здабыць чалавека ўплывовага, які потым зможа здабыць тысячы, чым гаварыць з дзікуном у джунглях, забяспечваючы збавенне яму аднаму. Вось чаму Ісус абраў месцам сканчэння Свайго зямнога служэння не глухую вёску, а Ерусалім – духоўны цэнтр свету! З гэтай сама прычыны імкнуўся ў Рым апостал Павел. Біблія кажа, што семя жанчыны скрышыць змею галаў (пар. Быт. 3:15), а мы казычам змею жывот, ад чаго яму адзін смех. Гэты змей дагэтуль віецца паміж Кітаем, Паўночнай Карэяй, В'етнамам і Лаосам. На Сярэднім Усходзе ёсць краіны, дзе хрысціянам нельга паставіць царкву. Як царкоўныя лідэры і кіраўнікі місіяў, так і шараговыя вернікі мусяць штодня дбаць аб гэтых няшчасных краінах. Мы павінны адмовіцца ад руціны ў нашым служэнні. «Пракляты той, хто справу Божую робіць нядбала» (Іер. 48:10). Царква павінна весці шырокамаштабны духоўны наступ на ўлады ў паняволеных краінах. Войны выйграюцца толькі праз наступальную, а не абарончую стратэгію. Псальма кажа, што Бог «скрышыў зялезныя засаўкі» (Пс. 106:16). Дык Жалезная Заслона – драбніца для Яго. Ранняя Царква працавала таемна і незаконна, але перамагла. Мы павінны зноў навучыцца так працаваць! Да камуністаў я не разумеў, чаму столькі персанажаў Новага Запавету насілі мянушкі: Сымон, называны Нігер, Іоан, называны Маркам, і інш.

Але ў нашыя дні мы ў паняволеных краінах таксама карыстаемся мянушкамі. Раней я не разумеў, чаму Ісус, рыхтуючы пакой для Тайнае Вячэры, сказаў: «Ідзіце да места, і сустрэнецца вам чалавек, нясучы гляк з вадою; ідзеце за ім» (Мк. 14:13). Цяпер разумею. У працы Падпольнае Царквы мы таксама ўжываем такія тайныя знакі. Вяртанне да гэткіх раннехрысціянскіх метадаў павялічыць плён нашае працы дзеля Хрыста. Але сустрэўшыся з заходнімі кіраўнікамі Цэркваў, я пабачыў, што замест любові да камуністаў, якая даўно магла б прывесці да арганізацыі місіянерскай працы ў камуністычных краінах, яны папросту стаяць на іхным баку. Я не знайшоў спагады добрага самараніна да заблукалых душаў з дому Карла Маркса. Чалавек верыць не ў тое, што ён паўтарае ў сваім сімвале веры, а ў тое, за што ён гатовы памерці. Вернікі Падпольнай Царквы засведчылі, што яны гатовыя памерці за сваю веру. Наша міжнародная сетка місіяў працягвае сёння тайную працу ў паняволеных краінах, якая азначае для яе ўдзельнікаў пагрозу турмы, катаванняў і смерці. Я маю права запытаць: «Ці гатовы пастары Амерыкі, якія прыязняцца з камуністамі, памерці за свае перакананні?» Што перашкаджае ім кінуць свае высокія пасады на Захадзе, каб стаць афіцыйнымі пастарамі на Ўсходзе, супрацоўнічаючы з камуністамі там, на месцы? Ніводзін заходні царкоўны дастойнік яшчэ не даў такога доказу сваёй веры. Людскія словы паўстаюць з патрэбы людзей разумець адзін аднога

і выказваць свае пачуцці да бліжняга. У чалавечай мове няма такіх словаў, якія маглі б належным чынам перадаць тайніцы Божыя і вышыні духоўнага жыцця. Гэтаксама няма ў нас і словаў, каб апісаць глыбіні д'ябальскае лютасці. Ці магчыма перадаць словамі, што адчувае чалавек, якога нацысты вось-вось шпурнуць у печ, або які бачыць, як туды ўкінулі ягонае дзіця? Таму няма сэнсу апісваць усё тое, што пераносілі і пераносяць хрысціяне пры камуністах. Са мной у камеры сядзеў Лукрэцыу Патраскану, чалавек, які прывёў камуністаў у Румыніі да ўлады. Яго таварышы аддзячылі яму за гэта турмою. Хоць ён быў у сваім розуме, яго змясцілі ў лякарню для вар'ятаў і трымалі там, пакуль і ён не звар'яцеў. Тое сама яны зрабілі з Аннай Паўкер, колішнім дзяржаўным сакратаром. Так робяць і з вернікамі. Свет жахнуўся ад таго, што адбывалася на вуліцах Кітаю. Хунвэйбіны чынілі тэрор на вачах ува ўсіх. А цяпер паспрабуйце ўявіць, што бывае з хрысціянінам у кітайскай турме, дзе ніхто не бачыць... Я чуў, што аклі вядомы хрысціянскі пісьменнік і іншыя вернікі адмовіліся вырачыся свае веры, турэмшчыкі адрэзалі ім вушы і языкі. Дагэтуль багата хрысціян сядзіць у кітайскіх засценках. Але катаванні і забойства людскога цела – яшчэ не самая страшная справа камуністаў. Яны адчайна фальсіфікуюць людскую думку і труцяць розум моладзі і дзяцей. Яны абсадзілі кіраўнічыя пасады ў Цэрквах сваімі людзьмі, каб зводзіць хрысціян і руйнаваць цэрквы. Яны вучаць моладзь не веры ў Бога і Хрыста, а

нянавісці да самых гэтых імёнаў. Якімі словамі перадаць трагедыю хрысціянскага мучаніка, які вяртаецца дадому пасля гадоў турмы, а дзеці, з якіх тым часам выгадавалі ваяўнічых атэістаў, сустракаюць яго кпінамі? Гэтая кніга пісалася не чарнілам, а крывёю сэрца. Падобна таму, як ад Данііла і яго сяброў, калі яны выйшлі з печы, не было чуваць нават паху агню, ад верных мучанікаў, якія пабывалі ў камуністычных турмах, не чуваць злосці на іхніх катаў. Кветка, якую вы раздушыце нагою, аддае вам свой водар. Гэтаксама вернікі, якіх мучылі камуністы, адплочваюць ім любоўю. Мы прывялі да Хрыста шмат каго з нашых турэмшчыкаў. Намі рухала адно жаданне: даць камуністам, якія неслі нам пакуты, найлепшае, што ў нас ёсць: збавенне праз нашага Госпада Ісуса Хрыста. Мне не было дадзена памерці ў турме пакутніцкай смерцю, як многім маім братам па веры. Мяне выпусцілі, і я нават змог выехаць з Румыніі на Захад. Тут я знайшоў шмат у каго з царкоўных лідэраў зусім процілеглыя настроі. Аказалася, што шмат хто з заходніх хрысціян не любіць людзей, якія жывуць у забраных краінах! Пра гэта сведчыць тое, што яны нічога не робяць дзеля іх збавення. У іх ёсць місіі, якія пераконваюць хрысціян пераходзіць з аднае дэнамінацыі ў другую, але місіяў у забраныя краіны яны не адпраўляюць, бо гэта, маўляў, «незаконна»! Яны іх не любяць, інакш яны даўно стварылі б такую, немагчымую на погляд, місію, як Уільям Кэры, які любіў індзейцаў, і Гудзан

Тэйлар, які любіў кітайцаў. Але мала таго, што яны не любяць людзей у забраных краінах і нічога не робяць дзеля іх збавення ў Хрысце: сваёй самазадаволенасцю, абыякавасцю, а часам і проста саўдзельніцтвам некаторыя заходнія царкоўныя лідэры нават спрыяюць умацаванню камуністаў у іхнай няверы. Яны пускаюць камуністаў у заходнія Цэрквы і нават дапускаюць іх да царкоўнае ўлады. Небяспеку камунізму яны хаваюць ад вернікаў. Не любячы камуністаў і іншых жыхароў забраных краін і не робячы нічога дзеля іх збавення ў Хрысце (адгаворваючыся, што гэта забаронена – як быццам першыя хрысціяне пыталіся ў Нэрона дазволу на распаўсюджванне Евангелля) – гэтыя лідэры не любяць і сваю ўласную паству, бо не даюць ёй узяць удзел у гэтай сусветнай духоўнай бітве.

### Як ігнаруюцца ўрокі гісторыі

У першыя вякі ў Паўночнай Афрыцы быў росквіт хрысціянства. Адтуль выйшлі св. Аўгустын, св. Кіпрыян, св. Афанасій, Тэртуліян. Хрысціяне Паўночнае Афрыкі не споўнілі аднаго-адзінага абавязку: не прывялі мусульманаў да Хрыста. У выніку мусульмане захапілі Паўночную Афрыку і на некалькі стагоддзяў выкаранілі там хрысціянства. Яшчэ і дагэтуль Паўночная Афрыка належыць мусульманам, і хрысціянскія місіянеры ўважаюць тамтэйшыя краіны непадатнымі на пропаведзь. Павучымся ж з гісторыі! У часы рэфармацыі рэ-

лігійныя задачы Гуса, Лютара і Кальвіна супадалі з задачамі еўрапейскіх народаў: усе яны прагнулі вызваліцца з-пад прыгнёту папства, якое было тады тыранічнаю сілай у палітыцы і эканоміцы. Гэтаксама і сёння задача Падпольнае Царквы – пашырэнне евангелля ў краінах з тыранічнымі рэжымамі – супадае з інтарэсамі ўсіх вольных народаў, якія прагнуць жыць у свабодзе надалей. Ні палітычнымі, ні ваеннымі сродкамі камунізм зрынуць немагчыма. Шмат хто з тыранаў мае атамную зброю; спроба заваяваць іх азначала б новую сусветную вайну з сотнямі мільёнаў ахвяраў. Шмат хто з заходніх лідэраў прайшоў прамыванне мазгоў і не бачыць патрэбы ў змаганні з камунізмам. Яны гэта няраз паўтаралі. Яны былі б рады, каб са свету зняліся наркаманія, гангстэрызм, рак і сухоты, – але не камунізм, на чыім рахунку куды больш ахвяраў, чым ува ўсіх гэтых няшчасцяў разам узятых. Савецкі пісьменнік Ілья Эрэнбург сказаў, што калі б Сталін стаў запісваць пайменна ўсіх сваіх нявінных ахвяраў, яму не хапіла б жыцця. На XX з'ездзе партыі Хрушчоў сказаў: «Сталін знішчыў тысячы нявінных, сумленных камуністаў. З 139-ці членаў і кандыдатаў у члены ЦК ВКП(б), абраных на 17-ты з'езд, 98, альбо 70 працэнтаў, былі пазней арыштаваныя і расстраляныя». Цяпер уявіце сабе, што гэты чалавек рабіў з вернікамі? Хрушчоў, які ўсенародна адцураўся ад Сталіна, прадоўжыў ягонае змаганне з рэлігіяй. Пасля 1959 г. была зачынена палова цэркваў, якія дзейнічалі тады ў Расеі. (Пасля ўпадку

камунізму ў СССР урад прызнаў факт масавых арыштаў хрысціян.) У Кітаі ўзнялася новая хваля варварства, яшчэ горшага, чым у Расеі ў часы сталінізму. Адкрытае царкоўнае жыццё спынілася цалкам. У Расеі і ў Румыніі пачаліся новыя арышты. Праз тэрор і хлусню ў гэтых краінах з мільярдным насельніцтвам цэлыя пакаленні моладзі гадуюцца ў нянавісці да ўсяго заходняга, і асабліва – да хрысціянства. У Расеі нярэдка можна бачыць, як мясцовы чыноўнік стаіць каля царквы і сочыць за дзецьмі. Тых, хто кіруецца ў царкву, лупцуюць і выкідаюць вон. Так старанна і сістэматычна выхоўваюць будучых разбуральнікаў заходняга хрысціянства! Ёсць толькі адна сіла, здатная процістаяць гэтаму. Яна збудавала хрысціянскія дзяржавы на месцы паганскае Рымскае імперыі, яна вырабіла дзікіх тэўтонаў і вікінгаў на хрысціянаў і зрынула крывавую ўладу інквізіцыі. Гэта сіла Евангелля, прадстаўленая Падпольнаю Царквою ўва ўсіх забраных краінах! Падтрымка гэтае Царквы і матэрыяльная дапамога ёй – не толькі справа еднасці з пакутнымі братамі. Гэта справа жыцця і смерці вашых родных краін і цэркваў. Падтрымка Падпольнае Царквы ляжыць у інтарэсе не толькі вольнага хрысціянства; яна павінна стаць на парадку дня кожнага вольнага ўраду. Падпольная Царква ўжо здабыла для Хрыста некаторых камуністычных уладароў. Былы прэм'ер-міністр Румыніі Георгіу Дэж памёр хрысціянінам, пакаяўшыся ў грахах і змяніўшы сваё грэшнае жыццё. У шмат якіх камуністычных краінах ува

ўрадах ёсць тайныя хрысціяне. Калі іх стане болей, льга будзе спадзявацца на сапраўдныя змены ў палітыцы гэтых урадаў – не на такія, як пры Ціта альбо Гамулцы, а на вяртанне да хрысціянства і свабоды. Для гэтага сёння існуюць выключныя магчымасці! Камуністы, якія часта бываюць такімі ж шчырымі ў сваіх перакананнях, як і хрысціяне – у сваіх, перажываюць цяпер сур'ёзны крызіс. Яны шчыра верылі, што камунізм нясе дружбу народаў, а цяпер яны бачаць, што ўсходні блок разваліўся. Яны шчыра верылі, што камунізм створыць рай на зямлі, замест нябеснага, які яны лічаць ілюзіяй. А цяпер іх народы галадаюць і завозяць збожжа з капіталістычных краін. Камуністы верылі ў сваіх правадыроў, а цяпер чытаюць у газетах, што Сталін быў масавым забойцам, а Хрушчоў – ідыётам. Тое сама адбылося з іх народнымі героямі – Ракашы, Гера, Аннай Паўкер, Ранкавічам і інш. Камуністы больш не вераць у беспамылковасць сваіх правадыроў. Яны цяпер як тыя каталікі без Папы. У іх сэрцах з'явілася пустка, якую можа запоўніць толькі Хрыстос. Чалавечае сэрца па сваёй прыродзе шукае Бога. Гэта тычыцца і камуністаў. Любоў, якую нясе Евангелле, вабіць і іх. Я бачыў, як камуністы прыходзяць да Хрыста. Я ведаю, што гэта магчыма. Хрысціяне, якіх камуністы катавалі і высмейвалі, даравалі і забылі ўсё, што тыя зрабілі ім і іх сем'ям. Яны робяць усё, што ў іх сілах, каб дапамагчы камуністам выйсці з гэтага крызісу і знайсці Хрыста. У гэтым ім трэба нашая дапамога. І не толькі ў

гэтым. Хрысціянская любоў заўжды ўсеабдымная, у хрысціян не бывае староннасці. Ісус казаў, што сонца Божае ўзыходзіць над добрымі і благімі. Таксама і хрысціянская любоў. Царкоўныя кіраўнікі на Захадзе, якія прыязняцца з камуністычнымі і іншымі тыранічнымі рэжымамі, апраўдваюць гэта Хрыстовым вучэннем пра любоў да ворагаў. Але Хрыстос ніколі не казаў, што мы павінны любіць толькі нашых ворагаў, а братоў забываць. Яны выказваюць сваю любоў, запрашаючы тых, чые рукі аблітыя крывёю замучаных братоў, на банкеты, а не абвяшчаючы ім Дабравесце Хрыстова. А пра тых, каго тыраны прыгнятаюць, забылі. Іх не любяць. Дзесяткі гадоў назад Евангельская і Каталіцкая цэрквы Заходняй Нямеччыны сабралі для галодных 125 мільёнаў даляраў. Амерыканскія хрысціяне далі яшчэ больш. Галодных шмат, але я не магу ўявіць, хто галаднейшы і больш варты дапамогі вольных хрысціян, як не хрысціянскія мучанікі. Калі нямецкія, англійскія, скандынаўскія цэрквы збіраюць столькі грошай на дабрачыннасць, яна павінна ісці ўсім, хто ў патрэбе, але найперш хрысціянскім мучанікам і іх сем'ям. Першыя хрысціяне задаваліся пытаннем: ці толькі для юдэяў створана Царква, або і для паганцаў? Адказ, як вядома, быў атрыманы. У іншай форме тая ж праблема паўстала зноў у XX стагоддзі. Хрысціянства створана не толькі для Захаду. Хрыстос належыць не толькі Амерыцы, Англіі і іншым дэмакратычным краінам. Калі Ён вісеў на крыжы, адна яго рука паказвала

на Захад, а другая на Ўсход. Ён хоча быць Царом не толькі юдэяў, а і паганцаў, не толькі заходняга свету, але і камуністычнага. Ісус сказаў: «Ідзеце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню» (Мк. 16:15). Ён праліў кроў за ўсіх, і ўсе павінны пачуць пра гэта. Да пропаведзі Евангелля ў паняволеных краінах нас заахвочвае і тое, што новыя хрысціяне там поўныя любові і палкасці. Я ні разу не сустракаў «цеплаватага» расейскага хрысціяніна. Былыя камсамольцы і мусульмане робяцца выдатнымі вучнямі Хрыста. Хрыстос любіць іх і жадае іх вызваліць, як Ён любіць усіх грэшнікаў і жадае вызваліць іх ад грэху. Але некаторыя заходнія царкоўныя лідэры замест гэтага адзіна слушнага стаўлення прынялі іншае: абыякавасць да тых, хто гоніць хрысціян. Яны патураюць грэшнікам, дапамагаючы ганіцелям захаваць уладу і хаваючы збавенне і ад ворагаў, і ад іхных ахвяраў.

### Што ж я знайшоў пасля вызвалення?

Калі я пасля вызвалення вярнуўся да жонкі і яна запытала мяне пра планы на будучыню, я адказаў: «Мне хацелася б духоўнага жыцця на самоце». Жонка адказала, што сама марыць пра тое самае. У маладым веку я быў вельмі жвавы, але гады турмы і асабліва адзіночнае зняволенне пераўтварылі мяне ў задуменнага сузіральніка. Усе буры сэрца аціхлі. Я не думаў пра камунізм, нават не заўважаў яго больш. Я быў у абдымках Нябеснага

Жаніха, маліўся за сваіх мучыцеляў і любіў іх усім сэрцам. У мяне амаль не было надзеі на вызваленне, але калі прыходзіла такая думка, я заўжды марыў пра тое, каб адысці на спачын і весці пустэльнае жыццё ў шчасным сумоўі з Нябесным Жаніхом. Бог ёсць Праўда (Іер. 10:10), Біблія – гэта «праўда аб Праўдзе», а багаслоўе – «праўда аб праўдзе аб Праўдзе». Хрысціяне жывуць сярод гэтых шматлікіх праўдаў аб Праўдзе і таму часта не маюць самое Праўды. Галодныя, збітыя, накачаныя наркотыкамі, мы забылі багаслоўе і біблійныя тэксты. Мы забылі ўсе «праўды аб праўдзе» і жылі толькі Праўдаю. Напісана, што «Сын Чалавечы прыйдзе ў гадзіну, у якую не думаеце» (Мц. 24: 44). Мы развучыліся думаць. У найцямнейшыя гадзіны пакут і катаванняў Сын Чалавечы прыйшоў да нас, і турэмныя муры заззялі як дыяменты, і ў камерах раз'яснела. Недзе далёка пад намі, у цялеснай сферы, былі нашыя пакуты, а дух радаваўся ў Госпадзе. Гэтую радасць мы не прамянялі б на царскія палацы. Ніякае змаганне нават не прыходзіла нам да галавы! Мне не хацелася весці нават найсправядлівейшую бітву! Я выйшаў з турмы, спадзеючыся правесці рэшту жыцця ў цішы і сузіранні. Але пачынаючы з першага ж дня на волі я ўбачыў такія пачварныя праявы камунізму, якіх не сустракаў нават у турме. Раз за разам я сустракаўся з вядомымі пастарамі, казаннікамі і нават біскупамі розных цэркваў, якія самі з жалем прызнаваліся, што сталі даносчыкамі на ўласную

паству. Я пытаўся ў іх: ці гатовы яны адмовіцца даносіць, рызыкуючы ўласнай свабодай? І ўсе адказалі «не», патлумачыўшы, што баяцца не за сябе: становішча перамянілася, і калі святар адмаўляецца даносіць, то царкву зачыняюць. У кожным мястэчку ёсць «упаўнаважаны па справах культаў» – супрацоўнік тайнай паліцыі. Ён мае права ў любы час выклікаць да сябе святара або пастара і распытвацца аб прыхаджанах: хто ходзіць у царкву, хто часта прычашчаецца, хто вельмі шчыра верыць, хто навяртае іншых да Госпада, хто што казаў на споведзі і г. д. Калі пастар не адказвае, яго здымаюць і ставяць больш гаваркога. А калі няма нікога на замену (чаго амаль ніколі не здараецца), упаўнаважаны проста зачыняе царкву. Сёння так робіцца ў Кітаі. Амаль усе казаннікі даносяць тайнай паліцыі. Адны робяць гэта неахвотна, прытойваючы некаторыя звесткі, іншыя ўцягнуліся і страцілі сумленне, а сёй-той кажа нават больш, чым у іх пытаюцца. Мне даводзілася чуць прызнанні дзяцей пакутнікаў, якія мусілі даносіць на свае прыёмныя сем'і. Ім гразілі, што інакш не дадуць далей вучыцца. Я быў на баптысцкім кангрэсе, які праходзіў пад савецкім сцягам і на якім камуністы вырашалі, хто зойме кіраўнічыя пасады. Я ведаў, што на чале ўсіх афіцыйных цэркваў стаяць людзі, прызначаныя кампартыяй. Я зразумеў, што бачу «агіду спусташэння» (Мц. 14:15), пра якую казаў Ісус. Ува ўсе часы бывалі добрыя і кепскія пастары і казаннікі. Але цяпер, упершыню

ў гісторыі Царквы, Цэнтральны Камітэт непрыхавана бязбожнае партыі, якая паставіла на мэце выкараніць рэлігію, вырашае, хто будзе кіраваць царквою. Навошта? Каб прыспешыць яе выкараненне! Ленін пісаў: «Усякая рэлігійная ідэя, усякая ідэя аб усякім божаньку, усякае какетнічанне нават з божанькам ёсць (...) самая небяспечная мярзотнасць, самая гнусная «зараза». Мільён грахоў, пакасцей, гвалтаў і зараз фізічных (...) значна менш небяспечныя, чым тонкая, духоўная (...) ідэя божанькі». Камуністычныя партыі ўсіх савецкіх краін – паслядоўніцы і вучаніцы Леніна. У іх разуменні рэлігія горшая за рак, сухоты і сіфіліс. І яны вырашаюць, каму кіраваць Цэрквамі! І з імі супрацоўнічаюць кіраўнікі Цэркваў, ідучы на большы ці меншы кампраміс з сумленнем. Я пабачыў, як дзяцей і моладзь труцяць атэізмам, а афіцыйныя Цэрквы не маюць моцы запярэчыць гэтаму. У ніводнай царкве нашае сталіцы, Бухарэсту, я не знайшоў ані нядзельнае школкі для дзяцей, ані сходаў моладзі. Дзяцей хрысціян выхоўвалі ў школах нянавісці. Гледзячы на ўсё гэта, я зненавідзеў камунізм больш, чым пад катаваннямі. Я зненавідзеў яго не за тое, што ён зрабіў са мной асабіста, а за тое зло, якое ён чыніць славе Божай, імені Хрыстоваму і сотням мільёнаў душ, якія жывуць пад ягонай уладай. З усіх канцоў краіны да мяне прыходзілі сяляне і распавядалі, як праводзіцца калектывізацыя. Яны сталі галоднымі рабамі на уласных палетках і вінаградніках. У іх не было

хлеба, у дзяцей – малака і садавіны, і ўсё гэта ў краіне, якая плыве малаком і мёдам, як колішні Ханаан. Браты прызнаваліся мне, што ленінскі камуністычны рэжым зрабіў з іх хлусаў і злодзеяў. З голаду яны мусілі красці з уласных палеткаў, якія належалі цяпер не ім, а калектыву. А потым трэба было хлусіць, каб схаваць злачынства. Рабочыя расказвалі пра тэрор на заводах і фабрыках і пра такую эксплуатацыю, якая і не снілася капіталістам. Рабочых пазбавілі права баставаць. Інтэлігенцыю прымусілі вучыць насуперак сумленню, што Бога няма. Усё жыццё на трэцяй частцы свету было разбурана альбо сфальшавана. Дзяўчаты скардзіліся мне, што іх зацягваюць у камсамол, а потым ушчуваюць, што яны сустракаюцца з хлопцамі-вернікамі, і прапаноўваюць лепшых хлопцаў, з якімі сустракацца можна. Усё было да адчаю фальшыва і брыдка! Тады я сустрэўся са змагарамі з Падпольнае Царквы, маімі даўнімі таварышамі. Некаторым удалося застацца на волі; іншыя зноў сталі на змаганне пасля турмы. Яны заклікалі мяне далучыцца да змагання. Я пабываў на іх тайных сходах, дзе яны спявалі з рукапісных спеўнікаў. Мне прыгадаўся св. Антоні Вялікі, які правёў 30 гадоў у пустэльні. Ён цалкам адрокся ад свету і ўсё жыццё правёў у пасце і малітве. Але пачуўшы пра спрэчку паміж Афанасіем і Арыем пра боскасць Хрыста, ён кінуў сузіральнае жыццё і прыехаў у Александрыю, каб змагацца за праўду. Я вырашыў зрабіць так, як належыць кожнаму хрысціяніну:

пайсці за прыкладам Хрыста, апостала Паўла і вялікіх святых і, кінуўшы думку пра спачын, стаць на змаганне з цемрай. Што ж гэта было за змаганне? У турме вернікі заўсёды маліліся за сваіх ворагаў і прыгожа сведчылі перад імі. Мы ўсім сэрцам зычылі ім збавення, і калі нехта з іх прымаў Хрыста, нашай радасці не было канца. Але я ненавідзеў зло камуністычнае сістэмы і таму жадаў умацаваць Падпольную Царкву, адзіную сілу, здатную сілай Евангелля зрынуць гэтую страшную тыранію. Я думаў не толькі пра Румынію, але пра ўвесь свет. На Захадзе, аднак, я сустрэў жахлівую абыякавасць да гэтае справы. Пісьменнікі ўсяго свету абураліся арыштам савецкіх пісьменнікаў Сіняўскага і Даніэля, але ніводная царква не выказала пратэсту супроць масавых арыштаў вернікаў. Каму якая справа была да брата Кужыка, які трапіў у турму за тое, што распаўсюджваў «атрутныя» хрысціянскія выданні – часткі Святога Пісання і пабожныя брашуры Тарэ? Хто чуў пра брата Пракоф'ева, які раздаваў друкаваныя казані? Каму вядомы габрай-хрысціянін Грунвальд, які трапіў у турму за такое ж «злачынства» і ў якога назаўжды адабралі малога сына? Я памятаю, што адчуваў я, калі мяне забралі ад майго малога Міхая! І я пакутую разам з братам Грунвальдам, Іваненкам, бабуляй Шаўчук, Таісай Ткачэнкай, Кацярынай Веказінай, Георгіем Веказіным, мужам і жонкай Пілатамі ў Латвіі і іншымі святымі і героямі веры дваццатага стагоддзя. Я схіляюся, каб пацалаваць іх кайданы, як першыя

хрысціяне цалавалі кайданы сваіх братоў, якіх вялі на пажыву дзікім звярам. Але некаторыя заходнія царкоўныя кіраўнікі не дбаюць пра гэтых святых, і імёнаў мучанікаў няма ў іхных памінальніках. А пакуль іх катуюць, афіцыйных кіраўнікоў баптысцкіх і праваслаўных Цэркваў, якія выдалі іх на мукі, з пашанай прымаюць на канферэнцыях у Нью-Дэлі і Жэневе, і яны ўсіх пераконваюць, што ў Расеі пануе поўная рэлігійная свабода! Адзін з кіраўнікоў Сусветнае Рады Цэркваў публічна цалаваўся з савецкім архіяпіскапам Нікодзімам, калі той сказаў гэта. Потым яны разам сядзелі за банкетным сталом, а святыя ў турме тым часам елі баланду з нямытымі кішкамі. Гэта не магло так заставацца, і таму Падпольная Царква вырашыла, што мне трэба пры першай магчымасці выехаць з краіны і паведаміць заходнім хрысціянам пра тое, што ў нас робіцца. Я адрынуў камунізм, хоць і люблю камуністаў. Я лічу, нельга прапаведаваць Евангелле, не адрынуўшы камунізму! Ёсць людзі якія кажуць мне: «Прапаведуй чыстае Евангелле!» Я прыгадваю, што ў тайнай паліцыі мне таксама казалі: можаш прапаведаваць Хрыста, абы не згадваў пра камунізм. Няўжо тыя, хто выступае за «чыстае Евангелле», натхнёныя тым жа духам, што і камуністычная тайная паліцыя? Я не ведаю, што такое «чыстае Евангелле». Ці было чыстым евангелле Іоана Хрысціцеля? Ён казаў не толькі «пакайцеся, бо наблізілася Царства Нябеснае» (Мц. 3:2), ён яшчэ дакараў Ірада «за ўсё, што Ірад зрабіў бла-

гога» (Лк. 3:19). Ён заплаціў галавою за тое, што не абмежаваўся адцягненым маралізатарствам. Ісус казаў не толькі «чыстую Нагорную казань», ён казаў і тое, што некаторыя сучасныя пастары назвалі б негатыўнаю пропаведдзю: «Гора вам, кніжнікі й фарысеі-крывадушнікі... змеі, плод яхідніны!» (Мц. 23:27, 33). За гэтую «нячыстую» пропаведзь яго і распялі. Да Нагорнае казані фарысеям не было справы. Грэх трэба называць сваім імем. Камунізм у нашы дні – адзін з самых небяспечных грахоў. Евангельская вестка, якая не адрынае яго, не можа быць чыстаю! Падпольная Царква, адрынаючы яго, рызыкуе свабодаю і жыццём. Тым больш мне нельга маўчаць на Захадзе. Я адрынаю камунізм не так, як гэта робяць так званыя «антыкамуністы». Гітлер таксама быў антыкамуністам, і тым не менш пачварным тыранам. Мы ж ненавідзім грэх, але любім грэшніка.

### Чаму ў мяне баліць душа на Захадзе

На Захадзе ў мяне баліць душа больш, чым пад камунізмам. Найперш гэта з тугі па невымоўнаму хараству Падпольнае Царквы, Царквы, якая спаўняе старое лацінскае выслоўе – nudis nudum Christi sequi (голаму ісці за голым Хрыстом). У забраных краінах Сын Чалавечы і тыя, хто Яму верны, не маюць дзе скланіць галаву. Хрысціяне там часта не будуюць сабе дамоў. Навошта? Як толькі чалавек трапіць у турму, дом у яго адбяруць. Яго

могуць арыштаваць нават за сам гэты дом, бо нехта пакладзе на яго вока. У Падпольнай Царкве, каб пайсці за Хрыстом, вы не хаваеце бацьку і не развітваецеся з сям'ёю (Мц. 8:19-22). Хто ваша маці, хто сястра, хто брат? У гэтым дачыненні вы падобныя да Хрыста. Маці і брат для вас толькі тыя, хто спаўняе волю Айца Нябеснага (Мц. 12:50). Калі дзеці нярэдка здраджваюць бацькоў, нявеста – жаніха, жонка – мужа, ці ж могуць мець вялікую вагу натуральныя повязі? Толькі духоўная повязь застаецца надзейнаю. Падпольная Царква – бедная і пакутная, але ў ёй няшмат «цеплаватых» вернікаў (Адкр. 3:15-16). Служба Божая ў Падпольнай Царкве нагадвае тую, што вялася 19 стагоддзяў назад у першых хрысціян. Казаннікі не знаёмыя з багаслоўскімі тонкасцямі. Яны не вывучалі гамілетыкі, як не вывучаў яе і апостал Пётр. Любы прафесар багаслоўя паставіў бы Пятру двойку за казанне ў дзень Пяцідзесятніцы. Біблійныя цытаты ў камуністычных краінах мала вядомыя, бо сама Біблія там забаронена, а казаннік найчасцей мае за плячыма гады турмы, дзе Бібліі ўвогуле не было. Калі такія людзі вызнаюць сваю веру ў Айца, за гэтымі словамі тоіцца сапраўдная драма. У турме яны штодня прасілі ў Бога хлеба, а атрымлівалі брудную баланду. І ўсё ж яны вераць, што Бог – Айцец, які любіць сваіх дзяцей! Яны падобныя да Іова, які казаў, што будзе спадзявацца на Бога, нават калі Той забівае яго. Яны падобныя да Ісуса, Які называў Бога Айцом нават на крыжы, калі Той,

здавалася б, пакінуў Яго. Кожнага, хто пазнаёміўся з духоўным хараством Падпольнае Царквы, не можа задаволіць пустата і халоднасць некаторых заходніх Цэркваў. На Захадзе ў мяне баліць душа горш, чым у турме: я бачу тут на свае вочы, як канае заходняя цывілізацыя. Освальд Шпэнглер пісаў у 1926 годзе ў сваёй кнізе «Заход Еўропы»: «Ты паміраеш. Я бачу ў табе ўсе прыкметы распаду. Я магу давесці, што твая раскоша і галеча, твой капіталізм і сацыялізм, тваё войны і рэвалюцыі, твой атэізм, песімізм, цынізм і амаральнасць, разбітыя сем'і і кантроль за нараджальнасцю, усё, што выцягвае з цябе жыццёвыя сокі і разбурае мозг, – усё гэта прыкметы заняпаду вялікае цывілізацыі, як было ў старажытнасці з Александрыяй, Грэцыяй і неўратычным Рымам». Гэта было напісана ў 1926 годзе. З таго часу дэмакратыя і цывілізацыя сканалі на палове Еўропы і нават на Кубе. А Захад спіць! Толькі адна сіла на Захадзе не дрэмле. Гэта камунізм. На Ўсходзе камуністы ўжо страцілі ілюзіі, але на Захадзе іхная ідэалогія застаецца небяспечнаю. Заходнія гуманісты і камуністы не вераць весткам пра жорсткасць, галечу і пераследы ў камуністычных краінах. Яны з нястомным імпэтам шыраць сваю веру паўсюль: у вышэйшых класах грамадства, сярод інтэлігенцыі, студэнтаў, па трушчобах і ў цэрквах. Мы, вернікі, часта толькі напалову стаімо на баку праўды, а яны стаяць усім сэрцам на баку хлусні. А багасловы Захаду тым часам спрачаюцца пра розную

драбязу. Гэта нагадвае мне адзін выпадак з гісторыі. Калі войскі Магамета II аблажылі ў 1453 г. Канстанцінопаль і вырашаўся лёс Балканаў на будучыя вякі – быць ім хрысціянскімі ці магаметанскімі – царкоўны сабор у абложаным месце абмяркоўваў такія пытанні: якога колеру былі вочы ў Дзевы Марыі? Які пол маюць анёлы? Што будзе, калі муха ўпадзе ў святую ваду – ці муха асвяціцца, ці вада апаганіцца? Можа, гэта толькі легенда, але прагледзьце сучасныя царкоўныя часопісы, і вы пабачыце, што ў іх спрэс абмяркоўваюцца пытанні такога кшталту. Пагроза ганенняў і пакуты Падпольнае Царквы амаль ніколі не згадваюцца. Затое бясконца разбіраюцца багаслоўскія і рытуальныя тонкасці і розныя другарадныя пытанні. Аднойчы ў кампаніі нехта запытаў: «Калі б вы былі на параходзе, які тоне, і вам удалося даплыць да востраву, то якую адну кнігу з карабельнае бібліятэкі вы хацелі б узяць з сабою?» Хто назваў Біблію, хто – Шэкспіра, але толькі адзін з прысутных адказаў слушна: «Я хацеў бы, каб на востраве ў мяне быў падручнік «Як самому змайстраваць човен». А калі я ў гэтым чоўне дабяруся да вялікае зямлі, то можна будзе чытаць што заўгодна». Захаваць свабоду для ўсіх дэнамінацыяў і багаслоўскіх школаў і аднавіць яе там, дзе яна страчана – нашмат важней, чым адстойваць тое ці іншае багаслоўскае меркаванне. «Праўда зробіць вас вольнымі» – сказаў Хрыстос (Ін. 8:32). І наадварот, вольнасць і толькі вольнасць дае нам праўду. Чым спрачацца

пра другараднае, нам належыць аб'яднацца ў змаганні за волю супроць тыраніі. Пакуты Царквы за Жалезнай Заслонаю – мой заўсёдны боль. Прайшоўшы праз такія пакуты, я ведаю іх не па чутках. У чэрвені 1966 г. савецкія газеты «Известия» і «Сельская жизнь» абвінавацілі расейскіх баптыстаў у тым, што яны вучаць вернікаў забіваць дзяцей дзеля адкуплення грахоў. Гэтае старое абвінавачанне ў рытуальным забойстве раней узводзілася на габраяў. Але я ведаю, што за ім стаіць для абвінавачаных, бо ў 1959 годзе сядзеў у турме ў месце Клуж з вязнем, якога звалі Лазаровіч, абвінавачаным у забойстве дзяўчынкі. Яму было ўсяго трыццаць гадоў, але за адну ноч ён ад катаванняў пасівеў. Ён выглядаў як глыбокі стары. Яму вырвалі пазногці на руках, каб прымусіць прызнацца ў злачынстве, якога ён не ўчыняў. Пасля шматгадовых катаванняў яго невінаватасць была даказаная, і яго адпусцілі на волю, але яму было ўжо ўсё роўна. Яго зламалі назаўсёды. Можна сьмяяцца, чытаючы пра дурныя абвінавачанні, якія ўзводзяцца на баптыстаў, але я ведаю, што яны азначаюць для абвінавачаных. Жывучы на Захадзе, я ўвесь час бачу перад сабой гэтыя страшныя абразы мінулага. Дзе цяпер архіяпіскап Калужскі Ермаген і яшчэ сямёра япіскапаў, якія выступілі супроць крайнасцяў у супрацоўніцтве з Савецкім рэжымам, на якія пайшлі патрыярх Аляксій і архіяпіскап Нікодзім – прылады ў руках камуністаў? Калі б я не прысутнічаў пры сконе біскупа, які вы-

ступіў з такім пратэстам у Румыніі, я не непакоіўся б так пра лёс гэтых пабожных япіскапаў. Патрыярх сурова пакараў святароў Мікалая Эшлімана і Глеба Якуніна за патрабаванне свабоды для Царквы. Пра гэта ведаюць на Захадзе. Але ў румынскай турме я быў разам з айцом Іоанам з Уладзімірэшты ў Румыніі, які сядзеў за гэткае ж «злачынства». Знешне гэта выглядала як звычайнае царкоўнае пакаянне, але афіцыйныя кіраўнікі нашае праваслаўнае Царквы, як і большасць афіцыйных царкоўных лідэраў у камуністычных краінах, працавалі рука аб руку з тайнай паліцыяй. За накладзенай імі царкоўнаю караю ішла турма з катаваннямі, збіццём, наркотыкамі. Я скаланаюся ад думкі пра пакуты гнаных камуністамі вернікаў. Я скаланаюся, думаючы пра вечныя пакуты іх ганіцеляў і катаў. Я скаланаюся ад думкі пра вернікаў вольнага свету, якія нічым не дапамагаюць сваім гнаным братам. У глыбіні сэрца мне хочацца захаваць прыгажосць свайго вінаградніку і не ўвязвацца ў такую вялікую бітву. Мне хацелася б цішыні і спакою. Але гэта немагчыма. Калі камуністы занялі Тыбет, яны вынішчылі тых, хто дбаў адно аб духоўнае. У нашай краіне таксама вынішчаюць усіх, хто ўцякае ад рэальнасці. Цэрквы зачыняюць, манастыры разганяюць, пакінуўшы не больш, чым трэба, каб ашукваць замежнікаў. Цішыня і спакой, пра якія я мару, былі б небяспечнымі для душы ўцёкамі ад рэчаіснасці. Я вяду гэтае змаганне, нягледзячы на асабістую небяспеку. Калі я раптам знікну, можаце

быць упэўненыя, што мяне выкралі камуністы. Калі мяне ў 1948 годзе выкралі на вуліцы і пасадзілі ў турму пад фальшывым імем, Анна Паўкер, наш тагачасны міністр замежных спраў, сказала шведскаму паслу Патрыку фон Рэйтэрсвэрдэ: «А, Вурмбранд цяпер гуляе па вуліцах Капенгагену». А ў яе суразмоўцы ў кішэні ляжаў мой ліст, які ўдалося перадаць на волю. Ён ведаў, што яна хлусіць. Гэта можа паўтарыцца зноў. Калі мяне заб'юць, можна быць упэўненым, што забойцу падаслалі камуністы. Нікому больш няма патрэбы мяне забіваць. Калі вы пачуеце, што я маральна разбэшчаны тып, злодзей, мужаложнік, пралюбадзей, палітычна нядобранадзейны, хлус або яшчэ нехта ведайце – гэта спаўняецца пагроза тайнай паліцыі: «Мы знішчым цябе маральна». З вельмі добра абазнанае крыніцы я даведаўся, што пасля майго сведчання перад амерыканскім Сенатам напрыканцы 1960-х гг. румынскія камуністы пастанавілі забіць мяне. І ўсё ж я не магу маўчаць. Разважце спакойна тое, што я кажу. Нават калі вы лічыце, што пасля ўсяго перажытага я захварэў на манію пярэследу, запытайце сябе, што за страшная сіла камунізм, калі ён даводзіць людзей да такіх комплексаў!? Што гэта за сіла, якая прымушае немца з Усходняй Нямеччыны сядаць з дзецьмі ў бульдозер і ламіцца скрозь калючы дрот, рызыкуючы жыццём і сваім, і сям'і? Захад спіць, але трэба яго абудзіць, каб ён пабачыў нядолю забраных краін!

* * *

Людзі ў бядзе часта шукаюць казла адпушчэння, каб зваліць на яго віну за свае пакуты. Але мне няма на каго звальваць віну. Я не магу вінаваціць царкоўных лідэраў Захаду, якія ідуць на кампрамісы з камуністамі. Зло ідзе не ад іх. Яны самі – ахвяры нашмат старэйшага зла. Не яны стварылі ў цэрквах хаос. Яны толькі прынялі яго ў спадчыну. Ад тых дат, як я прыехаў на Захад, я наведаў нямала духоўных семінарыяў. Я слухаў лекцыі пра гісторыю званоў і царкоўных спеваў, пра кананічныя правілы, якія выйшлі з ужытку, і пра царкоўную дысцыпліну, якой даўно няма і знаку. Я сустракаў студэнтаў багаслоўя, якіх вучылі, што біблійная гісторыя стварэння свету – няпраўда, як і гісторыя пра Адама, патоп і Майсеевы цуды; што прароцтвы былі напісаныя пасля іх спаўнення, што беззаганнае пачацце – міф, уваскрасенне Ісуса Хрыста – выдумка, што Яго рэшткі засталіся недзе ў труне, што лісты апосталаў несапраўдныя, Адкрыццё Іоана Багаслова – трызненне вар'ята, але ў астатнім Біблія – кніга святая, хоць ёй прыпісана больш хлусні, чым у кітайскіх камуністычных газетах! Вось што вучылі ў семінарыях сучасныя кіраўнікі цэркваў! Вось тая атмасфера, у якой яны жывуць! Нашто ім быць вернымі Госпаду, пра Якога кажуць такія недарэчнасці? Нашто захоўваць вернасць Царкве, у якой спакойна можна вучыць, што Бог памёр? Яны кіруюць афіцыйнай царквой, а не Нявестай Хрыстовай. Сустрэўшы

верніка з Падпольнае Царквы, мучаніка, пакутніка, яны глядзяць на яго, як на дзіва. Нельга судзіць пра чалавека аднабакова. Інакш мы будзем як фарысеі, якія гудзілі Хрыста, бо Той не выконваў іх пастановаў пра суботу. Гэта закрыла ім вочы на тое, што было прыгожа ў Хрысце нават з іхнага пункту гледжання. Тыя самыя кіраўнікі цэркваў, якія няслушна ставяцца да камунізму, могуць мець вялікую рацыю ў іншых дачыненнях і быць шчырымі ў сваіх перакананнях. І нават там, дзе яны памыляюцца, яны яшчэ могуць перамяніцца. У Румыніі мне давялося сустрэцца з адным праваслаўным біскупам. Ён служыў камуністам і губіў сваю паству. Я ўзяў яго руку ў свае і расказаў яму прыпавесць пра блуднага сына. Быў вечар, мы гутарылі ў ягоным садзе, і я сказаў: «Глядзіце, з якой любоўю Бог прымае грэшніка, які вяртаецца да Яго. Ён з радасцю прыме нават біскупа, калі той пакаецца». Я спяваў яму хрысціянскія спевы, і ён пакаяўся. У турме я сядзеў у адной камеры з праваслаўным святаром, які, спадзеючыся вызвалення, пісаў атэістычныя лекцыі. Я пагутарыў з ім, і ён парваў на шматкі ўсё, што напісаў, рызыкуючы, што яго ніколі не выпусцяць. Мне няма з каго рабіць казла адпушчэння, каб аблегчыць цяжар, які ціcне мне на сэрца. Яшчэ адзін мой боль у тым, што мяне часам не разумеюць нават блізкія сябры. Некаторыя вінавацяць мяне ў злосці і пагардзе да камуністаў, але я ведаю, што гэта не так. Юдаістычны аўтар Кл од Монтэфіёрэ пісаў, што стаўленне Ісуса да фарысеяў

і адкрытае іх выкрыццё супярэчыць Ягонай запаведзі пра любоў да ворагаў і дабраслаўленне тых, што праклінаюць нас, а доктар У. Р. Мэт'юс, былы дэкан сабору Св. Паўла ў Лондане, убачыў тут нелагічнасць і непаслядоўнасць Ісусавага характару. І патлумачыў яе тым, што Ісус не быў інтэлектуалам! Такое ўяўленне пра Ісуса відавочна памылковае. Ісус любіў фарысеяў, хоць і выкрываў іх публічна. І я люблю камуністаў і тых, хто стаў іх прыладай у цэрквах, хоць і выкрываю іх. Мне ўвесь час кажуць: «Забудзь пра камуністаў! Займайся толькі духоўнымі справамі!» Аднойчы я сустрэў верніка, які пацярпеў пры нацыстах. Ён сказаў мне, што стаіць цалкам на маім баку, пакуль я сведчу пра Хрыста, але, на яго думку, мне не след казаць ні слова супроць камуністаў. Я запытаў яго, ці памыляліся тыя вернікі, якія змагаліся з гітлерызмам, і ці павінны яны былі абмежавацца толькі казаннямі з Бібліі, а пра гітлераўскую тыранію маўчаць, і ён адказаў: «Але ж Гітлер забіў шэсць мільёнаў габраяў! Пра яго трэба было гаварыць». Я сказаў яму на гэта: «Камунізм забіў трыццаць мільёнаў чалавек у Расеі і мільёны ў Кітаі, не кажучы пра іншыя народы. Габраяў ён забіваў таксама. Няўжо мы павінны абурацца толькі тады, калі забіваюць габраяў, а не расейцаў або кітайцаў?» Ён адказаў мне: «Гэта зусім іншая рэч». І я не атрымаў ніякага тлумачэння. Мяне білі ў паліцыі пры Гітлеры і пры камуністах, і я не бачу ніякае розніцы. Мне балела і тады, і тады. Хрысціянства павінна змагацца су-

проць розных грахоў, не толькі супроць камунізму. Але камунізм – самы страшны і небяспечны ягоны вораг, і мы мусім аб'яднаць супроць яго ўсе нашы сілы. Паўтару яшчэ раз: найвышэйшая мэта жыцця чалавека – прыпадабненне да Хрыста. Камунізм жа ставіць сваёй задачай перашкодзіць хрысціянам у гэтым. Камуністы перш за ўсё праціўнікі рэлігіі. Яны вераць, што пасля смерці чалавек ператвараецца ў неарганічныя рэчывы. Яны хочуць, каб усё жыццё працякала на ўзроўні матэрыі. Яны знаёмыя толькі з масамі. Як нячысты дух у Новым Запавеце, яны кажуць, што імя ім – легіён. Іныдвідуальнасць, адзін з найвялікшых Божых дароў чалавеку, павінна, на іх думку, знікнуць. Аднаго чалавека яны арыштавалі за тое, што знайшлі ў яго кнігу Макса Адлера «Індывідуальная псіхалогія». Афіцэр тайнай паліцыі, убачыўшы яе, закрычаў: «Ага! Індывідуальная, заўжды індывідуальная! Чаму не калектыўная?» Ісус хоча, каб мы былі асобамі. Таму паміж камунізмам і намі кампраміс немагчымы. Камуністы гэта ведаюць. Іх часопіс «Наука и религия» піша: «Рэлігія несумяшчальная з камунізмам. Яна варожая яму. Змест Праграмы КПСС наносіць смяротны ўдар па рэлігіі. Гэта праграма пабудовы атэістычнага грамадства, у якім людзі назаўжды вызваляцца ад рэлігійнага рабства». Дык ці можа хрысціянства суіснаваць з камунізмам? Вось адказ саміх камуністаў: праграма кампартыі «наносіць смяротны ўдар па рэлігіі!»

*Раздзел 5*

## НЯБАЧНАЯ, АЛЕ ПАЎСЮДНАЯ ПРЫСУТНАСЦЬ ПАДПОЛЬНАЕ ЦАРКВЫ

Падпольная Царква працуе ў вельмі цяжкіх умовах. Ува ўсіх камуністычных краінах атэізм з'яўляецца дзяржаўнай рэлігіяй. Гэтыя краіны дазваляюць некаторую свабоду сумлення для старых, але дзецям і моладзі верыць нельга ні ў якім разе! У камуністычных і іншых забраных краінах усё – радыё, тэлебачанне, кіно, тэатр, літаратура – скіравана на выкараненне веры ў Ісуса Хрыста. Падпольная Царква мае няшмат магчымасцяў для супраціву магутнай таталітарнай дзяржаве. Падпольныя святары ў Савецкім Саюзе не маюць багаслоўскае падрыхтоўкі. У Кітаі ёсць пастары, якія ні разу не прачыталі ўсяе Бібліі цалкам. Высвячэнні няраз адбываюцца, як у наступным выпадку. Аднойчы я спаткаўся з маладым расейскім святаром і запытаў, хто яго высвяціў. Ён адказаў: «У нас няма сапраўдных біскупаў. Афіцыйны біскуп не будзе нікога высвячаць без дазволу ўладаў. Дык мы ўдзесяцёх пайшлі на магілу замучанага біскупа; двое з нас усклалі рукі на яго надгробак, другія сталі вокал, і ўсе разам маліліся, каб Святы Дух высвяціў нас на служэнне. Гэтае высвячэнне напэўна правялі прабітыя рукі Хрыста. На маю думку, высвячэнне гэтага маладога чалавека было ў Божых вачах сапраўдным. Людзі, высвечаныя такім чынам, без адмысловае багаслоўскае аду-

кацыі і часта мала знаёмыя з Бібліяй (як евангелісты ў Бангладэшы), вядуць вялікую справу Хрыстову, падобна як у першыя вякі хрысціянства. Якія семінарыі паканчалі тыя, хто перавярнуў цэлы свет дзеля Хрыста? Ці ўсе яны ўмелі чытаць? Адкуль маглі яны ўзяць Біблію? З імі гаварыў Сам Бог! У Падпольнай Царквы няма сабораў, але які сабор можа зраўнацца харастваом з небам, да якога мы ўздымалі позірк, калі ўпотай збіраліся па лясах? Музыку арганоў замянялі спевы птушак, а водар кветак быў для нас фіміямам. Патрапаная адзежа вызваленага мучаніка ўражвала больш за святарскія рызы. Месяц і зоры былі нам свечкамі, і анёлы запальвалі іх для нас. Я не магу знайсці словы, каб апісаць хараство тае Царквы! Часта пасля таемнага сходу вернікаў лавілі і саджалі ў турмы, і яны насілі свае кайданы з радасцю, як нявеста носіць свае аздобы, падараваныя каханым. Па-сапраўднаму радасных вернікаў я знайшоў толькі ў Бібліі, у Падпольнай Царкве і ў турме. Падпольная Царква церпіць уціск, але мае і багата сяброў – нават у тайнай паліцыі і ўва ўрадзе. Часам гэтыя тайныя прыхільнікі заступаюцца за яе. У савецкія часы газеты скардзіліся на рост колькасці «атэістаў напаказ». Яны сустракаюцца на ўсіх узроўнях камуністычнае ўлады: у міністэрствах, аддзелах прапаганды і г. д. Напаказ яны дэманструюць камуністычныя перакананні, а пад рукою вераць у Бога і нават, належаць да Падпольнае Царквы. У камуністычным друку паведамлялася пра адну

супрацоўніцу аддзелу прапаганды. Пасля працы ў іх з мужам збіралася моладзь з другіх кватэр, і яны разам чыталі Біблію і маліліся. Гэта не адзінкавы выпадак. Такое сустракаецца ў камуністычным свеце паўсюль, і «атэістаў напаказ» цяпер дзесяткі тысяч. Яны не ходзяць у афіцыйныя цэрквы, дзе за імі сочаць і дзе гучыць «разбаўленае» Евангелле. Замест гэтага яны застаюцца на сваіх адказных пасадах і адгэтуль паціху, але дзейсна сведчаць аб Хрысце. Падпольная Царква мае тысячы такіх вернікаў, якія збіраюцца па скляпах, гарышчах, на кватэрах і ў чыстым полі. У Савецкім Саюзе хрысціяне не спрачаліся пра хрышчэнне дзяцей ці беспамылковасць Папы, пра тое, ці прыйдзе Ісус Хрыстос перад Тысячагадовым Царствам, ці пасля яго. Яны не ўмеюць тлумачыць прароцтвы і не спрачаюцца аб іх, але я нярaз дзівіўся, як прыгожа яны ўмеюць даводзіць атэістам існаванне Бога! Яны адказвалі атэістам вельмі проста: «Калі б вас запрасілі на банкет з рознымі смачнымі стравамі, няўжо вы паверылі б, што іх ніхто не гатаваў? Прырода – гэта такі ж банкет, падрыхтаваны для нас! У нас ёсць яблыкі і персікі, малако і мёд. Хто згатаваў усё гэта для чалавека? Прырода сляпая. Калі вы не верыце ў Бога, як вы растлумачыце, што ў ёй ёсць усё, што нам трэба?» Яны ўмеюць даводзіць існаванне вечнага жыцця. Я чуў, як адзін з іх пераконваў атэіста: «Дапусцім, мы маглі б пагаварыць з зародкам у матчыным улонні і сказалі б яму, што ён не заўсёды будзе жыць так, як цяпер,

і што неўзабаве ён пяройдзе ў новае, дасканалейшае жыццё. Што ён адказаў бы нам? Тое, што і вы, атэісты: іншага жыцця няма, жыццё ў матчыным улонні сапраўднае, а ўсё астатняе – рэлігійныя забабоны. Але калі б зародак умеў думаць, ён сказаў бы: «Вось у мяне растуць рукі: яны мне не патрэбныя, я не магу іх нават выпрастаць. Навошта яны мне? Мабыць, дзеля нейкае будучае стадыі існавання, на якой я змагу з іх скарыстаць. У мяне растуць ногі, але я мушу прыціскаць іх да грудзей. Нашто яны растуць? Мабыць, мяне чакае жыццё ў нейкім іншым свеце, дзе я змагу хадзіць. У мяне ёсць бочы, хоць вакол цемра і яны мне зусім не патрэбны. Нашто ж яны мне? Мабыць, мяне чакае новае жыццё, светлае і каляровае». Калі б зародак мог разважаць пра сваё развіццё, ён зрабіў бы выснову, што яго чакае нейкае будучае жыццё, яшчэ яго не бачыўшы. Гэтаксама ж і з намі. Пакуль мы маладыя, у нас ёсць імпэт, але нестае розуму, каб правільна яго скарыстаць. З цягам гадоў мы робімся мудрэйшымі, але нас ужо чакае катафалк, каб завезці на могілкі. Нашто ж нам было набываць веды і мудрасць, калі скарыстаць з іх няма калі? Нашто зародку рукі, ногі, вочы? Дзеля таго, што будзе! Так сама і з намі. Мы назапашваем веды, досвед, мудрасць для таго, што нас яшчэ чакае. Мы рыхтуемся служыць на вышэйшым узроўні, які чакае нас па смерці». Афіцыйная камуністычная навука кажа, што Хрыста ўвогуле ніколі не існавала. Працаўнікі Падпольнае Царквы лёгка адбіваюць

гэтае цверджанне простым адказам: «Якая газета ў вас у кішэні? «Праўда»? Пакажыце, калі ласка. Ага! Чацвёртае студзеня 1964 году. Адкуль лічыцца 1964 год? Ад таго часу, як на зямлі жыў Той, Хто не існаваў і не меў ніякага значэння для гісторыі! Вы кажаце, што Яго не было, а гады лічыце ад Ягонага нараджэння? Час быў і да яго, але калі прыйшоў Ён, чалавецтву здалося: усё, што да Яго, было марна, а сапраўдны час пачынаецца толькі цяпер. Нават вашыя камуністычныя газеты сведчаць, што Ісус не міф». Заходнія пастары звычайна прапаведуюць так, быццам кожны іх слухач ужо глыбока перакананы ў асноўных праўдах хрысціянства. Але ж гэта не так: вельмі шмат няцвёрдых у веры, а тым часам вельмі рэдка чуваць казанні, якія даводзяць слушнасць нашае веры. А за Жалезнай Заслонай казаннікі, якія ніколі гэтаму не вучыліся, даюць нованавернутым глыбокія падставы веры. Паміж афіцыйнай і падпольнай Цэрквамі няма выразнай мяжы. Яны пераплятаюцца паміж сабой. Некаторыя пастары афіцыйнае Царквы ў забраных краінах вядуць паралельнае тайнае служэнне, выходзячы далёка за межы, вызначаныя ўладамі. Калабаранцкая палітыка афіцыйнае царквы мае доўгую гісторыю. Яна пачалася адразу пасля сацыялістычнае рэвалюцыі ў Расеі, калі япіскап Сергій узначаліў «Жывую Царкву». Адзін з ягоных паплечнікаў абвясціў, што «Марксізм – гэта Евангелле, напісанае атэістычнымі літарамі». Ах, якая тэалогія! Такіх Сергіяў

хапала ў кожнай краіне. У венгерскіх каталікоў гэта быў айцец Балаг. Ён разам з некаторымі пратэстанцкімі пастарамі дапамагаў камуністам захапіць поўную ўладу ў краіне. У Румыніі камуністы прыйшлі да ўлады з дапамогай праваслаўнага святара Бурдуча, былога фашыста, які, запабягаючы перад чырвонымі за свае ранейшыя грахі, стаў яшчэ чырванейшы за сваіх начальнікаў. Гэты святар стаяў поплеч з Вышынскім (міністрам замежных спраў СССР) і згодна пасміхаўся, калі той абвяшчаў усталяванне новага камуністычнага ўраду: «Гэты ўрад пабудуе зямны рай, і нябесны рай вам ужо не спатрэбіцца». Што ж да святароў накшталт Мікалая з Расеі, дык пра іх вядома, што яны былі даносчыкамі. Маёр Дзярабін з расейскай тайнай паліцыі, які ўцёк на Захад, засведчыў, што Нікалай быў іхным агентам. І так было ці не ў любой дэнамінацыі. Кіраўніцтва румынскіх баптыстаў гвалтам прымусілі даносіць на сапраўдных хрысціян. У Расеі баптысцкія кіраўнікі зрабілі гэтаксама. Старшыня румынскіх адвэнтыстаў Такіч казаў мне, што ён быў даносчыкам камуністычнае тайнае паліцыі з першага дня, як яны прыйшлі да ўлады. Камуністы зачынялі цэрквы тысячамі, але замест таго, каб пазачыняць іх усе, яны хітра вырашылі пакінуць для выгляду некалькі афіцыйных цэркваў і выкарыстоўваць іх як вокны, праз якія льганазіраць за хрысціянамі і хрысціянствам, кантраляваць іх, а з цягам часу вынішчыць. Яны вырашылі, што структуру Царквы лепш пакінуць без зменаў, аб-

ярнуўшы яе ў інструмент камуністычнага кантролю за хрысціянамі і падману замежнікаў, што прыязджаюць у краіну. Так цяпер, на мяжы стагоддзяў, стаіць справа і з афіцыйнай кітайскай царквою. Гэтая «адзіная легальная» царква ў Кітаі прадстаўляе менш за 20% кітайскіх хрысціянаў. У Румыніі мне прапанавалі такую царкву пры ўмове, што я, як пастар, буду паведамляць пра маіх прыхаджанаў тайнай паліцыі. Мабыць, заходнікі, звыклыя да чорна-белага светаўспрымання, гэтага не зразумеюць. Але Падпольная Царква ніколі не прыме падкантрольных цэркваў, захаваных дзеля выгляду, за паўнавартасную пропаведзь Евангелля «усякаму стварэнню» – у тым ліку дзецям. Але ў афіцыйных цэрквах, насуперак здрадзе шмат каго з лідэраў, існуе сапраўднае духоўнае жыццё. (Здаецца, так бывае і ў шмат якіх цэрквах на Захадзе. Кангрэгацыі часам захоўваюць веру не дзякуючы сваім правадырам, а насуперак ім.) У Расеі праваслаўная літургія засталася нязменнаю і па-ранейшаму жывіць сэрцы праваслаўных хрысціян, хоць казанні і лесцяць камуністам. Лютаране, прэсбітэрыяне і іншыя пратэстанты пяюць даўнейшыя гімны. Апроч таго, нават даносчык мусіць устаўляць у казанне нешта з Пісання. У Кітаі сёння людзі прыходзяць да Хрыста пад уплывам вядомых здраднікаў. Яны ведаюць, што тыя данясуць тайнай паліцыі пра іх навярненне, і мусяць хаваць сваю веру ад таго самога, хто даў ім гэтую веру. Гэта вялікі цуд Божы, пра які сімвалічна кажа кніга

Левіт (11:37): «І калі што-небудзь ад трупу іх [нячыстага, паводле Майсеевага закону] упадзе на якое-небудзь семя, якое яны сеюць, то яно чыстае». Справядлівасць прымушае нас прызнаць, што не ўсе лідэры афіцыйных цэркваў, нават не ўсе іх афіцыйныя правадыры, служаць камуністам. Вернікі Падпольнае Царквы (апрача тых, хто мусіць хавацца) таксама займаюць вельмі прыкметнае месца ў афіцыйных цэрквах. І яны дбаюць, каб хрысціянства было не слабенькім і разбаўленым, а смелым і ваяўнічым. Калі тайная паліцыя прыехала зачыняць манастыр у Ўладзімірэшты (Румынія), ёй давялося нялёгка. Некаторыя камуністы заплацілі жыццём за спробы забараніць рэлігію. Так бывала і ў Расеі. Але афіцыйных храмаў робіцца ўсё менш і менш. У цэлым Савецкім Саюзе пры камуністах набярэцца, можа, не больш як 5-6 тысяч храмаў. (У Злучаных Штатах, дзе колькасць насельніцтва прыкладна тая самая, некалькі дзесяцігоддзяў назад было іх каля 300 000). І гэта збольшага толькі цесныя пакойчыкі – а не прыгожыя будынкі, якія мы звычайна бачым на малюнках. Замежныя госці бачаць перапоўненую царкву ў Маскве – адзіную пратэстанцкую царкву на ўвесь горад – і адзначаюць, якая тут свабода. «Цэрквы ломяцца ад народу!» – радасна паведамляюць яны. Яны не бачаць трагедыі ў тым, што на сем мільёнаў душ засталася адзіная пратэстанцкая царква! І нават да такіх цэркваў, якія месцяцца ў адным пакойчыку, 80% насельніцтва ў Савецкім

саюзе не можа даехаць, бо занадта далёка. Пра гэтыя натоўпы альбо забываюць, альбо даходзяць да іх праз падпольныя спосабы евангелізацыі. Іншага выбару няма. Чым больш камунізм пануе ў краіне, тым больш Царква мусіць рабіцца падпольнаю. А месца зачыненых афіцыйных цэркваў займаюць сходы антырэлігійных арганізацыяў.

### Як Падпольная Царква «жывіцца» атэістычнай літаратурай

Падпольная Царква ўмее карыстацца і з атэістычнае літаратуры, жывячыся ёю гэтаксама, як Ілля карміўся ежай, якую прыносілі вораны. Атэісты вельмі ж стараюцца высмейваць і крытыкаваць Біблію. Яны друкуюць кнігі накшталт «Забаўнае Бібліі» і «Бібліі для вернікаў і нявернікаў». Стараючыся паказаць, якая дурная кніга Біблія, яны прыводзяць багата біблійных вершаў. Як мы цешыліся з гэтага! Кніга, надрукаваная мільённым накладам, была поўная біблійных вершаў, невымоўна прыгожых, нягледзячы на кпіны з іх. Сама ж крытыка была настолькі дурная, што ніхто не ўспрымаў яе ўсур'ёз. У мінулым «ератыкоў», якіх паліла інквізіцыя, вялі на вогнішча ў працэсіі, убраных у недарэчныя строі, размаляваныя выявамі чарцей і пякельнага агню. Але якую ж святасць неслі ў сабе гэтыя ератыкі! Падобным жа чынам біблійныя вершы застаюцца праўдаю, нават калі іх цытуе д'ябал. Камуністычныя выдавецтвы з радасцю атрымлівалі тысячы лістоў

з просьбамі перавыдаць атэістычныя кнігі, аўтары якіх цытавалі Біблію, каб пакпіць з яе. Выдаўцы не ведалі, што гэтыя лісты прыходзілі з Падпольнае Царквы, у якой не было іншай магчымасці атрымаць Пісанне. А яшчэ мы добра ўмелі карыстацца з атэістычных мітынгаў. Адзін прафесар навуковага камунізму дэманстраваў на атэістычным сходзе, што Ісус быў усяго толькі фокуснік. Перад прафесарам стаяў графін з вадою. Ён засыпаў у яго парашок, і вада зрабілася чырвонаю. «Вось і ўвесь цуд», – растлумачыў ён, – «у Ісуса быў схаваны ў рукаве гэткі ж парашок, і ён прыкінуўся, што цудоўным чынам ператварае ваду ў віно. Але я магу зрабіць яшчэ больш, чым Ісус: я магу зноў зрабіць з віна ваду». Ён укінуў у ваду яшчэ адзін парашок, і вада зноў зрабілася празрыстай. Яшчэ адзін парашок – і яна зноў пачырванела. Тут падняўся з месца адзін хрысціянін і сказаў: «Гэта ў вас, таварыш прафесар, выйшла лоўка. Вось толькі адна просьба да вас: выпіце гэтае сваё віно!» Прафесар адказаў: «Яго нельга піць, парашок быў атрутны». Хрысціянін сказаў на гэта: «Вось і ўся розніца паміж вамі і Ісусам. Ён сваім віном прынёс нам радасць на дзве тысячы гадоў, а вы сваім віном нас труціце». Гэты хрысціянін трапіў у турму. Але вестка пра падзею разышлася далёка і шмат каго ўмацавала ў веры. Мы ўсе малыя, слабыя Давіды. Але мы мацнейшыя за Галіяфа атэізму, бо праўда на нашым баку. Бог з намі. На адной фабрыцы сагналі на лекцыю па атэізме ўсіх

рабочых, сярод якіх было нямала хрысціян. Яны ціха сядзелі, слухаючы ўсе довады супроць Бога і пра тое, якая дурасць верыць у Хрыста. Лектар імкнуўся давесці, што духоўнага свету няма, Бога няма, Хрыста няма, будучага жыцця няма; чалавек – толькі матэрыя без душы. Раз за разам ён паўтараў, што існуе толькі матэрыя. Адзін хрысціянін устаў і папрасіў слова. Яму дазволілі выступіць. Хрысціянін узяў сваё крэсла ў шпурнуў яго на падлогу. Трохі счакаўшы, ён узыйшоў на сцэну і даў лектару поўху. Лектар ад злосці наліўся крывёю. Ён пачаў на ўвесь голас лаяцца і патрабаваць, каб хрысціяніна арыштавалі. «Як ты смееў падняць на мяне руку? За што?» – пытаўся ён. Хрысціянін адказаў: «Вы толькі што самі паказалі, што казалі хлусню. Вы ж казалі, што ўсё толькі матэрыя – і больш нічога. Я ўзяў крэсла і кінуў яго аб падлогу. Гэта сапраўды толькі матэрыя. І яно на мяне не раззлавалася. А вы адказалі інакш. Матэрыя не злуецца і не гневаецца, гэта вы разгневаліся. Таму, таварыш прафесар, вы не маеце рацыі. Чалавек – больш, чым матэрыя. Мы – духоўныя істоты!» Гэткімі і падобнымі спосабамі звычайныя хрысціяне з Падпольнае Царквы абвяргаюць прадуманыя атэістычныя аргументы. Турэмны палітрук крычаў на мяне: «Дакуль ты будзеш трымацца сваёй дурной рэлігіі?» Я адказаў яму: «Я бачыў мноства бязбожнікаў, якія на смяротнай пасцелі шкадавалі, што былі бязбожнікамі, і клікалі Хрыста. Можаце вы ўявіць, каб хрысціянін, калі смерць

будзе блізка, пашкадаваў, што быў хрысціянінам, і паклікаў Маркса або Леніна, каб уратавалі яго ад веры ў Бога?» Афіцэр рассмяяўся: «Дасціпна». Я працягваў: «Калі інжынер пабудуе мост, дык той факт, што па ім можа прайсці котка, яшчэ не доказ, што мост добры. Каб давесці яго моц, па ім мусіць прайсці цягнік. Тое, што вы можаце быць атэістам, пакуль усё добра, не даводзіць слушнасці атэізму. А у моманты вялікіх крызісаў ён не вытрымлівае». Я спаслаўся на творы Леніна, адкуль відаць, што нават стаўшы старшынёй Саўнаркаму, сам Ленін маліўся, калі была нявыкрутка. Мы захоўвалі душэўны мір і спакойна чакалі развіцця падзеяў. А камуністы нерваваліся і развязвалі ўсё новыя антырэлігійныя кампаніі. Слушна казаў св. Аўгустын: «Неспакойна сэрца наша, пакуль не знойдзе супакою ў Табе».

## Чаму нават камуністаў можна здабыць дзеля Хрыста

Пры дапамозе хрысціянаў з вольных краін Падпольная Царква здабудзе сэрцы камуністаў і зменіць аблічча свету. Гэта непазбежна, бо быць камуністам ненармальна. Нават сабака жадае мець сваю ўласную костку. Сэрцы камуністаў паўстаюць супроць тае ролі, якую яны мусяць граць, і таго абсурду, у які іх прымушаюць верыць. Сёй-той з камуністаў кажа, што «матэрыя – гэта ўсё» – што мы толькі жменька хімікаліяў, пэўным чынам аргані-

заваных, і што пасля смерці мы зноў ператворымся ў соль і мінералы. Іх дастаткова было запытаць: «Чаму ж столькі камуністаў у розных краінах аддавалі жыццё за свае перакананні? Няўжо «жменька хімікаліяў» мае перакананні? Ці ж могуць «мінералы» ахвяраваць сабой дзеля дабра бліжняга?» На гэта ў іх не было адказу. Ёсць яшчэ пытанне жорсткасці. Людзі не створаны звярамі і не могуць доўга імі быць. Мы бачылі гэта на прыкладзе нацыстоўскіх лідэраў, спаміж якіх адны ўчынілі самазабойства, а другія пакаяліся і прызналіся ў сваіх злачынствах. Павальнае п'янства ў камуністычных краінах сведчыць аб празе сэнсоўнага жыцця, якога камунізм даць не можа. Звычайны расеец – натура глыбокая, вялікадушная, шчодрая. Камунізм жа – плыткае і павярхоўнае вучэнне. Чалавек шукае глыбокага жыцця, і, не знайшоўшы нідзе, шукае яго ў алкаголі. За ягоным алкагалізмам хаваецца жах перад жорсткім і хлуслівым жыццём, якое ён мусіць весці. Алкаголь «вызваляе» яго на кароткі час, а праўда, калі б ён пазнаў яе, вызваліла б яго раз назаўжды. У Бухарэсце, падчас расейскае акупацыі (1947-1989), праходзячы неяк з жонкаю паўз шынок, я адчуў неадольнае жаданне зайсці туды. Мы зайшлі туды ўдваіх. Увайшоўшы, я ўбачыў расейскага капітана, які гразіў усім пісталетам і патрабаваў яшчэ выпіўкі. Яму не давалі, бо ён ужо быў вельмі п'яны. Людзі былі ў паніцы. Я падышоў да гаспадара – той мяне ведаў – і папрасіў яго наліць капітану, паабяцаўшы, што пасяджу з ім і

буду пільнаваць, каб ён сядзеў ціха. Нам прыносілі адну бутэльку віна за другой. На стале стаялі тры шклянкі. Капітан кожны раз ветліва наліваў усе тры – і ўсе тры сам выпіваў. Мы з жонкаю не пілі. Хоць ён быў вельмі п'яны, розум яго працаваў. Ён быў прывыкшы да алкаголю. Я загаварыў з ім пра Хрыста, і ён слухаў з нечаканай увагай. Калі я скончыў, ён адазваўся: «Вы расказалі мне пра сябе, а цяпер я раскажу вам, хто я такі. Я праваслаўны святар. Калі пры Сталіне пачалося вялікае ганенне, я адным з першых адцураўся веры. Я ездзіў па вёсках з лекцыямі пра тое, што Бога няма і што, будучы святаром, я ашукваў народ. Я казаў: «Я быў ашуканцам, і ўсе астатнія святары таксама ашуканцы». Мяне вельмі цанілі за стараннасць і ўзялі на службу ў тайную паліцыю. Бог пакараў мяне тым, што вось гэтымі рукамі я мусіў катаваць і забіваць хрысціян. І цяпер я ўсё п'ю і п'ю, каб забыць пра гэта, але яно не забываецца...» Камуністы часта сканчаюць жыццё самагубствам. Так зрабілі іх найвялікшыя паэты, Ясенін і Маякоўскі. Так зрабіў іх вядомы пісьменнік Фадзееў. Незадоўга перад тым ён напісаў раман пад назовам «Шчасце», у якім тлумачыў, што шчасце – гэта нястомная праца дзеля камунізму. Ён быў ад гэтага такі шчаслівы, што, скончыўшы раман, пусціў сабе кулю ў лоб. Яго душа не вытрымала такой вялікай хлусні. Іофэ, Томкін, якія змагаліся за камунізм яшчэ за царскім часам – гэтаксама не знеслі камунізму і скончылі жыццё самагубствам. Камуністы не маюць шчасця.

Няшчасныя і іх вялікія дыктатары. Які няшчасны быў Сталін! Вынішчыўшы ці не ўсіх сваіх старых таварышаў, ён увесь час баяўся, што яго нехта атруціць або заб'е. У яго было восем спальняў, якія замыкаліся, як банкаўскія сейфы, і ніхто не ведаў, у якой з гэтых спальняў ён будзе сёння спаць. Ён нічога не еў, пакуль кухар не пакаштуе ежу ў яго на вачах. Камунізм не робіць шчаслівым нікога, нават сваіх дыктатараў. Ім патрэбны Хрыстос. Навяртаючы тых, хто пераследуе хрысціянаў, мы ўратуем не толькі іх ахвяраў, але і саміх пераследнікаў. Падпольная Царква выказвае найглыбейшую патрэбу паняволеных людзей у забраных краінах. Памажыце ёй!

* * *

Адметная рыса Падпольнае Царквы – шчырасць веры. Адзін святар, які схаваўся пад імем Георге, распавёў у сваёй кнізе пра Божае Падполле наступны выпадак. Капітан расейскай арміі прыйшоў у Вугоршчыне да святара і папрасіўся пагутарыць з ім сам-на-сам. Ён быў малады і паводзіў сябе вельмі нахабна. Калі яго завялі ў малы пакоік і зачынілі дзверы, ён кіўнуў у бок крыжа, што вісеў на сцяне. «Вы ж ведаеце, што гэта хлусня», – сказаў ён святару. – Гэта проста ашуканства, праз якое вы, святары, зводзіце бедных, каб багатым лягчэй было трымаць іх у невуцтве. Давайце, – мы цяпер адны, – прызнайцеся, вы ж ніколі сапраўды не верылі, што Ісус Хрыстос – Сын Божы!» Святар усміхнуўся: «Бедны мой юнача, вядома ж, я веру

ў гэта. Бо гэта праўда». «Я не дазволю кпіць з мяне!» – закрычаў капітан. – «Гэта сур'ёзна! Ня смейцеся з мяне!» Ён выцяг рэвальвер і наставіў яго на сьвятара. «Прызнавайцеся, або страляю!» «Я не магу прызнацца, бо гэта няпраўда. Наш Госпад сапраўды ёсць Сын Божы!» – сказаў святар. Капітан шпурнуў рэвальвер на падлогу і абняў святара. Слёзы паліліся ў яго з вачэй. «Значыць, праўда!» – усклікнуў ён. – «Праўда! Я таксама ў гэта веру, але я не мог паверыць, што людзі будуць паміраць за гэтую веру, пакуль сам не пабачыў. Дзякую вам! Вы ўмацавалі маю веру. Цяпер і я магу памерці за Хрыста. Вы паказалі мне, як гэта робіцца». Я ведаю і пра іншыя падобныя выпадкі. Калі расейцы захапілі Румынію, двое збройных расейскіх салдат зайшлі ў царкву з аўтаматамі ў руках і сказалі: «Мы ўва ўсё гэта не верым. Хто не адцураецца свае веры, будзе забіты на месцы! Хто выракаецца веры, направа, астатнія налева!» Некаторыя перайшлі направа, ім сказалі ісці дахаты. Яны паўцякалі. Калі з расейцамі засталіся толькі хрысціяне, яны пачалі абдымаць іх і прызналіся: «Мы таксама хрысціяне, але мы хочам быць толькі з тымі, хто гатовы памерці за праўду». Такія людзі змагаліся і дагэтуль змагаюцца за Евангелле ў камуністычных краінах Паўднёва-Усходняй Азіі. Яны б'юцца не толькі за Евангелле, а і за свабоду. Шмат хто з заходніх хрысціян бавіць дома цэлыя гадзіны, слухаючы свецкую музыку. У нашых дамах таксама чуваць гучная музыка, але толькі дзеля таго, каб

прыхаваць гутарку пра Евангелле і падпольную працу, каб суседзі не падслухалі і не данеслі тайнай паліцыі. Як радуюцца падпольныя хрысціяне рэдкай нагодзе сустрэцца з сапраўдным вернікам з Захаду! Той, хто піша гэтыя радкі, ведае, што сам па сабе ён мала што значыць. Але ён – голас безгалосых, каму заткнулі рот і каго не чуваць на Захадзе. Ад іхнага імя я прашу вялікае сур'ёзнасці ў веры і ў падыходзе да праблемаў хрысціянства. Ад іх імя я прашу вашых малітваў і практычнае дапамогі вернай, пакутнай Падпольнай Царкве ў камуністычных і іншых забраных краінах.

* * *

Мы здабудзем камуністаў. Па-першае, таму, што з намі Бог. Па-другое, таму, што нашая вестка адпавядае найглыбейшай патрэбе людскога сэрца. Камуністы, якія сядзелі ў турме пры нацыстах, прызнаваліся мне, што ў цяжкія гадзіны яны маліліся. Я бачыў нават камуністычных чыноў, якія паміралі з імем Ісуса на вуснах. Мы пераможам, бо за нас уся культурная спадчына нашага народу. Расейцы могуць забараніць усё, што пішуць сучасныя хрысціяне. Але ёсць кнігі Талстога і Дастаеўскага, і людзі знойдзуць там святло Хрыстова. Гэтаксама з Гётэ ў Усходняй Нямеччыне, Сянкевічам у Польшчы і інш. Найвялікшым румынскім пісьменнікам быў Садавяну. Ягоную кнігу «Жыцці святых» камуністы надрукавалі пад загалоўкам «Легенды пра святых». Але нават пад гэткім назовам прыклад святых на-

тхняе. Яны не могуць выкінуць з гісторыі мастацтва рэпрадукцыі Рафаэля, Мікелянджэла і Леанарда да Вінчы. А іх абразы кажуць пра Хрыста. Калі я гавару з камуністам пра Хрыста, яго найглыбейшая духоўная патрэба – мой саюзнік і памагаты. Яму надзвычай цяжка не адгукнуцца на мае довады. Ён з усіх сіл намагаецца заглушыць голас уласнага сумлення, які заўжды на маім баку. Я асабіста ведаў прафесароў марксізму, якія перад лекцыямі па атэізме маліліся Богу, каб той дапамог! Я ведаў камуністаў, якія хадзілі далёка на таемныя сходы, а калі іх выкрылі, яны адмаўляліся, што былі на падпольнай сустрэчы. Потым яны плакалі, што ім не хапіла мужнасці паўстаць за веру, якая прывяла іх на тую сходку. І яны таксама людзі. Калі чалавек прыйшоў да веры – нават найпрымітыўнейшай – яна будзе расці і развівацца. Мы перакананыя, што яна пераможа, бо ў Падпольнай Царкве мы бачым: яна перамагае раз за разам. Хрыстос любіць камуністаў і іншых «ворагаў веры». Іх можна і трэба здабыць дзеля Хрыста. Кожны, хто жадае наталіць прагу сэрца Ісуса аб збавенні душ усяго чалавецтва, мусіць падтрымаць Падпольную Царкву ў яе працы. Ісус сказаў: «Ідзеце, навучайце ўсе народы» (Мц. 28:19). Ён не казаў, што для евангелізацыі патрэбны ўрадавы дазвол. Вернасць Богу і нашай вялікай місіі прымушае нас пераходзіць дзяржаўныя межы, каб дайсці да людзей у паняволеных краінах. І мы дойдзем да іх у супольнасці з Падпольнаю Царквою, якая ўжо працуе там!

Падпольная Царква складаецца з трох групаў. Па-першае, гэта тысячы і тысячы былых пастараў і святароў, выгнаных са сваіх цэркваў і разлучаных са сваёю паствай за нежаданне ісці на кампраміс у справе Евангелля. Шмат хто з гэтых пастараў і святароў гадамі сядзеў у турмах і цярпеў катаванні за веру. Калі іх выпускаюць, яны адразу аднаўляюць сваю працу, таемна служачы ў Падпольнай Царкве. Хоць улады зачынілі іх цэрквы альбо замянілі іх на больш «надзейных», гэтыя пастыры працягваюць сваю службу яшчэ з большым плёнам – на падпольных сустрэчах у адрынах, на гарышчах, у скляпах, у чыстым полі ўначы – паўсюль, дзе патаемна збіраюцца вернікі. Гэтыя людзі – «жывыя мучанікі», якія не спыняюць свае службы і рызыкуюць новымі арыштамі і пакутамі. Другая частка Падпольнае Царквы – вялікая армія адданых свецкіх вернікаў. Кожны пяты жыхар планеты жыве ў камуністычным Кітаі, дзе тысячы свецкіх хрысціян навучаюць Евангеллю без ніякага «дазволу». Пярэследы заўсёды стваралі найлепшых хрысціянаў – сведкаў і лаўцоў душ. Камуністычныя пярэследы далі зваротны эфэкт: яны вырабілі сур'ёзных, самаадданых хрысціян, якіх рэдка пабачыш у вольных краінах. Гэтыя людзі не могуць зразумець, як можна быць хрысціянінам і не жадаць здабыць для Хрыста кожнага спатканага чалавека. «Красная звезда» (савецкая вайсковая газета) пісала пра расейскіх хрысціянаў так: «Прыхільнікі

Хрыста цягнуць да кожнага свае прагныя лапы». Але светлае хрысціянскае жыццё гэтых людзей прыносіць ім любоў і павагу сярод аднавяскоўцаў і суседзяў. У кожнай вёсцы, у кожным мястэчку хрысціян любяць найбольш. Калі матка хварэе і не можа дагледаць дзяцей, то прыходзіць і глядзіць іх матка-хрысціянка. Калі мужчына хварэе і не можа насячы дроваў, гэта робіць за яго хрысціянін. Яны ўвасабляюць сваё хрысціянства ў жыццё, і калі яны сведчаць пра Хрыста, людзі слухаюць і вераць – бо пабачылі ўжо Хрыста ў іхным жыцці. Паколькі ў афіцыйнай царкве можа прамаўляць толькі той святар, які атрымаў дазвол ад уладаў, мільёны палкіх, адданых хрысціян у кожным куточку камуністычнага свету здабываюць душы, сведчаць і служаць на рынку, каля калодзежа – паўсюль, куды ні пойдуць. Камуністычны друк піша, што хрысціяне-мяснікі загортваюць евангельскія брашуры ў паперу разам з мясам. Ён піша, што хрысціяне, якія займаюць адказныя пасады ў камуністычных друкарнях, позна ўночы пракрадаюцца ў цэх, запускаюць станок, выдрукоўваюць тысячы асобнікаў хрысціянскае літаратуры – і замыкаюць друкарню яшчэ да ўзыходу сонца. Камуністычны друк прызнае і тое, што дзеці-хрысціяне ў Маскве атрымлівалі з «нейкіх крыніц» Евангелле і перапісвалі ўрыўкі з яго ад рукі, а потым укладалі гэтыя ўрыўкі сваім настаўнікам у кішэні паліто ў шатні. Мноства свецкіх хрысціян – магутная, дзейсная місіянерская сіла, якая ўжо здабывае душы ў кожнай камуністыч-

най краіне. Гэтыя мільёны адданых, шчырых і палкіх вернікаў ачышчаюцца ў агні пярэследаў, якія, як спадзяваліся камуністы, павінны былі іх знішчыць. На камуністычнай Кубе насупор дзяржаўнаму ўціску ўзніклі тысячы дамовых цэркваў. А экуменічная рада Кубы складаецца пераважна з марксістоўскіх царкоўных лідэраў. Трэцяя важная частка Падпольнае Царквы – мноства верных пастараў у афіцыйных «цэрквах», якім накінулі аброць і заткнулі рот. Падпольная Царква не жыве ў поўным адрыве ад афіцыйнае царквы. За панавання камуністаў у Польшчы, Вугоршчыне і былой Югаславіі шмат хто з пастараў афіцыйных цэркваў таемна працаваў у Падпольнай Царкве. У некаторых краінах дзве гэтыя царквы пераплятаюцца яшчэ і сёння. Гэтым пастарам не дазволена гаварыць пра Хрыста па-за іх дробнымі цэркаўкамі з аднаго пакоіка. Ім не дазволена наладжваць сустрэчы з дзецьмі ці з моладдзю. Нехрысціяне баяцца прыходзіць туды. Пастарам не дазволена маліцца за хворых прыхаджанаў у іх удома. З кожнага боку яны абгароджаныя правіламі, якія пазбаўляюць іх «цэрквы» ўсялякага сэнсу. Вельмі часта гэтыя пастары, сутыкаючыся з захадамі, якія ператвараюць «свабоду веравызнання» ў фарс, адважна рызыкуюць свабодай, спаўняючы паралельнае таемнае служэнне па-за афіцыйнымі рамкамі. Яны таемна служаць дзецям і моладзі. На Бліжнім Усходзе, у Паўночнай Афрыцы і ў Азіі яны таемна навучаюць Евангеллю па дамах і ў скляпах. Яны

таемна атрымліваюць і распаўсюджваюць сярод людзей, прагных Слова Божага, хрысціянскую літаратуру. Яны рызыкуюць свабодай, парушаючы афіцыйныя абмежанні і служачы спраглым душам вакол іх. Вонкава пакорныя і паслухмяныя, яны рызыкуюць жыццём, каб таемна пашыраць Слова Божае. Шмат каго з іх у былым Савецкім Саюзе выкрылі і арыштавалі, і яны шмат гадоў адседзелі па турмах. Але і сёння хрысціян арыштоўваюць не менш. Гэтыя арыштанты – жыццёва важная частка Падпольнае Царквы ў паняволеных краінах. Колішнія святары, выгнаныя з сваіх цэркваў і гнаныя ўрадавымі чыноўнікамі, свецкія вернікі і афіцыйныя пастары, якія таемна вядуць куды шырэйшае і больш разнастайнае служэнне, чым ім дазволена – усе яны працуюць у Падпольнай альбо «неафіцыйнай» Царкве. І Падпольная Царква будзе жыць, пакуль не прыйдзе канец камунізму і іншым «ізмам». У некаторых краінах адна частка можа быць чыннейшай за іншую – але ўсе яны разам пад вялікай рызыкай працуюць дзеля Хрыста. Адзін чалавек, які часта бывае ў камуністычных краінах і вельмі цікавіцца рэлігійнымі пытаннямі, вярнуўшыся адтуль у чарговы раз, напісаў, што ні разу не сустрэў нікога з Падпольнае Царквы. Гэта тое самае, як калі б ён паехаў у Цэнтральную Афрыку да неадукаваных тубыльцаў і, вярнуўшыся, сказаў: «Я распытваўся вельмі падрабязна. Я ў кожнага пытаўся, ці гаворыць ён прозаю. І ўсе адказалі, што не». Але ж папраўдзе ўсе яны гавораць прозаю,

толькі не ведаюць, што гэта проза. Хрысціяне першых дзесяцігоддзяў не ведалі, што яны хрысціяне. Калі б іх запыталі пра іхную веру, яны адказалі б, што яны габраі, ізраэліты, што яны верацъ у Ісуса як Мэсію, што яны браты, святыя, дзеці Божыя. Найменне хрысціян было ім нададзена іншымі, і адбылося гэта нашмат пазней (упершыню – у Антыохіі). Ніводзін з паслядоўнікаў Лютара не ведаў, што ён лютаранін. Лютар рэзка пратэставаў супроць такога наймення. «Падпольнай Царквой» камуністы і заходнія даследчыкі рэлгійнае сітуацыі на Ўсходзе назвалі таемную арганізацыю, якая стыхійна ўзнікла ўва ўсіх камуністычных краінах. Вернікі Падпольнае Царквы так яе не называюць. Яны завуць сябе хрысціянамі, вернікамі, дзецьмі Божымі. Але яны вядуць падпольную працу, яны таемна сустракаюцца, абвяшчаюць Евангелле на сакрэтных сходах, куды часам прыходзяць тыя самыя іншаземцы, якія кажуць, быццам не бачылі Падпольнае Царквы. Гэтае найменне адпавядае праўдзе. З ім згодныя і праціўнікі, і прыхільнікі гэтае цудоўнае таемнае арганізацыі. Можна цэлыя гады раз'язджаць па Захадзе, ні разу не сутыкнуўшыся з міжнароднай шпіёнскай сеткай, але гэта не азначае, быццам такое сеткі не існуе. Проста шпіёны не такія дурні, каб паказвацца перад цікаўнымі турыстамі. У наступным раздзеле я зацытую некалькі артыкулаў, надрукаваных дзесяцігоддзі таму ў савецкім друку, якія сведчаць пра існаванне і ўсё большую ролю, якую грае адважная Падпольная Царква.

*Раздзел 6*

# ЯК ХРЫСЦІЯНСТВА АДОЛЬВАЕ КАМУНІЗМ

Я распавядаў пра тое, як мы таемна пашырал і Хрыстову вестку у Савецкай Арміі і ў камуністычнай Румыніі. Я заклікаў вас дапамагчы ў прапаведаванні Хрыста камуністам і паняволеным імі народам. Няўжо гэты заклік утапічны і нерэальны? Або ён усё ж практычны? Ці існуе цяпер Падпольная Царква ў камуністычнай Азіі і ў іншых паняволеных краінах? Ці магчыма там дагэтуль весці падпольную працу? На гэтыя пытанні мы можам адказаць сапраўднаю добраю навіною. Камуністы адсвяткавалі поўстагоддзя свайго панавання. Але іх перамога абярнулася паражэннем. Перамагло хрысціянства, а не камунізм. Расейскі друк, які нашая арганізацыя пільна вывучае, повен негатыўнае прапаганды супроць Падпольнае Царквы. Расейская Падпольная Царква зрабілася такой магутнай, што працуе нават напаўлегальна, пужаючы гэтым камуністаў. І цяперашняе кіраўніцтва былога Савецкага Саюзу пацвярджае ранейшыя паведамленні камуністычнага друку. Памятайце, што па ўсім свеце Падпольная Царква нагадвае айсберг. Бальшыня яе схаваная, але дробная меншыня часта дзейнічае адкрыта. На наступных старонках я падам кароткія звесткі пра некаторыя слаўныя чыны, здзейсненыя ёю ў XX стагоддзі.

7 лістапада 1966 г. у Сухумі на Каўказе Падпольная Царква наладзіла вялікі сход пад адкрытым небам. На сход прыехала багата вернікаў з іншых гарадоў. Пасля запрашэння да алтара сорак сем маладых людзей прынялі Хрыста і былі адразу ахрышчаныя проста ў Чорным Моры, як у біблійныя часы. Пасля дзесяцігоддзяў камуністычнае дыктатуры, не маючы ні Бібліяў, ні іншых хрысціянскіх кніг, ні семінарыяў, святары Падпольнае Царквы не могуць быць вучонымі багасловамі. Але ж не быў ім і дыякан Піліп. Але еўнух, з якім ён гутарыў амаль гадзіну, запытаў яго: «Вось вада; што ж перашкаджае мне ахрысціцца? І сказаў Піліп: Калі веруеш з усяго сэрца, дык можна. (...) І зыйшлі абодва ў ваду, Ліліп з еўнухам, і ахрысціў яго» (Дз. 8:36-38). У Чорным Моры досыць вады, і Падпольная Царква аднавіла звычаі біблійнага часу. «Учительская газета» ад 23 жніўня 1966 г. паведаміла, што на вуліцах Растова-на-Доне баптысты выйшлі на дэманстрацыю, адмаўляючыся зарэгістраваць сваю абшчыну і падпарадкоўвацца так званым «кіраўнікам», прызначаным камуністамі. Падзея адбылася першага мая. Як Ісус чыніў цуды ў суботу, кідаючы выклік сваім апанентам-фарысеям, так і Падпольная Царква часам абірае камуністычныя святы, каб кінуць выклік камуністычным законам. Першага мая камуністы заўсёды ладзяць вялікія дэманстрацыі, на якія выганяюць усіх і кожнага. Але ў гэты дзень на вуліцы

выйшла і другая вялікая сіла ў Расеі – Падпольная Царква. Дэманстрантаў сабралася паўтары тысячы. Іх вяла любоў да Бога. Яны ведалі, што рызыкуюць свабодай і што ў турме іх чакаюць голад і катаванні. Кожны вернік у Расеі ведаў «Сакрэтнае паведамленне», выпушчанае хрысціянамі-евангелістамі з Барнаулу, дзе апісвалася, як сястра Хмара з вёскі Кулунда атрымала вестку, што яе муж памёр у турме. Яна засталася ўдавою з чатырма малымі дзецьмі на руках. Атрымаўшы мужава цела, яна ўбачыла ў яго на руках сляды кайданкаў. Рукі, пальцы і ступні страшна абгарэлі. На жываце былі сляды ад нажа. Правая нага распухла. На абедзьвюх нагах былі сляды збіцця. Усё цела было зранена. Кожны, вернік, які выйшаў на дэманстрацыю ў Растове-на-Доне, ведаў, што і з ім можа быць гэтак. Але гэта іх не спыніла. Ведалі яны, праўда, і тое, што на пахаванне гэтага мучаніка, які аддаў жыццё за Хрыста ўсяго праз тры месяцы пасля свайго навярнення, прыйшло мноства вернікаў з плакатамі: «Бо для мяне жыццё – Хрыстос, і смерць – набытак» (Флп. 1:21). «Не бойцеся тых, што забіваюць цела, а душы не могуць забіць» (Мц. 10:28). «Убачыў я пад ахвярнікам душы забітых за слова Божае» (Адкр. 6:9). Прыклад гэтага мучаніка натхніў растоўскіх хрысціянаў. Яны сабраліся каля малога дамка. Людзі былі паўсюль – некаторыя на суседніх дахах, іншыя на дрэвах, як евангельскі Закхей. Каля сарака чалавек навярнуліся да Хрыста, збольшага гэта была моладзь, а

23 з іх былі дагэтуль камсамольцамі! Хрысціяне прайшлі цераз увесь горад аж да берагу Дону, дзе нованавернутых ахрысцілі. Міліцыя атачыла вернікаў на беразе, каб арыштаваць завадатараў. (Усіх паўтары тысячы арыштаваць было немагчыма!) Вернікі адразу ўпалі на калені і ў палкай малітве прасілі Бога абараніць Свой народ і дазволіць ім правесці сённяшнюю службу. Тады браты і сёстры пасталі плячо ў плячо вакол братоў, якія вялі службу, каб не пусціць міліцыю арыштаваць іх... «Учительская газета» паведаміла, што «нелегальная» баптысцкая арганізацыя ў Растове мела падпольную друкарню. (У Расеі баптыстамі называюць і евангелістаў, і пяцідзесятнікаў). Гэтыя падпольныя выданні заклікалі моладзь стаяць за веру і прасілі хрысціян-бацькоў рабіць вельмі слушную, на маю думку, рэч: «вадзіце дзяцей на пахаванні, каб яны зразумелі, што няма сэнсу займацца часовым...». Бацькоў заахвочвалі даваць дзецям хрысціянскую адукацыю як супрацьяддзе ад атэізму, якім іх атручваюць у камуністычных школах. Аўтар артыкулу ў «Учительской газете» задаваўся пытаннем: «Чаму так нясмела, а часам няўмела ўмешваюцца школа, настаўнікі ў жыццё, побыт тых сем'яў, дзе дурманяць, калечаць дзяцей?» Тая ж газета распавядала, што было на судзе над падпольнымі працаўнікамі, якія таемна ахрысціліся: «У судзе ў якасці сведак [яны] паводзілі сябе азлоблена і фанатычна. (...) На судовае паседжанне прыходзілі і некаторыя дзяўчаты, якія з захапленнем глядзелі на

абаронцаў і непрыязна пазіралі на атэістычна настроеную публіку». Вернікі Падпольнае Царквы пайшлі на рызыку збіцця і турмы, заклікаўшы да свабоды перад будынкам ЦК КПСС. Мы маем дакумент, перададзены на Захад тайнымі шляхамі. Ён паходзіць з «нелегальнае» Рады Цэркваў Евангельскіх хрысціян-баптыстаў Савецкага Саюзу (у процілегласць падкантрольнай камуністам «Усесаюзнай Радзе Евангельскіх хрысціян-баптыстаў» на чале са здраднікам Каравым (Карев), што ўсхваляў гуманнасць арганізатараў масавых забойстваў хрысціян і «свабоду», якая пануе ў СССР). У дакуменце паведамляецца пра яшчэ адну гераічную дэманстрацыю, гэтым разам у самой Маскве. Вось яго пачатак: «Пільнае паведамленне. Умілаваныя Браты і Сёстры, ласка вам і мір ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста. Спяшаемся паведаміць вам, што дэлегаты цэркваў Евангельскіх хрысціян-баптыстаў, лікам 500, якія прыехалі ў Маскву 16 мая 1966 г. дзеля звароту ў цэнтральныя органы ўлады, прыйшлі да будынку ЦК КПСС з просьбаю, каб іх прынялі і выслухалі. Мы падалі просьбу на імя Генеральнага Сакратара Брэжнева». Далей паведамляецца, што пяцьсот чалавек цэлы дзень прастаялі перад будынкам. Гэта была першая ў Маскве публічная дэманстрацыя супроць камунізму. І яе правяла дэлегацыя Падпольнае Царквы. Пад канец дня яны перадалі на імя Брэжнева другую петыцыю, у якой скардзіліся, што нейкі «таварыш» Строганаў адмовіўся перадаць іх прось-

бу Брэжневу і пагражаў ім. Пяцьсот дэлегатаў засталіся на вуліцы на ўсю ноч, хоць ліў дождж. Нягледзячы на лаянку і бруд з-пад колаў машын, якія праязджалі паўз іх, яны дастаялі перад ЦК КПСС аж да ранку! Наступнага дня ім прапанавалі ўвайсці ў будынак і сустрэцца з нейкімі дробнымі чыноўнікамі. Але «ведаючы, што вернікаў, якія прыходзілі да ўладаў, часта збівалі, калі яны заходзілі ў будынак, дзе не было сведкаў, яны аднадушна адмовіліся і працягвалі чакаць прыёму ў Брэжнева». Тады адбылося непазбежнае. А гадзіне 13:45 пад'ехала дваццаць восем аўтобусаў і пачалася жорсткая расправа над вернікамі. «Мы сталі ў кола і, трымаючыся за рукі, запяялі гімн «Найлепшыя дні нашага жыцця – дні, калі мы можам несці крыж». Гэбэшнікі пачалі біць нас, маладых і старых. Яны выцягвалі людзей з шэрагаў і білі па твары і галаве, а потым кідалі аб асфальт. Некаторых братоў яны цягнулі ў аўтобус за валасы. Тых, хто спрабаваў ўцячы, білі да страты прытомнасці. Напхаўшы аўтобусы вернікамі, паліцыя павезла іх невядома куды. З гэбэшных аўтобусаў былі чуваць спевы нашых братоў і сёстраў. Усё гэта адбывалася на вачах у мноства людзей». Потым быў здзейснены не менш прыгожы чын. Пасля таго, як пяцьсот чалавек былі арыштаваныя і напэўна катаваныя, браты Г. Вінс і Хораў, сапраўдныя пастыры статку Хрыстовага, асмеліліся прыйсці ў той жа ЦК КПСС – падобна як Ісус пасля арышту Яна Хрысціцеля пачаў сваю

публічную пропаведзь на тым жа месцы і тымі ж словамі, за якія пацярпеў Ян Хрысціцель: «Пакайцеся, бо наблізілася царства нябеснае» (Мц. 4:17). Вінс і Хораў запыталі, дзе цяпер арыштаваныя дэлегаты, і запатрабавалі іх вызваліць. Двое гэтых адважных братоў папросту прапалі. Пазней прыйшла вестка, што іх пасадзілі ў Лефортава. Ці баяліся за сябе гэтыя хрысціяне з Падпольнае Царквы? Не! Адразу пасля падзеяў іх браты зноў паставілі на карту сваю свабоду, апублікаваўшы маніфест, які ляжыць зараз перад намі і ў якім выкладаюцца апісаныя вышэй падзеі. У ім прыгадваюцца словы Бібліі: «Бо вам дадзена дзеля Хрыста ня толькі верыць у Яго, але і мучыцца за Яго» (Флп. 1: 29). Маніфест намаўляе братоў, «каб ніхто не пахіснуўся ў смутках гэтых: бо вы самі ведаеце, што на гэта мы пастаўлены» (1 Фес. 3:3). Ён цытуе Пасланне да Габраяў (12:2), заклікаючы вернікаў пазіраць «на пачынальніка і завяршыцеля веры, Ісуса, Які замест радасці, што была перад ім, перацярпеў крыж, ня дбаючы аб сорам». Падпольная Царква адкрыта паўставала супроць атэістычнага атручвання моладзі ў Растове, у Маскве і па ўсёй Расеі. Яна змагалася супроць камуністычнае атруты і здрадлівых лідэраў афіцыйнае царквы, пра якіх у адным з тайных маніфестаў пісалася: «У нашы дні Сатана дыктуе, а «царква» прымае пастановы, супярэчныя з Божымі прыказаннямі» (пададзена ў газеце «Правда Украіни» ад 4 кастрычніка 1966 г.). «Правда Востока»

апублікавала справаздачу з суду над братамі Аляксеем Няверавым, Барысам Гармашовым і Аксёнам Зубавым, якія арганізоўвалі групавыя праслухоўванні евангельскіх перадач з Амерыкі. Яны запісвалі перадачы на магнітафон і пускалі запісы па руках. Іх абвінавацілі і ў тым, што пад выглядам «экскурсіяў» і «гурткоў мастацкай самадзейнасці» яны наладжвалі тайныя евангельскія сходы. Вось жа, Падпольная Царква працуе акурат як першыя хрысціяне ў рымскіх катакомбах. «Советская Молдавия» ад 15 верасня 1966 г. пісала, што Падпольная Царква друкавала брашуры на ратапрынце. Яе вернікі збіраліся ў грамадскіх месцах, хоць гэта забаронена законам, і, ходзячы з месца на месца, сведчылі аб Хрысце. Тая ж газета паведамляе, як у цягніку «Рэні-Кішынёў» трое хлопчыкаў і чатыры дзяўчынкі спявалі хрысціянскі гімн «Аддамо нашу юнасць Хрысту». Рэпарцёр абураўся, што вернікі прапаведуюць «на вуліцах, на вакзалах, у цягніках, аўтобусах і нават у дзяржаўных установах». І гэта таксама праца Падпольнае Царквы. Калі на судзе над гэтымі хрысціянамі быў абвешчаны прысуд за публічнае спяванне хрысціянскіх гімнаў, асуджаныя ўкленчылі і сказалі: «Адаемся ў рукі Божыя. Дзякуем Табе, Божа, што Ты дазволіў нам пацярпець за веру». І прысутныя, на чале з «фанатыкам» Маданам, заспявалі ў залі суду той самы гімн, за які іх братоў толькі што асудзілі на турму і пакуты. Першага мая хрысціяне вёсак Копчаг і Захараўка, дзе не было цэркваў,

праводзілі патаемную службу ў лесе. Пад выглядам дзён нараджэння яны ладзілі сходы. (Шмат якія хрысціянскія сем'і з чатырох-пяці чалавек адзначалі штогод да трыццаці пяці «дзён нараджэння», якімі прыкрываліся тайныя сходы). Ні турма, ні катаванні не пужаюць хрысціянаў з Падпольнае Царквы. Як і ў першых хрысціян, пярэследы толькі паглыбляюць іх адданасць. «Правда Украіни» ад 4 кастрычніка 1966 г. пісала пра брата Пракоф'ева – аднаго з лідэраў расейскае Падпольнае Царквы – што ён ужо тройчы сядзеў у турме, але як толькі яго выпускалі, ён зноў пачынаў арганізоўваць патаемныя нядзельныя школкі і яго зноў арыштоувалі. У падпольным маніфесце ён пісаў: «Падпарадкоўваючыся чалавечым пастановам, афіцыйная царква пазбавіла сябе Божае ласкі». І калі вы чуеце пра брата, якога пасадзілі ў турму ў паняволенай краіне, не трэба ўяўляць сабе турму заходняга тыпу. Тут турма азначае голад, катаванні і прамыўку мазгоў. Часопіс «Наука и религия» № 9 за 1966 г. паведамляў, што хрысціяне распаўсюджваюць евангельскую літаратуру пад вокладкай часопісу «Огонёк» – выдання накшталт «Look» альбо «Time». Яны ж раздавалі кнігі, дзе пад вокладкай ад рамана Льва Талстога «Анна Каренина» хаваліся біблійныя тэксты. Да таго ж, вернікі прылюдна спявалі хрысціянскія песні. На матыў «Інтэрнацыяналу» яны спявалі хвалу Хрысту («Казахстанская правда», 30 чэрвеня 1966 г.). У тайным лісце, складзеным у Кулундзе (Сібір), хры-

сціяне цвердзяць, што афіцыйнае «баптысцкае» кіраўніцтва «вынішчыла царкву і яе сапраўдных слуг, гэтаксама як першасвятары, кніжнікі і фарысеі выдалі Ісуса Хрыста Пілату». Але верная Падпольная Царква не здаецца! Нявеста Хрыстова надалей служыць свайму Жаніху. Самі камуністы прызнаюць, што Падпольная Царква здабывае камуністаў дзеля Хрыста. Гэта магчыма! «Бакинский рабочий» ад 27 красавіка 1966 г. надрукаваў перахоплены камуністычнымі ўладамі ліст камсамолкі Тані Чугуновай, якая прыйшла да Хрыста. «Дарагая цёця Надзя! Вітаю цябе любоўю Госпада нашага Ісуса Хрыста. Цёця Надзя, як Ён мяне любіць! Мы перад Ім нішто. Цёця Надзя, ты, мабыць, разумееш гэтыя словы: «Любеце ворагаў вашых, слаўце праклінаючых вас, рабеце дабро ненавідзячым вас і малецеся за крыўдзячых вас і пераследуючых вас». Калі гэты ліст трапіў у рукі ўладаў, брат Пётр Сярэбранікаў, які прывёў да Хрыста яе і багата іншых камсамольцаў, быў пасаджаны ў турму. Камуністычная газета падала ўрывак з ягонага казання: «Мы павінны верыць нашаму Збаўцу, як першыя хрысціяне. Для нас асноўны закон – Біблія. Акрамя яе, мы не прызнаем нічога. Трэба спяшацца ратаваць людзей ад грэху, асабліва моладзь». Зазначыўшы, што савецкі закон забараняе расказваць моладзі пра Хрыста, ён дадаў: «Адзіны закон для нас – Біблія». Вось самы нармальны адказ у краіне, дзе пануе жорсткая бязбожная дыктатура. Далей камуністычная газета апісвае

«дзікі» малюнак: «Хлопчыкі і дзяўчынкі пяюць духоўныя гімны. Яны атрымліваюць рытуальны хрост і захоўваюць здрадніцкі запавет «Любі сваіх ворагаў»». Артыкул паведамляе таксама, што багата хлопцаў і дзяўчат з камсамольскім білетам насамрэч хрысціяне! На заканчэнне ён кажа: «Наколькі ж бездапаможная, нудная і цёмная савецкая школа (...) калі пастарам удаецца выхопліваць моладзь з-пад носу ў яе абыякавых выхавальнікаў!» «Казахстанская праўда» ад 30 чэрвеня 1966 г. жахаецца, што найлепшы вучань у школе аказаўся хрысціянінам! «Киргизская правда» ад 17 студзеня 1966 г. цытуе падпольную хрысціянскую ўлётку, звернутую да мацярок: «Злучым нашыя намаганні і малітвы, каб прысвяціць Богу жыццё нашых дзяцей ад самай калыскі! (...) Уратуем нашых дзяцей ад свецкіх уплываў!» Гэтыя намаганні аказаліся плённымі. Камуністычныя газеты сведчаць пра пашырэнне хрысціянства сярод моладзі! Чэлябінская газета апісвае, як камсамолка Ніна стала хрысціянкаю, наведаўшы тайны хрысціянскі сход. «Советская юстиция» № 9 за 1966 г. апісвае такі падпольны сход. «Была поўнач. Хаваючыся, баючыся ўласнага ценю, людзі сыходзіліся з розных бакоў. Браты запоўнілі цёмны пакой з вельмі нізкай столлю. Іх сабралася столькі, што ўкленчыць не было дзе. Ад духаты святло ў газніцы пагасла. З твараў прысутных збягаў пот. На вуліцы адзін са служак Божых вартаваў ад міліцыі». Ніна казала, што на такім сходзе яе прынялі з абдымкамі, цеп-

лынёй і шчырасцю. «У іх, як у мяне цяпер, была вялікая і прасветленая вера – вера ў Бога. Ён бярэ нас пад Сваю ахову. Няхай знаёмыя камсамольцы прамінаюць мяне, не вітаючыся! Няхай глядзяць на мяне з пагардаю і кідаюць, як удар біча, «Баптыстка!» Няхай! Яны мне не патрэбныя». І шмат іншых маладых камуністаў пастанавілі, як яна, служыць Хрысту да канца. «Казастанская праўда» за 18 жніўня 1967 г. апісвала суд над братамі Класенам, Бондарам і Цялегіным. Які яны атрымалі прысуд, не паведамляецца, але злачынства названа: яны навучалі дзяцей пра Хрыста. «Советская Киргизия» ад 15 чэрвеня 1967 скардзілася, што хрысціяне «прымушаюць выкарыстоўваць супроць іх адміністрацыйныя захады». Вось жа, нявінныя камуністычныя ўлады, якіх упартыя хрысціяне, не жадаючы заставацца на волі, прымушаюць сябе арыштоўваць, затрымалі яшчэ адну групу. Іх злачынства палягала ў валоданні нелегальнай друкарняй з пятнаццацьма гектографамі і шасцю пераплётнымі машынамі, на якіх выпускалася хрысціянская літаратура «Правда» ад 21 лютага 1968 г. напісала пра выкрыццё тысяч жанчын і дзяўчат, якія насілі «ахоўныя паясы» з атласных і шаўковых стужак з надрукаванымі на іх псальмамі і малітвамі. Улады правялі вышук і выявілі, што гэтую моду, якую не шкодзіла б пераняць і на Захадзе, завёў хрысціянін Стасюк з Люберцаў, міліцыянер. Газета паведаміла пра ягоны арышт. Адказы, якія даюць перад камуніс-

тычным судом хрысціяне з Падпольнае Царквы, натхняе Святы Дух. Адзін суддзя запытаў: «Чаму вы зацягвалі людзей у вашую забароненую секту?» Сястра-хрысціянка адказала: «Нашая мэта – здабыць увесь свет дзеля Хрыста». «Вашая вера антынавуковая», кпіў суддзя на яшчэ адным працэсе, на што абвінавачаная – дзеўчына-студэнтка – адказала: «Вы лепш разбіраецеся ў навуцы, чым Эйнштэйн? Чым Н'ютан? А яны верылі ў Бога. Наш сусвет носіць імя Эйнштэйна. Мяне ў інстытуце вучылі, што ён называецца Эйнштэйнаўскі сусвет. Эйнштэйн пісаў: «Калі мы ачысцім юдаізм ад прарокаў і хрысціянства, як яму навучаў Ісус, ад усяго пазнейшага, мы атрымаем рэлігію, якая можа збавіць свет ад усіх сацыяльных няшчасцяў. Святы абавязак кожнага чалавека – зрабіць усё, што ў яго сілах, каб наблізіць трыумф гэтае рэлігіі». А памятаеце нашага вялікага фізіёлага Паўлава? Або ў нашых кніжках не напісана, што ён быў хрысціянінам? Нават Маркс у прадмове да «Капіталу» пісаў: «Хрысціянства, асабліва ў яго пратэстанцкай форме, – ідэальная рэлігія для перараробкі асобы, знявечанае грэхам». І я таксама была знявечана грэхам. Маркс навучыў мяне стаць хрысціянкаю і перарабіць сябе. Як вы, марксісты, можаце судзіць мяне за гэта?» Суддзі, які пачуў гэта, адабрала мову. На такі ж закід аб антынавуковасці рэлігіі адзін хрысціянін адказаў перад судом: «Я думаю, грамадзянін суддзя, што вы не такі вялікі вучоны, як Сімпсан, які адкрыў хлараформ

і шмат іншых лекаў. Але калі Сімпсана запыталі, што ён лічыць сваім найбольшым адкрыццём, ён адказаў: «Гэта не хлараформ. Маё найвялікшае адкрыццё было тое, што я грэшнік і што я магу быць збавёны Божаю ласкай». Жыццё, самаахвярнасць, кроў, якую вернікі гатовы праліць за сваю веру – найвялікшы аргумент за хрысціянства, які прапануе Падпольная Царква. Вялікі афрыканскі місіянер Альберт Швейцар назваў гэта «святою супольнасцю тых, хто нясе пячатку болю» – супольнасцю, да якой належаў і Ісус, «муж болесцяў». Падпольную Царкву яднае повязь любові да свайго Збаўцы. Тая ж повязь лучыць вернікаў у царкве міжсобку. Ніхто ў свеце не ў сілах іх адолець. У лісце, таемна перададзеным за мяжу, Падпольная Царква піша: «Мы молімся не аб тым, каб стаць лепшымі хрысціянамі, а аб тым, каб стаць тымі адзінымі хрысціянамі, якімі Бог хоча нас бачыць: хрысціянамі, падобнымі да Хрыста, гэта значыць хрысціянамі, якія з гатоўнасцю нясуць крыж дзеля славы Божае». Са змяінай мудрасцю, як вучыў Хрыстос, хрысціяне заўсёды адмаўляліся назваць на судзе сваіх лідэраў. «Правда Востока» ад 15 снежня 1966 г. пісала, як падсудная Марыя Шаўчук адказала на пытанне, хто прывёў яе да Хрыста: «Бог прывёў мяне ў Ягоную грамаду». Іншая верніца на пытанне «Хто ваш кіраўнік?» адказала: «У няс няма кіраўніка сярод людзей». Калі ў хрысціянскіх дзяцей пыталіся: «Хто навучыў вас выйсці з піянераў і зняць чырвоны гальштук?» –

яны адказвалі: «Мы самі гэта зрабілі. Нас ніхто не вучыў». Хоць дзе-нідзе «вяршыня айсбергу» паказваецца на паверхні, у іншых месцах хрысціяне практыкавалі самахрост, каб іх лідэраў не арыштавалі. Часам хрост адбываецца ў рацэ, прычым абодва ўдзельнікі абраду прыходзяць пад маскамі, каб іх нельга было пазнаць на фатаздымках. «Учительская газета» ад 30 студзеня 1964 г. пісала пра лекцыю навуковага атэізму ў вёсцы Вароніна Сонечнагорскага раёну Маскоўскае вобласці. Як толькі лектар скончыў, «пасыпаліся пытанні. Прычым асабліва шчыравалі распаўсюднікі рэлігійных поглядаў». На гэтыя пытанні лектару не было чаго адказаць. Хрысціяне пыталіся: «Чым адрозніваюцца запаведзі царквы ад прынцыпаў камуністычнае маралі? (...) Бо і царква ж кажа: «Не забі», «не ўкрадзі», «узлюбі бліжняга», і ў маральным кодэксе таксама сказана: «Чалавек чалавеку друг, таварыш і брат». Так хрысціяне паказалі лектару, што ўсе гэтыя прынцыпы паходзяць з Бібліі, з якой змагаюцца камуністы. Лектар збянтэжыўся, і лекцыя скончылася перамогаю вернікаў!

### Пярэслед Падпольнае Царквы расце

У некаторых былых савецкіх рэспубліках хрысціян пераследуюць аж дагэтуль. Па ўсім свеце ў паняволеных краінах хрысціяне Падпольнае Царквы пакутуюць сёння больш, чым калі раней. Колькасць хрысціян, замучаных у 1997 г., ацэньваецца ў

160000 чалавек. Хрысціянам крояць сэрца весткі аб прыгнёце габраяў у камуністычных краінах. Але асноўная мішэнь пярэследу там – Падпольная Царква. Шмат гадоў назад савецкі друк паведамляў пра хвалю масавых арыштаў і судоў. У адным месцы восемдзесят два чалавекі хрысціян было пасаджана ў вар'яцкі дом. Дваццаць чатыры з іх праз лічаныя дні памерлі ад «працяглай малітвы»! З якой гэта пары малітва забівае? Уявіце сабе, праз што яны прайшлі! А калі бацькоў ловяць на тым, што яны расказвалі дзецям пра Хрыста, дзяцей забіраюць у іх назаўсёды – не дазваляючы наведваць іх. У камуністычную эру Савецкі Саюз падпісаў дэкларацыю ААН «супроць дыскрымінацыі ў адукацыйнай сферы», якая патрабавала: «Бацькі павінны мець права забяспечыць рэлігійнае і маральнае выхаванне дзяцей згодна з уласнымі перакананнямі». У адным з артыкулаў здраднік Караў, які ўзначальваў афіцыйную Ўсесаюзную Раду Евангельскіх хрысціян-баптыстаў, сцвярджаў, што гэтае права было ў Расеі рэальным – і дурні яму верылі! Цяпер паслухайма, што піша савецкі друк. 4 чэрвеня 1963 г. «Советская Россия» апавядала, як у баптысткі Макрынкавай адабралі яе шасцёх дзяцей, бо яна вучыла іх хрысціянскай веры і забараняла насіць піянерскі гальштук. Пачуўшы прысуд, яна сказала толькі: «Я цярплю за веру». І яе прымусілі плаціць за ўтрыманне дзяцей, якіх забралі ад яе, каб труціць атэізмам. Хрысціянскія матулі, задумайцеся пра яе пакуты! Апостал Павел

казаў: «Усё памагае на дабро» (Рым. 8:28). Я бачыў дзяцей, выгадаваных хрысціянамі, якіх забралі ад бацькоў і паслалі ў камуністычныя школы. Веру, якую яны засвоілі ўдома, не ўдалося атруціць атэізмам, яна шырылася на іншых дзяцей! Біблія кажа: «хто любіць сына ці дачку балей за Мяне, не варт Мяне» (Мц. 10:37). Гэтыя словы маюць адмысловы сэнс у забраных краінах. Паспрабуйце пражыць тыдзень, не бачыўшы сваіх дзяцей! І вы пазнаеце пакуты нашых братоў у паняволеных краінах. Згодна з газетай «Знамя юности» (29 сакавіка 1967) Вячаслава Сыча забралі ад маці толькі таму, што яна трымала яго ў страху Божым. У сп-ні Забавінай з Хабараўску забралі сірату-ўнучку Таню, бо тая давала ёй «вычварнае» [хрысціянскае] выхаванне» («Советская Россия» 13 студзеня 1968 г.). Пазбаўленне хрысціян бацькоўскіх правоў працягваецца ў паняволеных краінах аж дагэтуль. Казаць толькі аб пратэстанцкай падпольнай Царкве было б няшчыра. Праваслаўныя ў Расеі цалкам змяніліся. Мільёны іх прайшлі праз турмы, дзе ў іх не было ні пацерак, ні распяццяў, ні ікон, ні свечак. Свецкіх трымалі ў турмах без штатнага святара. У святароў-вязняў не было ні рызаў, ні хлеба і віна для літургіі, ні міра, ні малітаўнікаў. І яны агледзеліся, што можна абыйсціся і без усяго гэтага, звяртаючыся з малітвай наўпрост да Бога. Яны маліліся, і Бог пасылаў ім Духа Святога. Сярод расейскіх праваслаўных пад камуністамі адбылося сапраўднае духоўнае абуджэнне, вельмі падобнае

да таго, якое зазналі першыя хрысціяне. У Расеі, як і ў краінах савецкага блоку, існавала праваслаўнае падполле, якое насіла евангелічны, фундаментальны характар і было вельмі блізкае да Бога. Яно захавала, і то ў сілу прывычкі, вельмі мала з праваслаўнага рытуалу. Гэтае праваслаўнае падполле таксама дало сваіх мучанікаў. Хто скажа, што сталася са старым архіяпіскапам Калужскім Ермагенам? Ён асмеліўся пратэставаць супроць здрадніцкага супрацоўніцтва паміж Патрыярхіяй і бязбожным камуністычным урадам. Усе семдзесят гадоў камуністычнага панавання, аж да распаду Савецкага Саюзу напачатку 1990-х гг., расейскі друк быў повен сведчанняў пра ўсё новыя перамогі Падпольнае Царквы. Яна прайшла праз невымоўныя цяжкасці, але захавала веру – і нават вырасла! Мы ў Румыніі сеялі семя Божага слова, таемна працуючы ў расейскай арміі. Так рабілі і іншыя ў Расеі і іншых краінах, захопленых расейцамі. Гэтае семя прынесла багаты плён. Здабыць дзеля Хрыста можна і камуністычную Азію, і іншыя забраныя краіны. Хрысціянамі могуць стаць і нашыя праціўнікі, і тыя, каго яны ўціскаюць, – калі толькі мы дапаможам. Доказ маёй слушнасці ў тым, што Падпольная Царква квітнела пад камунізмам у Савецкім Саюзе, квітнее ў камуністычнай Азіі і расце сёння на Сярэднім Усходзе. Каб паказаць хараство нашых братоў-хрысціян у жахлівых умовах, я падам некалькі лістоў ад расейскае дзеўчынкі, з якіх апошнія два напісаныя з турмы.

## Як камсамолка знайшла Хрыста

Ніжэй падаюцца тры лісты хрысціянкі Марыі, якая прывяла да Хрыста камсамолку Вару.

*Першы ліст*

...Я ўсё яшчэ жыву тут. Мяне ўсе любяць, і сярод іх адна камсамолка, Вара. Яна нядаўна сказала мне: «Не разумею, што ты за чалавек – усе цябе зневажаюць, а ты ўсіх любіш». Я адказала, што Бог вучыць нас любіць усіх, не толькі сяброў, а і ворагаў. Раней гэтая дзеўчынка рабіла мне многа зла, але я малілася за яе асабліва старанна. Калі яна запытала мяне, ці магу я палюбіць і яе, я абняла яе, і мы абедзьве заплакалі. Цяпер мы молімся разам. Калі ласка, памаліцеся за яе. Калі чуеш, як людзі ўголас адмаўляюць Бога, можа здацца, што яны сапраўды так думаюць. Але жыццё паказвае, што шмат хто з іх, кленучы Бога вуснамі, мае ў сэрцы вялікую тугу па Ім. І тады чуваць стогн іхных сэрцаў... Яны нечага шукаюць і прыкрываюць бязбожжам сваю ўнутраную паражнечу. Ваша сястра ў Хрысце, Марыя.

*Другі ліст*

У папярэднім лісце я пісала вам пра дзеўчынку-атэістку Вару. Цяпер спяшаюся расказаць вам, мае дарагія, пра нашую вялікую радасць: Вара прыняла Хрыста як свайго асабістага Збаўцу, і цяпер адкрыта сведчыць пра гэта ўсім. Уверыўшы ў Хрыста і пазнаўшы радасць збавення, яна ўсё ж

чулася ніякава, бо раней паўсюль казала, што Бога няма. Цяпер яна пастанавіла загладзіць сваю віну. Мы пайшлі з ёю разам на сход бязбожнікаў. Я ёй раіла стрымлівацца, але дарма. Яна мяне не паслухала. Калі адспявалі камуністычны гімн (Вара яго не спявала), яна папрасіла слова, выйшла наперад і смела, з вялікім пачуццём пачала казаць пра Хрыста як свайго Збаўцу і прасіла ранейшых таварышаў дараваць ёй, што яна, духоўна сляпая, не бачыла дагэтуль, што сама ідзе да згубы і вядзе за сабою іншых. Яна заклікала ўсіх кінуць шлях граху і прыйсці да Хрыста. Усе маўчалі, ніхто яе не перапыніў. На заканчэнне яна праспявала сваім прыгожым голасам хрысціянскі гімн «Я не саромлюся абвяшчаць памерлага Хрыста, Яго загады бараніць і моц Ягонага крыжа». А потым... потым нашу Вару павялі... Сёння дзевятага мая. Мы нічога пра яе не ведаем. Але Бог мае сілу, каб яе зберагчы. Маліцеся за яе! Ваша Марыя.

*Трэці ліст*

Учора, другога жніўня, я гутарыла ў турме з нашай дарагой Вараю. Мне сэрца крывёй абліваецца, як падумаю пра яе. Яна ж яшчэ зусім дзіця, ёй усяго 18, і як верніца Божая яна таксама духоўнае немаўля. Але яна любіць Госпада ўсім сэрцам, хоць і адразу ўзыйшла на цярністы шлях. Небарака галадае, а нашы перадачы да яе не даходзяць. Учора яна стаяла перада мною схуднелая, бледная, збітая. Толькі вочы ззялі мірам Божым і

незямною радасцю. Так, дарагія мае, тыя, хто не зазнаў цудоўнага Божага міру, гэтага не зразумее... Але якія ж шчаслівыя тыя, хто мае гэты мір... Іх не спыняць ніякія пакуты. Я запытала праз жалезныя краты: «Вара, ты не шкадуеш аб тым, што зрабіла?» «Не, – адказала яна, – калі мяне выпусцяць, я зноў буду казаць пра вялікую любоў Хрыста. Не думай, што я пакутую. Я вельмі рада, што Бог так мяне любіць і дае мне радасць цярпець у імя Яго». Калі ласка, маліцеся за яе. Яе, напэўна, сашлюць у Сібір. У яе забралі адзежу і ўсе рэчы. Яна засталася ў чым стаіць. У яе няма сваякоў, і трэба сабраць самае неабходнае. Я адклала тыя грошы, што вы мне пераслалі, і калі Вару будуць высылаць, перадам ёй. Веру, што Бог умацуе яе і дапаможа вытрываць у будучыні. Захавай яе Божа! Ваша Марыя.

*Чацвёрты ліст*

Дарагая Марыя, нарэшце я магу табе напісаць. Нас прывезлі ў лагер [...]. Гэта за дзесяць кіламетраў ад гораду. Наша жыццё я не магу апісаць, ты ведаеш, чаму. Толькі трохі пра сябе. Дзякуй Богу, Ён даў мне здароўе і я магу працаваць. Мы з сястрой Х працуем у майстэрні на станках. Праца цяжкая, і ў сястры Х здае здароўе. Я мушу рабіць за нас абедзьвюх. Сканчаю сваё і дапамагаю сястры. Робім па 12-13 гадзін штодзень. Кормяць кепска, як і ў вас. Але я не пра гэта хацела напісаць табе. Маё сэрца любіць Бога і дзякуе Яму, што Ён па-

казаў мне праз Цябе шлях да збавення. На гэтым шляху маё жыццё мае мэту, і я ведаю, куды іду і за што цярплю. Мне хочацца расказваць кожнаму пра вялікую радасць збавення, якую я нашу ў сэрцы. Хто можа разлучыць нас з любоўю Бога ў Хрысце? Нішто і ніхто. Ні турма, ні пакуты. Цярпенні, якія Бог нам пасылае, толькі ўмацоўваюць нас у веры ў Яго. Маё сэрца перапоўнена Божаю ласкай. На працы мяне ганяць і даюць цяжэйшыя заданні, але я не магу маўчаць і ўсім кажу пра тое, што Бог зрабіў для мяне. Ёнператварыў мяне ў новага чалавека, новае стварэнне, адвёў ад шляху згубы. Ці ж магу я маўчаць пасля гэтага? Не, ніколі! Пакуль вусны могуць прамаўляць, я буду сведчыць кожнаму пра Яго вялікую любоў. Па дарозе ў лагер мы спатыкалі багата братоў і сёстраў у Хрысце. Як хораша, ўпершыню пабачыўшы брата або сястру, адчуваць праз Святы Дух, што мы дзеці Божыя. Гаварыць няма патрэбы. Іх пазнаеш з першага позірку. Калі мы ехалі ў лагер, на адной станцыі падыйшла жанчына, дала нам ежы і сказала толькі два словы: «Жыве Бог». У першы вечар у лагеры нас павялі ў баракі-зямлянкі. Мы прывіталіся: «Мір вам!», і, на нашую вялікую радасць, з усіх куткоў раздалося: «Прымаем з мірам!» Мы адразу адчулі сябе нібыта ў сям'і. І гэта так і ёсць. Больш за палову вязняў верацЬ у Бога. Сярод нас ёсць выдатныя спевакі і знаўцы Евангелля. Увечары, калі ўсе збіраюцца пасля цяжкое працы, як жа хораша правесці хоць хвілінку разам у малітве ля ног нашага Збаўцы.

З Хрыстом усюды свабода. Я вывучыла тут багата прыгожых спеваў, і Бог штодзень дае мне яшчэ больш Свайго Слова. Мой дзевятнаццаты дзень нараджэння я ўпершыню святкавала як дзень нараджэння для Хрыста. Я ніколі не забуду гэтага цудоўнага дня! Мы цэлы дзень мусілі працаваць, але некаторым з нашых братоў удалося прабрацца на рэчку паблізу. Там яны прабілі палонку і падрыхтавалі месца, дзе ўночы – згодна са Словам Божым – сямёра братоў і я атрымалі хрост. Якая я цяпер шчаслівая і як мне хочацца, каб і ты, Марыя, была са мной, каб я магла сваёй любоўю хоць трошкі загладзіць тое зло, што я табе раней рабіла. Але Бог ставіць кожнага з нас на Сваё месца, і мы мусім моцна стаяць там, дзе Бог нас паставіў. Прывітай усю сям'ю дзяцей Божых. Бог дабрасловіць вашую супольную працу, як Ён дабраславіў мяне. Перачытай пасланне да Габраяў 12:1-3. Усе нашыя сёстры і браты вітаюць цябе і ўсе рады, што твая вера ў Бога такая моцная і што ты няспынна славіш Яго ў сваіх цярпеннях. Калі будзеш пісаць да іншых, перадай ім нашыя віншаванні. Твая Вара.

*Пяты ліст*

Дарагая Марыя, нарэшце я знайшла магчымасць напісаць табе пару радкоў. З ласкі Божае мы з сястрою Х здаровыя і добра чуемся. Цяпер мы ў [...]. Дзякуй за твой матчын клопат пра мяне. Мы атрымалі ўсё, што вы нам падрыхтавалі. Дзякую за

самае каштоўнае – за Біблію. Дзякуй усім. Як будзеш ім пісаць, перадай ад мяне прывітанне і падзяку за ўсё, што яны для нас зрабілі. Ад тых дат, як Бог адкрыў мне глыбокую таямніцу Сваёй святой любові, я лічу сябе найшчаслівейшай у свеце. Пярэследы, якія я мусіла вынесці, я лічу асабліваю ласкай. Я рада, што Бог даў мне з першых дзён маёй веры вялікае шчасце цярпець за Яго. Маліцеся за мяне, каб я засталася вернаю Богу да канца. Няхай Бог захавае вас усіх і ўмацуе для святога змагання. Мы з сястрою Х цалуем вас усіх. Калі нас перавядуць у [...], можа нам удасца напісаць вам яшчэ. Не бойцеся за нас. Мы радуемся і цешымся, бо нагарода нашая на небе вялікая. Твая Вара.

Гэта апошні ліст ад Вары – маладой камсамолкі, якая знайшла Хрыста, сведчыла пра Яго і была за гэта асуджана на рабскую працу. Больш вестак ад яе не было, але яе прыгожая любоў і сведчанне аб Хрысце адлюстроўвае духоўнае хараство пакутнае, вернае Падпольнае Царквы.

*Раздзел 7*

## ЧЫМ МОГУЦЬ ДАПАМАГЧЫ ЗАХОДНІЯ ХРЫСЦІЯНЕ

Мяне называюць «голасам Падпольнае Царквы». Я не чуюся вартым гэтага шляхотнага найменння. Аднак у камуністычных краінах я шмат гадоў кіраваў адной з яе частачак. Цудоўным чынам я выжыў праз чатырнаццаць гадоў турмы і катаванняў, у тым ліку правёўшы два гады ў «камеры смерці». Яшчэ большы цуд той, што Бог палічыў патрэбным сыйсці ў гэтую турму і вызваліць мяне адтуль. Падпольная Царква ў Румыніі пастанавіла, каб я пакінуў краіну і перадаў вестку ад яе вольным хрысціянам усяго свету. Цудоўным чынам нам з сям'ёй ўдалося выехаць, і я змог споўніць абавязак, даручаны мне тымі, хто застаўся працаваць, рызыкаваць, цярпець і паміраць у дзесятках паняволеных краін. Я гавару ад імя маіх братоў, што ляжаць у нязлічаных безыменных магілах. Я гавару ад імя маіх братоў, якія сустракаюцца цяпер таемна ў лясах, падвалах, на гарышчах і пад. Вось вестка, якую я прынес ад Падпольнае Царквы: «Не пакідайце нас!» «Не забывайце нас!» «Не скідайце нас з рахунку!» «Дайце нам, чым працаваць!» Гэтую вестку мне даручылі перадаць вольнай Царкве. Я кажу ад імя Падпольнае Царквы, маўклівае Царквы, «нямое» Царквы, якая не мае голасу, каб гаварыць. Пачуйце стогны вашых братоў і сясцёр у паняволеных краінах! Яны не просяць прытулку, бяспекі

або лёгкага жыцця. Яны просяць толькі сродкаў, каб процістаяць атручэнню свае моладзі – новага пакалення – атэізмам. Яны просяць Бібліяў, каб пашыраць Слова Божае. Як могуць яны шырыць Слова Божае, калі яго не маюць? Падпольная Царква як хірург, які едзе ў цягніку. Цягнік сутыкнуўся з другім цягнікам і сотні людзей ляжаць, паміраючы, на зямлі, пакалечаныя, параненыя. Хірург ходзіць сярод жывых яшчэ ахвяраў, бядуючы: «Каб жа ў мяне былі інструменты! Каб жа ў мяне былі інструменты!» Гэтымі інструментамі ён мог бы ўратаваць багата жыццяў. Ён меў жаданне – але не меў сродкаў. У такім становішчы цяпер знаходзіцца Падпольная Царква. Яна так прагне аддаць усю,сябе! Яна так прагне даць сваіх мучанікаў! Яна так прагне рызыкаваць гадамі турмы! Але ўся нашая прага нічога не вартая, калі нам няма чым працаваць. Мальба вернае, адважнае Падпольнае Царквы да вас, вольных, такая: «Дайце нам прылады – Евангеллі, Бібліі, літаратуру, дапамогу – а мы зробім усё астатняе!»

### Чым могуць дапамагчы хрысціяне ў вольным свеце

Атэісты – людзі, якія не прызнаюць нябачных крыніц свайго жыцця. Яны не адчуваюць тайны ні ў сусвеце, ні ў жыцці. Хрысціяне найлепш дапамогуць ім не ўздыхамі, а верай, ведучы жыццё ў супольнасці з нябачным Богам. Дапамога – гэта

весці паслядоўна ахвярнае хрысціянскае жыццё. Дапамога – гэта ўздымаць голас пратэсту супроць кожнага выпадку ганенняў. Дапамога – гэта маліцца за ганіцеляў, каб яны змаглі атрымаць збавенне. Такая малітва можа здацца наіўнаю. Мы маліліся за камуністаў, а яны назаўтра ж катавалі нас яшчэ горш, чым раней. Але і малітва Госпада ў Ерусаліме таксама была «наіўнаю». Пасля гэтай малітвы Яго распялі. Але ўсяго праз колькі дзён тыя, хто крычаў «распні, распні!», білі сябе ў грудзі, і ў адзін дзень навярнулася пяць тысяч чалавек. Малітва ніколі не бывае марнаю. Калі яе не прымае той, за каго вы просіце, яна вяртаецца да вас з вялікімі ласкамі. Спаўняючы слова Хрыстова, шмат хрысціян, і я таксама, маліліся за Гітлера і ягоных катаў. І я пераканаНы, што нашая малітва дапамагла перамагчы яго нароўні з кулямі саюзнікаў. Мы павінны любіць бліжняга, як сябе. Камуністы і іншыя прыгнятальнікі – такія ж нашыя бліжнія, як і ўсе астатнія. Яны з'явіліся таму, што не усвядомілі слова Хрыстовага: «Я прыйшоў, каб мелі жыццё і мелі балей» (Ін. 10:10). Хрысціяне яшчэ не данеслі гэтае большае жыццё да кожнага. Некаторыя людзі застаюцца наўзбоч ад усяго, што ёсць вартага ў жыцці. Яны збунтаваліся, стварылі кампартыю і іншыя памылковыя пераконанні. Часта самі ахвяры сацыяльнае несправядлівасці, яны робяцца злымі і жорсткімі. Мы мусім змагацца з імі. Але хрысціяне, нават змагаючыся з ворагам, разумеюць і любяць яго. У тым, што некаторыя людзі жывуць у няспын-

ным бунце, ёсць і нашая віна. Мы вінаватыя прынамсі ў занядбанні свайго абавязку. Гэтае занядбанне мы павінны адкупіць любоўю да іх – што зусім не значыць, быццам яны павінны нам падабацца – і малітвай за іх. Я не такі наіўны, каб верыць, што адна толькі любоў можа вырашыць гэтыя праблемы. Я не раіў бы дзяржаўным уладам вырашаць праблему бандытызму толькі сродкамі любові. Для бандытаў павінны існаваць паліцэйскія сілы, суддзі і турмы, а не толькі пастары. Калі бандыты не каюцца, трэба садзіць іх у турму. Я ніколі не стаў бы процістаўляць хрысціянскую фразеалогію наконт любові належнаму палітычнаму, эканамічнаму, культурнаму змаганню з камуністамі і іншымі тыранамі – тымі ж бандытамі, толькі ў міжнародным маштабе. Бандыт крадзе кашалёк; яны ж забіраюць цэлыя краіны. Але і пастар, і шараговы хрысціянін павінны рабіць усё, што ў іх сілах, каб прывесці да Хрыста краіны, збунтаваныя супраць Бога – якія б злачынствы яны ні ўчынілі. Мы павінны маліцца за іх са зразуменнем.

### Пільна патрабуюцца Бібліі

Яшчэ адзін спосаб дапамогі – пасылаць у камуністычныя краіны Бібліі. Сродкі, каб бяспечна перапраўляць іх за Жалезную Заслону. Яшчэ ў Румыніі я атрымліваў шмат Бібліяў, завезеных у краіну рознымі шляхамі. Няма пытання, як іх пераслаць – было б што перасылаць. Патрэба ў іх

адчайная. Тысячы хрысціян у такіх камуністычных краінах, як Кітай і Паўночная Карэя, дзесяцігоддзямі не бачылі ні Бібліі, ні евангелля. Аднаго дня да мяне прыйшлі двое вельмі брудных сялян. Яны былі наняліся на цэлую зіму капаць мерзлую зямлю, каб зарабіць грошы на старую, патрапаную Біблію і завезці яе да сябе ў вёску. Паколькі я атрымліваў Бібліі з Амерыкі, я змог даць ім не падраны, а навюткі асобнік. Яны не верылі сваім вачам і ўсё намагаліся аддаць мне за яе грошы. Я вядома, адмовіўся, і яны паспяшаліся са Святым Пісаннем назад у вёску. Праз колькі дзён я атрымаў ліст, поўны захаплення і нястрыманай радасці, з падзякаю за Біблію. Яго падпісалі трыццаць вяскоўцаў! Яны акуратна разрэзалі Біблію на трыццаць частак і мяняліся імі паміж хатамі. Жаль браў, калі неяк расеец маліў мяне аб адной старонцы з Бібліі, каб – даслоўна – душу пражывіць. Людзі з радасцю аддавалі за Біблію карову ці казу. Адзін чалавек аддаў свой заручальны пярсцёнак за старую падраную Біблію. Шмат дзяцей ніколі ў жыцці не бачылі каляднае паштоўкі. Калі б да каго яна трапіла, то вакол сабраліся б усе дзеці ў вёсцы, і хто-небудзь са старых расказаў бы ім пра дзіцятка Ісуса, яго нараджэнне ад Дзевы, гісторыю Хрыста і збавення. І ўсё гэта – праз адну-адзінюткую калядную паштоўку! Яшчэ мы друкуем і рассылаем адмысловую літаратуру, для процістаяння атэістычнай атруце, якою кормяць моладзь з дзіцячага садка аж да інстытуту. У СССР камуністы падрыхтавалі «Падручнік навуковага

атэізму» – атэістычную «Біблію». Спрошчаныя яе версіі выкладаюцца дзеткам у дзіцячым садку, а па меры таго, як дзіця расце – усё складанейшыя. Гэтая анты-Біблія спадарожнічае дзіцяці на працягу ўсяго яго дзяцінства і юнацтва – няспынна труцячы яго атэізмам. Мы друкуем і рассылаем «Адказ на падручнік навуковага атэізму» як хрысціянскае проціяддзе ад бязбожнага вучэння. Нашай атручанай моладзі патрэбны адказ – Божы адказ – хрысціянскі адказ – наш адказ! Гэта яшчэ адна рэч, якую вы можаце зрабіць: дапамажыце нам даць кніжкі з малюнкамі і дзіцячыя Бібліі краінам, дзе Бог «па-за законам». Мы павінны «ўзяцца за рукі» з вернікамі Падпольнае Царквы і даць ім грашовыя сродкі для падарожжаў з евангеллем. Гэтулькі з іх «прыкавана» да дому, бо няма грошай на квіткі і на ежу ў дарозе, хоць вёскі за дваццаць-трыццаць кіламетраў марна клічуць іх на тайныя сходы. Маючы штомесячную грашовую дапамогу, яны змогуць адказваць на гэтыя запрашэнні і наведваць далёкія гарады і вёскі са Словам Божым. Усяго некалькі даляраў у месяц могуць справіць сапраўдны цуд! Мы купляем матацыклы в'етнамскім і кітайскім пастарам, якія ездзяць у «забароненыя раёны» сваіх краін, каб падзяліцца Евангеллем. Мы завозім у мусульманскі Бангладэш ровары для евангелістаў, якія сведчаць пра Бога, нягледзячы на вялікую рызыку. Пастары афіцыйных цэркваў, якія з вялікай рызыкай вядуць таемнае паралельнае служэнне, павінны мець дзеля гэтага незалежныя сродкі. Аднае гатоўнасці

рызыкаваць свабодай, ігнаруючы правілы і прапаведуючы евангелле дзецям, моладзі і дарослым, яшчэ недастаткова. Ім патрабуюцца сродкі, каб працягваць сваё плённае тайнае служэнне. Грошы, сабраныя на гэтую мэту, дапамогуць такім вернікам Падпольнае Царквы дзейсна шырыць Евангелле. Евангельскую вестку ў паняволеныя краіны трэба перадаваць і праз радыё. Станцыі ў вольным свеце могуць духоўна жывіць Падпольную Царкву, якой вельмі нестае Хлеба Жыцця. Паколькі камуністычныя ўрады вядуць радыёпрапаганду на кароткіх хвалях, мільёны людзей у камуністычных краінах маюць прыёмнікі, якія ловяць гэтыя перадачы. Для радыёвяшчання на паняволеныя краіны дзверы адчынены, але гэтую працу трэба пашыраць. Падпольная Царква павінна атрымаць духоўную ежу, якую прыносяць гэтыя перадачы. Вось яшчэ адзін спосаб дапамагчы Падпольнай Царкве ў паняволеных краінах.

### Трагедыя сем'яў хрысціянскіх мучанікаў

Нашае дапамогі пільна патрабуюць сем'і хрысціянскіх мучанікаў. Дзесяткі тысяч такіх сем'яў невымоўна пакутуюць. Калі верніка Падпольнае Царквы арыштоўваюць, ягоную сям'ю спасцігае страшная нястача. Дапамагаць ім звычайна забараняецца. Гэта робіцца свядома, каб пабольшыць мукі жонкі і дзяцей, якія застаюцца на волі. Калі хрысціянін ідзе ў турму – а звычайна на пакуты і смерць – па-

кутуе і ягоная сям'я. Магу засведчыць, што калі б шараговыя хрысціяне з вольнага свету не слалі дапамогу мне і маёй сям'і, мы ніколі б не дажылі да таго дня, калі я пішу гэтыя словы! Увесь час з'яўляюцца новыя мучанікі. І калі яны сыходзяць у магілу і атрымліваюць на тым свеце сваю нагароду, сем'і іх застаюцца ў невыносных варунках. Мы можам і павінны дапамагчы ім. Вядома, трэба дапамагаць і галодным індыйцам і афрыканцам. Але хто больш варты хрысціянскае дапамогі, якм не сем'і тых, хто памёр за Хрыста або церпіць за веру ў турмах паняволеных краін? З таго часу, як мяне выпусцілі, «Голас мучанікаў» паслаў ужо нямала дапамогі такім сем'ям. Але гэта – толькі малая частка таго, што мы маглі б зрабіць з вашаю дапамогай.

### Мая вестка для вас ад Падпольнае Царквы

Я, вернік Падпольнае Царквы, які выжыў і ўратаваўся, нясу вам вестку, заклік, мальбу ад братоў, якія засталіся на радзіме. Цудоўным чынам я выжыў, і цяпер не магу маўчаць. Я казаў, што трэба прынесці Хрыста камуністычнаму свету і іншым паняволеным краінам. Я казаў, што пільна трэба дапамагаць сем'ям хрысціянскіх мучанікаў. Я казаў аб практычных спосабах, як вы можаце дапамагчы Падпольнай Царкве споўніць яе місію пашырэння Евангелля. Калі мяне білі па пятках, мой язык крычаў. Чаму ён крычаў? Яго ж не білі.

Ён крычаў, бо язык і пяты – часткі аднаго і таго ж цела. А вы, вольныя хрысціяне, часткі аднаго і таго ж Цела Хрыстовага, якое цяпер мучаюць у турмах паняволеных краін, якое аж дагэтуль дае мучанікаў за Хрыста. Ці можаце вы не адчуць нашага болю? Царква першых вякоў, ува ўсёй сваёй прыгажосці, ахвярнасці і адданасці ўваскрэсла ў гэтых краінах. Калі наш Госпад Ісус Хрыстос змагаўся ў малітве ў Гефсіманскім Садзе, Пётр, Якуб і Ян былі ўсяго як камень кінуць ад найвялікшае драмы ў гісторыі – але яны глыбока спалі. Колькі вашае хрысціянскае любові і шчодрасці скіравана на тое, каб пацешыць царкву-пакутніцу? Запытайце сваіх пастыраў і царкоўнае кіраўніцтва, што робіцца ад вашага імя, каб дапамагчы вашым братам і сёстрам у паняволеных краінах па цэлым свеце? У гэтых краінах цяпер адраджаецца драма, адвага і мучаніцтва Царквы першых вякоў – а вольная Царква спіць! Нашыя браты, самотныя, пазбаўленыя дапамогі, вядуць найвялікшую, найадважнейшую барацьбу дваццатага стагоддзя, роўную гераізму, адвазе і самаадданасці Ранняе Царквы. А вольная Царква спіць сабе далей, не дбаючы пра іх змаганне і мукі, як тыя Пётр, Якуб і Ян спалі падчас пакутнага змагання іхнага Збаўцы. Ці і вы спацьмеце, пакуль вашыя браты ў Хрысце церпяць і змагаюцца за Евангелле? Ці пачулі вы нашую вестку: «Памятайце пра нас! Памажыце нам! Не пакідайце нас!»?

ЗМЕСТ

*Раздзел 1*
БЯЗБОЖНІК ЗНАХОДЗІЦЬ ХРЫСТА....................3
Як я служыў для савецкіх людзей....................6
Як Царкву спакушалі....................8
У савецкіх людзей такія спраглыя душы!....................10
Казанні ў армейскіх бараках....................14
Нашае падпольнае служэнне паняволенаму народу....................22
Як Падпольная Царква дзейнічала адкрыта....................24
Таемная праца....................26

*Раздзел 2*
«НІХТО НЕ МАЕ ЛЮБОВІ БОЛЬШАЕ...»....................28
Невымоўныя катаванні....................29
Як процістаяць прамыванню мазгоў?....................33
Нядоўгая воля і новы арышт....................35
Размеркаванне абавязкаў: яны б'юць, а мы прапаведуем....................36
Што стала з маімі жонкай і сынам?....................41
«Міхай, вер у Ісуса!»....................42

*Раздзел 3*
ЯК МЯНЕ ВЫКУПІЛІ І АДПУСЦІЛІ ПРАЦАВАЦЬ НА ЗАХАД....................45
Чаму я пакінуў камуністычную Румынію....................47

*Раздзел 4*
ПЕРАМОГА ЛЮБОВІ ХРЫСТОВАЙ НАД КАМУНІЗМАМ....................50
Як мы радаваліся нават у турме....................54
Як весці духоўны наступ на камунізм?....................58
Як ігнаруюцца ўрокі гісторыі....................63
Што ж я знайшоў пасля вызвалення?....................68
Чаму ў мяне баліць душа на Захадзе....................75

*Раздзел 5*
НЯБАЧНАЯ, АЛЕ ПАЎСЮДНАЯ ПРЫСУТНАСЦЬ ПАДПОЛЬНАЕ ЦАРКВЫ ........ 86
Як Падпольная Царква «жывіцца» атэістычнай літаратурай ........ 94
Чаму нават камуністаў можна здабыць дзеля Хрыста ........ 97
Тры складнікі Падпольнае Царквы ........ 104

*Раздзел 6*
ЯК ХРЫСЦІЯНСТВА АДОЛЬВАЕ КАМУНІЗМ ........ 109
Вяршыня айсбергу ........ 110
Пярэслед Падпольнае Царквы расце ........ 123
Як камсамолка знайшла Хрыста ........ 127

*Раздзел 7*
ЧЫМ МОГУЦЬ ДАПАМАГЧЫ ЗАХОДНІЯ ХРЫСЦІЯНЕ ........ 133
Чым могуць дапамагчы хрысціяне ў вольным свеце ........ 134
Пільна патрабуюцца Бібліі ........ 136
Трагедыя сем'яў хрысціянскіх мучанікаў ........ 139
Мая вестка для вас ад Падпольнае Царквы ........ 140

